МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ

## ВЫХАВАННЕ І НАВУЧАННЕ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ З ЗАТРЫМКАЙ ПСІХІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК ✦ НМЦэнтр

Аўтар-складальнік праграм — *настаўнік-дэфектолаг Т. М. Кузняцова*

Аўтар тлумачальнай запіскі — *канд. пед. навук А. М. Калініна*

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2000
© Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання, 2000

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У дадзеных праграмах выкладзены змест карэкцыйна-адукацыйнай работы з дзецьмі дашкольнага ўзросту, якія маюць псіхолага-педагагічны дыягназ "затрымка псіхічнага развіцця". Для паспяховай рэалізацыі мэтавых установак праграм ад педагогаў патрабуецца не толькі агульная кваліфікацыя, але і веданне псіхафізічных асаблівасцей развіцця гэтай катэгорыі дзяцей.

Праграмы разлічаны на трохгадовы тэрмін карэкцыйна-адукацыйнай работы з дзецьмі наступных узроставых груп: 4—5 гадоў (першы год навучання), 5—6 гадоў (другі год навучання), 6—7 гадоў (трэці год навучання).

Пачатак навучання і выхавання з чатырохгадовага ўзросту абумоўлены складанасцю працэсу высвятлення і дыягностыкі затрымкі псіхічнага развіцця, якія патрабуюць працяглага клініка-псіхалагічнага і педагагічнага вывучэння дзіцяці.

У аснову праграм пакладзены вядучыя сучасныя канцэпцыі айчынных і замежных вучоных: аб асаблівым значэнні дашкольнага ўзросту як перыяду "ачалавечвання" (А. М. Лявонцьеў, А. У. Запарожац і інш.); аб вядучай ролі навучання ў працэсе псіхічнага развіцця і сенсітыўнасці дашкольнага ўзросту да засваення трох відаў знакаў: вобразна-графічнага, вобразна-жэставага і вербальнага (Т. Баўэр, Л. С. Выгоцкі, Д. Б. Эльконін і інш.); аб неабходнасці своечасовага развіцця разнастайных здольнасцей у дашкольнікаў, у тым ліку і ў дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця (Л. А. Венгер, Б. Г. Ананьеў, У. І. Лубоўскі, А. С. Сляповіч, Н. А. Масюкова, Г. М. Рахмакова і інш.); аб аптымальных тэрмінах і адэкватнасці карэкцыйна-педагагічнага ўздзеяння (Т. А. Уласава, К. С. Лебядзінская, Т. А. Працко, К. Г. Ярмілава, Т. Л. Ляшчынская і інш.).

Праграмныя патрабаванні з'яўляюцца базавым кампанентам дашкольнай адукацыі дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця. Разам з тым у працэсе рэалізацыі праграмнага зместу прадугледжваецца вызначэнне неабходнага і дастатковага ўзроўню псіхафізічнага развіцця кожнага дзіцяці, распрацоўка індывідуальных праграм з апорай на зоны бліжэйшага і актуальнага развіцця. Пры рабоце з дзецьмі, якія маюць камбінаваныя (складаныя) псіхафізічныя парушэнні, мэтазгодна дадаткова карыстацца існуючымі праграмамі дашкольнага выхавання дзяцей з адпаведным тыпам парушэнняў. Напрыклад, пры рабоце з дзецьмі, якія маюць парушэнні слыху ў спалучэнні з затрымкай псіхічнага развіцця, дадатковай будзе праграма выхавання і навучання дашкольнікаў з парушэннямі слыху.

Праграмы могуць выкарыстоўвацца бацькамі, педагогамі спецыяльных дашкольных устаноў (груп) і груп сумеснага (інтэграванага) навучання.

Карэкцыйна-адукацыйная работа з дзецьмі пачынаецца адпаведна зместу патрабаванняў першага года навучання (незалежна ад таго, з якога ўзросту дзіця прынята ў дашкольную ўстанову). Дзеці, якія пачынаюць наведваць дашкольную ўстанову з больш старэйшага ўзросту, паступова засвойваюць праграмны матэрыял за больш кароткі тэрмін.

Праграмамі прадугледжваецца рэалізацыя наступных карэкцыйна-адукацыйных задач[1]:

1) забеспячэнне саматычнага і псіхічнага здароўя дзяцей;

2) карэкцыя недахопаў узаемадзеяння асобы з асяроддзем;

3) фарміраванне ўсіх відаў дзейнасці, якія ўласцівы дзіцяці дашкольнага ўзросту;

4) карэкцыя і развіццё пазнавальнай дзейнасці, мовы, сенсаматорнай сферы;

5) фарміраванне жыццёва важных для дашкольніка ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць яму адаптацыю ў сацыяльным і прыродным асяроддзі;

6) падрыхтоўка да школы.

Работа па *карэкцыі асобы* можа быць эфектыўнай пры ўмове падпарадкавання гэтай мэце ўсяго стылю жыцця, атмасферы ўстановы, сям'і, паводзін усіх дарослых, якія акружаюць дзіця, супрацоўніцтва псіхолагаў, педагогаў, выхавальнікаў і бацькоў.

[1] *Масюкова Н. А., Слепович Е. С.* Работа психолога в системе оказания помощи детям с задержкой психического развития от 0 до 7 лет. Мн., 1994.



Здзяйсняючы карэкцыю недахопаў узаемадзеяння асобы з асяроддзем, мэтазгодна прытрымлівацца наступных напрамкаў работы (А. С. Сляповіч, Н. А. Масюкова):

фарміраванне вобраза "Я" (фізічнага "Я", псіхічнага "Я", агульнай і асобнай самаацэнкі, адэкватнага ўзроўню дамаганняў, адэкватнага ўзроўню спадзяванняў);

фарміраванне здольнасці разумець эмацыянальны стан чалавека;

фарміраванне ўяўленняў аб сацыяльных і маральных нормах і здольнасці выкарыстоўваць іх у якасці рэгулятара паводзін;

фарміраванне альтруістычных адносін да свету;

навучанне мадэлям узаемадзеяння з равеснікамі і дарослымі;

зняцце страхаў і трывожнасці ў адносінах да дарослых, якія звязаны з асабістай "непасляховасцю";

авалоданне ўменнем бачыць магчымыя вынікі небяспечных сітуацый (навучанне асцярожнасці).

Пры *фарміраванні агульных структур дзейнасці* трэба мець на ўвазе, што яны прадстаўлены ў яе канкрэтных відах. У дашкольнікаў з лёгкімі адхіленнямі ў развіцці сістэма мэтаспадзявання — адно з самых слабых звёнаў. Гэтаму неабходна ўдзяляць асабліва пільную ўвагу. Для таго каб выклікаць у дзяцей жаданне папярэдняй арганізацыі сваёй дзейнасці, трэба выкарыстоўваць заданні, у працэсе выканання якіх праяўляецца дастаткова наглядны рэзультат дзейнасці (заданні па канструяванню, выяўленчай і маўленчай дзейнасці). Акрамя заданняў, якія прадугледжваюць работу па ўзору, неабходна ўключаць навучанне самастойнай творчай дзейнасці (напрыклад, па методыцы В. М. Дзьячэнка). Карысныя таксама мнагакратныя практыкаванні па выкарыстанню выпрацаваных уменняў на занятках, у паўсядзённай практыцы.

*Карэкцыя пазнавальнай дзейнасці* мае на мэце развіццё найбольш пашкоджаных у дзяцей гэтай катэгорыі псіхічных працэсаў: прасторавага, часавага і прасторава-часавага ўспрымання; наглядных формаў мыслення; маўленчай дзейнасці, галоўным чынам функцый мовы; памяці. Пры гэтым трэба звярнуць увагу на фарміраванне асобасна-дзейнасных кампанентаў у цэлым (на матэрыяле развіцця кожнай псіхічнай функцыі) і на слоўнае апасродкаванне дзейнасці.

Значнае месца ў сістэме псіхолага-педагагічнай карэкцыйнай работы павінны займаць індывідуальныя заняткі (настаўніка-дэфектолага, псіхолага).

Адэкватнасць псіхолага-педагагічнай карэкцыйнай работы па дадзеных праграмах мае на ўвазе:

- наладжванне адносін супрацоўніцтва дарослых з дзецьмі на аснове асобасна-арыентаванай мадэлі выхавання;
- своечасовае і сістэматычнае вывучэнне індывідуальных, тыпалагічных і полаўзроставых асаблівасцей дзяцей, улік іх у карэкцыйна-адукацыйнай рабоце (адзінства дыягностыкі і карэкцыі);
- дасягненне ўзгодненасці ў дзейнасці бацькоў, педагагаў, псіхолагаў, медыкаў па здзяйсненню карэкцыйна-адукацыйнай дапамогі;
- апору на заканамернасці антагенезу і сенсітыўныя перыяды развіцця новаўтварэнняў псіхікі дзяцей дашкольнага ўзросту;
- *комплексны падыход* да развіцця фізічных, разумовых і мастацкіх здольнасцей дзяцей;
- правядзенне карэкцыйна-адукацыйнай работы з дзецьмі ў ходзе асноўных відаў дзейнасці з забеспячэннем актыўнасці дзяцей у працэсе пазнання;
- улік агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей культуры пры адборы зместу дашкольнай адукацыі, якая адпавядае магчымасцям і пазнавальным інтарэсам сучаснага дзіцяці;
- захаванне тэматычнай сістэматызацыі праграмнага зместу па прынцыпу канцэнтрычнасці ("скразныя" тэмы на ўвесь перыяд навучання);
- забеспячэнне адлюстравання ўсяго праграмнага матэрыялу пры дапамозе трох відаў знакаў (вобразна-графічны, вобразна-жэставы, вербальны);
- пераемнасць у карэкцыйна-адукацыйнай рабоце дашкольнай установы і школы;
- стварэнне даступнага і развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя.

Выхаванне і навучанне дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця ажыццяўляецца па наступных праграмах: "Выхаванне фізічнай культуры"; "Навучанне гульні"; "Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам"; "Выхаванне працавітасці"; "Навучанне выяўленчай дзейнасці і канструяванню"; "Фарміраванне матэматычных уяўленняў"; "Музычнае выхаванне".

**Выхаванне фізічнай культуры**. Выхаванне фізічнай культуры дзяцей садзейнічае ўмацаванню іх здароўя і з'яўляецца неабходнай умовай паспяховага псіхічнага развіцця. Асноўныя задачы зводзяцца да развіцця агульнай і дробнай маторыкі, карэкцыі і развіцця апорна-рухальнага апарату,



фізічных якасцей, загартоўвання арганізма дзіцяці. Заняткі па фізічнаму выхаванню праводзяцца выхавальнікам з усёй групай дзяцей і па падгрупах у ранішні і вячэрні час. У паўсядзённай практыцы асаблівая ўвага ўдзяляецца фарміраванню ў дзяцей навыкаў здаровага ладу жыцця, культуры догляду свайго цела, уменню прыгожа рухацца, папярэджанню траўматызму. Прадуманае выкарыстанне прыродных сродкаў неабходна не толькі для загартоўвання малышоў, але і для фізічнага развіцця. Важнае значэнне надаецца дыягностыка-карэкцыйнай дзейнасці педагогаў у працэсе фізічнага выхавання дзяцей, адзінству патрабаванняў да дзіцяці ў сям'і і дашкольнай установе.

**Навучанне гульні.** Адно з прыярытэтных месцаў у праграмах адводзіцца вядучым відам дзейнасці дзяцей: у раннім узросце — прадметнай, у дашкольным — гульнёвай. У праграме "Навучанне гульні" прыведзена пакварталънае тэматычнае планаванне сюжэтна-ролевых і дыдактычных гульняў для дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця, даюцца метадычныя ўказанні па іх арганізацыі і правядзенню.

Фарміраванне сюжэтнай гульні мэтазгодна здзяйсняць у наступных напрамках[1]:

- фарміраванне сюжэтнай гульні як дзейнасці;
- фарміраванне сюжэтнай гульні як сумеснай дзейнасці;
- фарміраванне зместу сюжэтных гульняў.

Пры гэтым вельмі важна прадумваць арганізацыю гульнёвай практыкі дашкольнікаў, наглядаць за дынамікай станаўлення гульні ў кожнага дзіцяці, ствараць атмасферу, якая садзейнічае ўзнікненню ў дзіцяці жадання гуляць.

У працэсе навучання гульні галоўная задача выхавальніка і настаўніка-дэфектолага заключаецца ў тым, каб развіць у дзяцей творчае "Я", здольнасць пераўвасабляцца ў вобразы рэальных і казачных персанажаў, уменне выкарыстоўваць разнастайныя сродкі для перадачы з'яў рэчаіснасці ў гульнёвай дзейнасці, якая для дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця з'яўляецца універсальнай формай карэкцыі і фарміравання розных формаў псіхічнай дзейнасці.

**Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам.** У працэсе работы па гэтай праграме педагогі арыентуюцца на вырашэнне наступных задач[2]:

- фарміраванне слоўніка і словаўтваральных працэсаў у дзяцей;

---

[1] *Слепович Е. С.* Игровая деятельность дошкольников с задержкой психического развития. М., 1990.

[2] *Слепович Е. С.* Исправление речи у детей. Мн., 1983.

◆ фарміраванне гукавой культуры і граматычнага ладу маўлення;

◆ фарміраванне звязнага маўлення;

◆ фарміраванне сістэматызаваных ведаў аб навакольным свеце, рацыянальных прыёмаў разумовай дзейнасці.

Для папаўнення і актывізацыі слоўнікавага запасу (асабліва прыметнікамі) і развіцця словаўтваральных працэсаў эфектыўнымі могуць быць слоўныя гульні. У такой гульні адбываецца вырашэнне азначанай мысліцельнай задачы, гэта значыць адначасова адбываецца карэкцыя не толькі маўленчай, але і пазнавальнай дзейнасці. Рэкамендуецца таксама выкарыстоўваць розныя апісанні прадметаў, іх адлюстраванняў, апісанні па памяці, расказы па ўяўленню, заданні на прыдумванне і адгадванне загадак, на засваенне значэнняў слоў шляхам падбору раду тэкстаў, у якіх мяркуецца паслядоўнае звужэнне значэння вывучаемага слова, заданні на падбор роднасных слоў (намінацыя дзеючых асоб, устанаўленне аналогій, утварэнне ад зададзеных слоў роднасных ім, але тых, якія адносяцца да іншых часцін мовы ("сад—садовы—садзіць" і інш.) (А. С. Сляповіч).

У працэсе фарміравання граматычнага ладу мовы важна так арганізаваць маўленчую практыку дзяцей, каб яны выкарыстоўвалі слова ў розных сітуацыях. Гэта садзейнічае значнаму руху наперад у авалоданні парадыгматычнымі і сінтагматычнымі сувязямі. Пачынаць работу рэкамендуецца з двухслоўных сказаў, затым можна перайсці да трохслоўных, чатырохслоўных і г. д. Можна выкарыстаць прыёмы, якія практыкуюцца ў рабоце з дзецьмі з агульным недаразвіццём маўлення. Неабходна памятаць, што любая дзейнасць дзіцяці павінна суправаджацца маўленнем (каменціраванне). Эфектыўным з'яўляецца прыём заканчэння дзіцем слоў, сказаў (спачатку кароткіх, з трох-чатырох слоў, затым больш доўгіх), звязнага тэксту, якія пачынаў гаварыць педагог.

Для фарміравання звязнага маўлення мае значэнне здольнасць дзяцей каменціраваць свае дзеянні. Пры гэтым улічваецца дакладнасць і зразумеласць выказвання, яго лексічнае і граматычнае афармленне.

Значнае месца ў рабоце па развіццю звязнага маўлення дзяцей адводзіцца заданням, мэта якіх — навучыць дзіця адрозніваць закончаную думку ад хаатычнага набору слоў, знаходзіць сувязі паміж сказамі.

Звязнасць маўлення залежыць таксама ад умення аналізаваць сітуацыю, вылучаць у ёй самае істотнае. У гэтым плане карысна практыкаваць дзяцей у аналізе прадметнай карцінкі, падборы да яе назваў. Важна фарміраваць уменне



ўдзельнічаць у дыялогу, заахвочваць да гутаркі, выказванняў. Рэкамендуецца праводзіць ролевыя гульні, разыгрываць ролі казачных герояў, дарослых, якія акружаюць (мама, урач, настаўнік і г. д.).

Змест заняткаў па азнаямленню з навакольным светам з'яўляецца асновай для заняткаў па развіццю маўлення і сенсорнаму развіццю дашкольнікаў.

Тыднёвае размеркаванне заняткаў па раздзелу "Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам" па розных гадах навучання можа быць наступнае:

першы год навучання — двое заняткаў у тыдзень;

другі год навучання — двое заняткаў па развіццю маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам і адны заняткі па гукавой культуры маўлення і навучанню грамаце;

трэці год навучання — двое заняткаў па развіццю маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам і двое заняткаў па гукавой культуры маўлення і навучанню грамаце.

Праграмны змест па азнаямленню з навакольным светам уключае:

◆ азнаямленне з прадметамі (рукатворнымі);

◆ азнаямленне з прыродай (жывой, нежывой);

◆ фарміраванне элементарных грамадазнаўчых ведаў (дзейнасць людзей, рукатворны свет, сваяцкія адносіны, прафесіі людзей і інш.).

Асаблівая ўвага звяртаецца на метады, якія стымулююць і развіваюць пазнавальную дзейнасць дзяцей, вопыты, праблемныя сітуацыі і інш.

**Выхаванне працавітасці.** Выхаванне працавітасці з'яўляецца неад'емнай часткай карэкцыйна-адукацыйнай работы з дзецьмі па фарміраванню ў іх агульных структур дзейнасці і мае на мэце:

◆ выхаванне інтарэсу і патрэбнасці ў працоўнай дзейнасці, у стварэнні плана-задумы дзейнасці і ажыццяўленні яго;

◆ фарміраванне станоўчых адносін да працы;

◆ фарміраванне сістэматызаваных ведаў аб працы людзей, яе неабходнасці і значнасці, аб рацыянальных спосабах працоўнай дзейнасці ў паўсядзённай практыцы, аб адносінах людзей у працэсе працоўнай дзейнасці;

◆ фарміраванне ўмення ажыццяўляць рацыянальныя працоўныя дзеянні ў паўсядзённым жыцці;

◆ выхаванне асобасных якасцей, якія неабходныя для калектыўнай працоўнай дзейнасці, устойлівай накіраванасці на дасягненне рэзультату, ініцыятывы і творчасці.

Ажыццяўленню дадзеных задач садзейнічаюць наступныя псіхолага-педагагічныя ўмовы:

- своечасовая карэкцыя парушэнняў пазнавальнай дзейнасці маўлення выхаванцаў у разнастайнай працоўнай дзейнасці;
- станоўчы эмацыянальны фон і матывацыя працоўнай дзейнасці дзяцей;
- удасканаленне агульнай і дробнай маторыкі, каардынаванасці рухаў рук, зрокава-маторнай каардынацыі;
- узаемасувязь працы дашкольнікаў з іншымі відамі дзейнасці на занятках і ў паўсядзённым жыцці;
- абмеркаванне з выхаванцамі рэзультатаў працоўнай дзейнасці, яе неабходнасці і значнасці;
- фіксаванне ўвагі на беражлівых адносінах да прадуктаў працы людзей;
- адзінства патрабаванняў да працоўнай дзейнасці дзяцей у сям'і і ў дашкольнай установе;
- прадуманае дазіраванне працоўнай нагрузкі для дзяцей па часу, затрачваемых намаганнях і ў адпаведнасці з індывідуальнымі асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;
- наяўнасць неабходнай вучэбна-матэрыяльнай базы.

Праграмныя патрабаванні размеркаваны па кварталах толькі ў раздзеле "Праца ў прыродзе", якая ўводзіцца з другога года навучання. Змест карэкцыйна-адукацыйнай работы па гэтаму раздзелу вызначаецца ў сувязі са зменамі ў прыродзе.

Карэкцыйна-адукацыйная работа з дзецьмі праводзіцца ў працэсе паўсядзённага догляду раслін і жывёлы кутка прыроды, на зямельным участку, на занятках, прагулках, у працэсе выканання іншых рэжымных момантаў.

Пры выхаванні станоўчых адносін да працы мяркуецца выкарыстанне гібкіх метадаў стымулявання дзейнасці дзяцей. Трэба пазбягаць адмоўных ацэнак уменняў выхаванцаў, іх паводзін у працэсе працы. Неабходна ўлічваць эмацыянальны стан дзіцяці, падтрымліваць яго і адабраць, даваць магчымасць перажыць пачуццё задавальнення ад атрымання патрэбнага рэзультату. Важна, каб поспех дзіцяці быў заўважаны.

На пачатковых этапах навучання працоўным уменням мэтазгодна выкарыстоўваць пасіўна-актыўны метад, напрыклад сумесныя дзеянні (накіроўванне руху рук дзіцяці дарослым). Эфектыўны таксама метад паказу, калі праграмны матэрыял знаходзіцца ў "зоне найбліжэйшага развіцця дзіцяці". Шырока выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання тлумачэнне, аналіз узору, дзеянні па ўзору, па пераймannю.

Неабходна памятаць пра тое, што падыход да фарміравання навыкаў асабістай гігіены, самаабслугоўвання і працоўных уменняў у бытавой практыцы павінен быць максімальна індывідуалізаваны. Але ў любым выпадку ажыццяўляецца планаванне, аналіз і ацэнка працэсу дзейнасці і атрыманага рэзультату.

**Навучанне выяўленчай дзейнасці і канструяванню.** З усіх відаў прадукцыйнай дзейнасці выяўленчая дзейнасць і канструяванне — першыя ў жыцці дзіцяці-дашкольніка. Накіраванае навучанне гэтым відам дзейнасці ў дашкольным узросце стымулюе псіхічнае развіццё і карэкцыю недахопаў успрымання, мыслення, маўлення, асобы ў цэлым, садзейнічае ранняй сацыялізацыі дзіцяці

У працэсе канструявання адбываецца мадэліраванне навакольнай прасторы ў самых істотных рысах і адносінах. Канструяванне садзейнічае перш за ўсё развіццю ў дзіцяці вобразнага і элементаў наглядна-схематычнага мыслення, фарміраванню ўяўленняў аб цэласным вобразе прадмета, аб прасторы, прасторавых адносінах паміж прадметамі і часткамі прадмета.

Для ўзмацнення карэкцыйнай накіраванасці навучання мэтазгодна дапоўніць праграмны змест спецыяльным матэрыялам, які накіраваны на фарміраванне ў дзяцей уяўленняў аб схеме цела чалавека і жывёл (складанне зборна-разборных цацак, разразных карцінак і інш.). Стварэнню ва ўяўленні дзіцяці ўстойлівай сувязі паміж рэальным прадметам і яго плоскасным адлюстраваннем садзейнічаюць, напрыклад, зарысоўванне толькі што зробленай пабудовы, зборка канструкцый па графічных узорах, прасцейшыя перастаноўкі мэблі ў пакоі лялек (па пераймannю, па ўзору, па славеснай інструкцыі і інш.). Асаблівую ўвагу ў працэсе канструявання трэба ўдзяліць сенсорнаму выхаванню дашкольнікаў, фарміраванню многагранная сенсорнага вопыту.

Прыступаючы да навучання дзяцей маляванню, лепцы, канструяванню і да т. п., неабходна вызначыць ступень падрыхтаванасці кожнага дзіцяці да авалодання імі. Пры гэтым улічваюцца: сфарміраванасць рухальнай функцыі рук, зрокава-рухальнай каардынацыі, здольнасць бачыць і пазнаваць у выяўленні рэальныя прадметы, сітуацыі; наяўнасць інтарэсу і праяўленне актыўнасці ў дадзеным відзе дзейнасці; стан навыкаў выяўленчай і канструктыўнай дзейнасці і інш.

Выбар зместу, формаў правядзення і прыёмаў выяўленчай і канструктыўнай дзейнасці патрабуе максімальнай індывідуалізацыі.

Да асноўных задач карэкцыйна-адукацыйнай работы ў навучанні дзяцей выяўленчай дзейнасці адносяцца:

- фарміраванне ў дашкольнікаў станоўчых адносін да выяўленчага мастацтва, патрэбнасці ў адлюстраванні рэчаіснасці сродкамі выяўленчага мастацтва;
- навучанне дзяцей спецыфічным прыёмам малявання, лепкі, аплікацыі і канструявання;
- удасканаленне пазнавальнай дзейнасці, маўлення, сенсаматорнай сферы;
- удасканаленне разумення твораў мастацтва, эстэтычных перажыванняў і эстэтычных меркаванняў;
- развіццё творчага "Я", ініцыятывы ў дзяцей, самастойнасці і адэкватнай самаацэнкі.

На пачатковым этапе навучання выяўленчай дзейнасці мэтазгодна праводзіць дыдактычныя гульні, у працэсе якіх замацоўваюцца веды аб тых прыметах, якасцях і ўласцівасцях, якія павінны стаць прадметам адлюстравання.

Разнастайнасць метадаў работы з дзецьмі павінна быць абумоўлена індывідуальнымі асаблівасцямі выхаванцаў, станам гатоўнасці да авалодання мастацкімі і прадуктыўнымі відамі дзейнасці. Абавязковай умовай заняткаў з'яўляецца стварэнне гульнёвай сітуацыі, станоўчай эмацыянальнай атмасферы, развіццё пачуццёвай сферы.

На першым годзе навучання мэтазгодна праводзіць адны заняткі ў тыдзень па лепцы і адны — па аплікацыі і канструяванню (чаргуючы заняткі), двое — па маляванню.

На другім годзе навучання заняткі па навучанню выяўленчай дзейнасці і канструяванню размяркоўваюцца штотыднёва наступным чынам: маляванне — двое заняткаў, канструяванне — адны заняткі, лепка або аплікацыя (чаргаванне) — адны заняткі.

На трэцім годзе навучання: маляванне — двое заняткаў, канструяванне — адны, лепка або аплікацыя (чаргаванне) — адны заняткі.

**Фарміраванне матэматычных уяўленняў.** Удасканаленне і развіццё ў малышоў логіка-матэматычных уяўленняў і ўменняў — адна з важнейшых задач усебаковага выхавання дзіцяці. Ва ўмовах ажыццяўлення асобасна-арыенціровачнай мадэлі арганізацыі карэкцыйна-адукацыйнай работы акцэнт пастаўлены на клапатлівыя і чулыя адносіны да асобы дашкольніка. Вядучым становіцца індывідуальна-дыферэнцыраванае навучанне, якое ўключае ідэі аўтадыдактызму (М. Мантэсоры і інш.).



Ранняя лагічная прапедэўтыка ў дашкольнай установе выкарыстоўваецца перш за ўсё для падрыхтоўкі мыслення дзяцей да засваення матэматыкі. У працэсе мэтанакіраванай карэкцыйна-адукацыйнай работы ў дашкольнікаў фарміруюцца пачатковыя матэматычныя веды і ўменні, якія неабходны ім у навакольным жыцці і для навучання ў школе.

Задачамі дадзенай праграмы з'яўляюцца:

- фарміраванне інтарэсу да вывучэння матэматычных характарыстык навакольнай рэчаіснасці (велічыня, форма, працягласць, час, напрамак прасторы, часткі сутак, колькасць і лік і інш.);
- карэкцыя і развіццё мысліцельнай дзейнасці, кемлівасці, матэматычных здольнасцей і асобы ў цэлым;
- фарміраванне пачатковых матэматычных ведаў і уменняў, вымяральных навыкаў;
- сенсорнае выхаванне ў працэсе работы з матэматычным матэрыялам;
- маральна-валявое развіццё ў працэсе фарміравання ўменняў даводзіць пачатую справу да канца, перамагаць цяжкасці ў выкананні задання, адэкватна ацэньваць рэзультаты сваёй работы і работы таварышаў і інш.;
- развіццё маўлення і зносін у працэсе авалодвання матэматычнай тэрміналогіяй, фармулявання зместу задач, каменціравання свайго рашэння і абмяркоўвання рэзультатаў з іншымі людзьмі.

Сістэма карэкцыйна-адукацыйнай работы па фарміраванню ў дашкольнікаў матэматычных уяўленняў ажыццяўляецца на індывідуальных, групавых і франтальных занятках, у паўсядзённым жыцці дзяцей.

Засваенне праграмнага матэрыялу праводзіцца, у асноўным, на нагляднa-дзейсным і нагляднa-вобразным узроўнях з апорай на дзіцячы вопыт і дзеянні з канкрэтнымі прадметамі, прадметнымі карцінкамі і г. д. Найбольш дзейснай формай заняткаў з'яўляецца дыдактычная гульня. Колькасныя ўяўленні дзяцей абагачаюцца і актуалізуюцца ў працэсе розных відаў дзейнасці, дзе ёсць неабходнасць падліку, вымярэння, параўнання па велічыні, размеру і г. д.

Асаблівай увагі патрабуе работа па фарміраванню часавых і прасторавых уяўленняў, таму што дзецям з затрымкай псіхічнага развіцця трэба значна больш часу для прыёму і перапрацоўкі любога віду сенсорнай інфармацыі. Большасць псіхолагаў адзначае ў іх выяўленыя прасторавыя парушэнні як на ўзроўні практычных дзеянняў, так і на вербальным.

Паняцці аб часе і прасторы фарміруюцца ў цесным адзінстве. Неабходна аналізаваць і вылучаць канкрэтныя факты: што было? што стала? як змянілася? чаму? што для гэтага зрабілі? як можна зрабіць па-другому? і г. д.

У розных сітуацыях бытавога характару і на спецыяльных занятках педагогі фармулююць перад дзецьмі пазнавальныя задачы: выбраць гузікі для кофты, шнуркі для дадзенай пары чаравікаў і г. д.

Неабходна спалучаць разнастайныя прыёмы і метады, якія стымулююць выконваць работу не толькі на наглядна-дзейсным узроўні, але і на наглядна-вобразным; стварэнне праблемных сітуацый; актывізацыя маўленчай дзейнасці дашкольнікаў.

**Музычнае выхаванне.** У працэсе музычнага выхавання, развіцця музыкальных здольнасцей дзяцей неабходна памятаць аб развіцці асобы дзіцяці.

Да асноўных задач музычнага выхавання дзяцей можна аднесці наступныя:

- развіццё інтарэсу да музыкі і эмацыянальнай чуткасці, музыкальных здольнасцей, музычна-рытмічных навыкаў;
- фарміраванне выканаўчых музычных уменняў і ведаў аб відах і характары музыкі, разнастайнасці музычных інструментаў і сродкаў музычнай выразнасці;
- развіццё імкнення ўдзельнічаць у разнастайных відах музычнай дзейнасці, самастойнасці і творчых здольнасцей;
- выхаванне станоўчых адносін да ігры на музычных інструментах, да музычна-рытмічных рухаў.

Музычнае выхаванне дашкольнікаў ажыццяўляецца на занятках і ў паўсядзённым жыцці ў разнастайных формах (музычныя забавы, мінуткі, паўзы, музычнае суправаджэнне прадукцыйнай дзейнасці, дзіцячыя оперы, музычныя віктарыны, конкурсы і інш.).

Галоўным у фарміраванні музычнай культуры ў дашкольнікаў з'яўляецца развіццё ўсвядомленага і эмацыянальнага ўспрыняцця музыкі, самастойнасці і творчай ініцыятывы, самавыяўлення, імправізацыі.

Праграмай "Музычнае выхаванне" прадугледжаны наступныя віды дзейнасці: слуханне музыкі, спяванне, музычна-рытмічныя рухі, ігра на музычных інструментах. Праграмны матэрыял складаюць творы беларускага, рускага музычнага мастацтва і іншых народаў свету. Дзеці знаёмяцца з беларускімі народнымі музычнымі інструментамі, спрабуюць на іх іграць. Уключаны ў праграму музычны матэрыял дае магчымасць замяняць адзін твор другім з улікам магчымасцей дзяцей, іх падрыхтаванасці да ўспрыняцця дадзенага твора.

Структура музычных заняткаў можа быць рознай. Яна вызначаецца з захаваннем асноўнага патрабавання праграмы — адзінства музычнага выхавання, карэкцыі парушэнняў псіхафізічнага развіцця і ўсебаковага развіцця дзяцей.

Кіраўнік музычных заняткаў плануе сваю работу, кансультуючыся з настаўнікам-дэфектолагам і ўрачом-псіханеўролагам дашкольнай установы, а таксама з псіхолагам, бацькамі дзіцяці; ажыццяўляе ўзаемасувязь музычнага выхавання з дзейнасцю дзяцей у дашкольнай установе і ў сям'і.

Паспяховая рэалізацыя праграмных патрабаванняў і напрамкаў карэкцыйна-адукацыйнай работы магчыма пры ўмове комплекснага падыходу да развіцця дзяцей, цеснага супрацоўніцтва ў працэсе работы настаўнікаў-дэфектолагаў, выхавальнікаў, медыцынскіх работнікаў і бацькоў.

Сучасныя навуковыя даследаванні, пазітыўны практычны вопыт выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту з затрымкай псіхічнага развіцця сведчаць аб рэальных магчымасцях адаптацыі гэтых дзяцей у навакольным прыродным і сацыяльным асяроддзі, інтэграцыі ў грамадства.

Навучальны год у дашкольных установах пачынаецца 1 верасня і заканчваецца 15 чэрвеня. У пачатку і канцы навучальнага года праводзіцца псіхолага-педагагічнае абследаванне дзяцей па ўсіх раздзелах праграм. Акрамя гэтага, рэкамендуецца бягучы штомесячны кантроль з мэтай своечасовага выяўлення ў дзяцей цяжкасцей у авалоданні праграмным матэрыялам. Першаснае псіхолага-педагагічнае абследаванне дзяцей пры паступленні ў дашкольную ўстанову праводзіцца псіхолагам, настаўнікам-дэфектолагам і выхавальнікам групы на працягу месяца. Матэрыял для абследавання адбіраецца з адпаведных раздзелаў праграм. У летні перыяд (IV квартал) ажыццяўляецца паўтарэнне праграмнага матэрыялу, які пройдзены раней.

## ВУЧЭБНЫ ПЛАН (32 РАБОЧЫЯ ТЫДНІ)

| Праграма | Колькасць заняткаў у год (у тыдзень) па гадах навучання | | |
|---|---|---|---|
| | I | II | III |
| 1. Выхаванне фізічнай культуры | 96 (3) | 96 (3) | 96 (3) |
| 2. Навучанне гульні | 96 (3) | 32 (1) | 32 (1) |
| 3. Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам | 64 (2) | 96 (3) | 128 (4) |
| 4. Выхаванне працавітасці | 32 (1) | 64 (2) | 64 (2) |
| 5. Навучанне выяўленчай дзейнасці і канструяванню | 128 (4) | 128 (4) | 128 (4) |
| 6. Фарміраванне матэматычных уяўленняў | 64 (2) | 64 (2) | 64 (2) |
| 7. Музычнае выхаванне | 96 (3) | 96 (3) | 96 (3) |

## ПРЫКЛАДНЫ ТЫДНЁВЫ РАСКЛАД ЗАНЯТКАЎ ПА ГАДАХ НАВУЧАННЯ

| Дзень тыдня | Гады навучання | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | I | | II | | III | |
| | В | Н/Д | В | Н/Д | В | Н/Д |
| Панядзелак | Г<br>Л<br>ФК (2 пд) | Г | ФК<br>Г | РМН | Л або А<br>ФК<br>Г | РМН<br>РРО |
| Аўторак | М<br>МВ<br>ФК (2 пд) | ФМУ | М<br>МВ<br>ВП (2 пд) | ФМУ<br>Р (2 пд) | М<br>МВ<br>Г (2 пд) | ФМУ<br>Г |
| Серада | К<br>ВП (2 пд) | РМН<br>Г | Л або А<br>ФК<br>Г | НГ | К<br>М<br>ФК | НГ |
| Чацвер | МВ<br>Р (2 пд) | ФМУ | К<br>Г | ФМУ<br>Г | Р<br>Г<br>ВП (2 пд) | ФМУ |
| Пятніца | Г<br>РМН | РМН | М<br>МВ<br>ФК | РМН<br>Э | ВП<br>МВ | НГ<br>РМН |
| Субота | ФК | | Р<br>ВП | | ФК | |



**Умоўныя абазначэнні зместу заняткаў**: ФК — фізічная культура; РМН — развіццё маўлення і азнаямленне з наваколлем; Г — навучанне гульні; ВП — выхаванне працавітасці; К — канструяванне; М — маляванне; Л — лепка; Р — рытміка; А — аплікацыя; ФМУ — фарміраванне матэматычных уяўленняў; НГ — навучанне грамаце; МВ — музычнае выхаванне; В — выхавальнік; Н/Д — настаўнік-дэфектолаг; 2 пд — другая палова дня; Э — экскурсія.

Расклад заняткаў прыкладны. Парадак заняткаў на працягу года можа змяняцца ў залежнасці ад асаблівасцей дзяцей, праграмнага матэрыялу, сезонных змен у прыродзе. Іншым будзе расклад пры пяці- і шасцідзённым рабочым тыдні.

Настаўнік-дэфектолаг праводзіць індывідуальныя, групавыя і франтальныя заняткі ў залежнасці ад мэты і праграмнага зместу, узроўню падрыхтаванасці дзяцей. Выхавальнік праводзіць франтальныя заняткі (з усёй групай). Штодня настаўнік-дэфектолаг праводзіць не менш за 6 індывідуальных заняткаў.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЫДНЁВЫ РАСКЛАД ЗАНЯТКАЎ НАСТАЎНІКА-ДЭФЕКТОЛАГА І ВЫХАВАЛЬНІКА

| Праграма | Гады навучання | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | I | II | III |
| | Н/Д | | | В | | |
| 1. Выхаванне фізічнай культуры | | | | 3 | 3 | 3 |
| 2. Навучанне гульні | 2 | 1 | 1 | 2 | 3 | 3 |
| 3. Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам | 2 | 3 | 4 | 1 | — | — |
| 4. Выхаванне працавітасці | — | — | — | 1 | 2 | 2 |
| 5. Фарміраванне матэматычных уяўленняў | 2 | 2 | 2 | — | — | — |
| 6. Маляванне | — | — | — | 1 | 2 | 2 |
| 7. Канструяванне | — | — | — | 1 | 1 | 1 |
| 8. Лепка/аплікацыя | — | — | — | 2 | 1 | 1 |
| 9. Музычнае выхаванне, рытміка | — | — | — | 3 | 3 | 3 |
| Індывідуальная работа | 30 | 30 | 30 | — | — | — |

Два разы ў тыдзень у кожнай групе выхавальнік праводзіць індывідуальную работу па фізічнай культуры.

Працягласць заняткаў на першым годзе навучання прыкладна 20 мінут, на другім і трэцім гадах навучання — 30—35 мінут.

Праграма адрасавана настаўнікам-дэфектолагам, якія маюць дэфекталагічную адукацыю, і выхавальнікам з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасці "Выхавальнік дашкольных устаноў".

# ПРАГРАМЫ

## ВЫХАВАННЕ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

### *I квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць і бегаць, змяняючы напрамак па вызначаным сігнале, невялікімі групамі ў калоне, па крузе. Хадзіць па дарожцы шырынёй 40 см, па прамой дарожцы, зробленай з вяроўкі, тканіны, пераступаючы цераз стужкі, па дошцы, саскокваць з дошкі, якая ляжыць на падлозе.

**Скачкі.** Падскокваць на дзвюх нагах на месцы.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Пракочваць мяч у прамым напрамку, бегаць за мячом, вяртацца на месца. Качаць мяч адно аднаму з адлегласці 50 см, пракочваць мяч дзвюма рукамі, качаць мяч на дошцы, якая ляжыць на падлозе. Кідаць мяч выхавальніку, бегчы за мячом, які ўпаў, падымаць яго і вяртацца на месца. Кідаць мяч уперад ад грудзей, удалечыню, змяняючы руку.

**Поўзанне, лажанне.** Поўзаць на чацвярэньках, абапіраючыся на калені і далоні. Падлазіць без дапамогі рук пад дугу вышынёй 70 см.

**Рухавыя гульні.** "На прагулку", "Дагані мяч", "Па роўненькай дарожцы", "Даганіце мяне", "Зайцы і ліса", "Мышы і кот", "Дапаўзём да мячоў", "Знайдзі свой домік", "Мой вясёлы мяч", "Сонейка і дождждык", "Цераз ручаёк", "Самалёты", "Пузыр", "Верабейчыкі і аўтамабіль".

### *II квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць адно за адным па вузкай дарожцы (шырыня 30 см) з рознымі становішчамі рук (на поясе, за галавой); хадзіць парамі, трымаючыся за рукі; хадзіць і бегаць урассыпную; бегаць адно за адным, трымаючыся за вяроўку; хадзіць па снежнаму валу, захоўваючы раўнавагу.



**Скачкі.** Скакаць на дзвюх нагах на месцы, вакол крэсла, рукі наперадзе.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Пракочваць мячы ў вароты (шырыня 50—60 см). Кідаць мяч у сетку і перакідваць цераз яе на адлегласці 1 м, кідаць мяч адно аднаму дзвюма рукамі знізу, кідаць мяч выхавальніку і лавіць кінуты мяч. Кідаць снежкі ўдалечыню ў цэль (адлегласць 1 м).

**Поўзанне.** Прапаўзаць праз вароты (вышыня 60 см, шырыня 70 см), пад вялікім крэслам. Поўзаць на чацвярэньках па дошцы (даўжыня 1,5 м, шырыня 30 см), якая ляжыць на падлозе.

**Рухавыя гульні.** "На прагулку", "Паравоз", "Квахтуха і кураняты", "Па роўненькай дарожцы", "Знайдзі свой сцяжок", "Знайдзі свой колер", "Зайчыкі", "Адгадай, хто крычыць", "Самалёты", "Верабейкі і кот", "Пузыр", "Сонейка і дождждык", "Бяжыце да мяне", "Дапаўзём да кубікаў", "Дапаўзі да бразготкі", "Кацяняты".

### *III квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць у калоне па аднаму, мяняючы напрамак за выхавальнікам, пачынаць бегчы па сігналу. Удасканальваць уменне бегаць парамі, трымаючыся за рукі, бегаць адно за адным уздоўж каната, які ляжыць на падлозе, пераступаць цераз прадметы (шырыня 15 см), якія ляжаць на падлозе.

**Скачкі.** Пераскокваць цераз шнур, "ручаёк", скакаць у абруч, які ляжыць на падлозе, саскокваць з прадметаў (вышыня 10 см).

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Качаць мячы ў вароцікі, адно аднаму (адлегласць 1,5 м). Кідаць мяч удалечыню ўперад; кідаць малы мяч удалечыню папераменна правай і левай рукой.

**Поўзанне.** Замацоўваць навыкі поўзання пад вяроўку, узнятую на вышыню 50 см. Поўзаць па дошцы, адзін канец якой прыўзняты на 20 см; падпаўзаць пад дугу вышынёй 70 см.

**Рухавыя гульні.** "Злаві камара", "Шпакоўні", "Пузыр", "Знайдзі сваю хатку", "Жабкі", "Птушаняткі і птушка", "Коні", "Паравоз", "Квахтуха і кураняты", "Па роўненькай дарожцы", "Лавішкі", "Гусі і воўк".

### *IV квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць на насках уздоўж шнура, які ляжыць прама і кругам на падлозе; станавіцца ў калону і хадзіць за выхавальнікам;

хадзіць, пераступаючы цераз перашкоду (вышыня 10—15 см), рукі на поясе; бегаць па дарожцы (даўжыня 5 м, шырыня 25 см), абмежаванай дзвюма паралельнымі лініямі. Катацца на трохколавым веласіпедзе.

**Скачкі.** Скакаць у абруч на прамых, на трохі сагнутых нагах; скакаць з узмахам рук на дзвюх нагах; скакаць у даўжыню з месца.

**Кіданне і лоўля мяча.** Кідаць мяч дзвюма рукамі ад грудзей; кідаць мяч аб сцяну правай і левай рукой. Лавіць мяч. Пападаць мячом у карзіну, скрынку.

**Поўзанне і лажанне.** Прапаўзаць на чацвярэньках пад вяроўкай, узнятай на вышыню 50 см. Пралазіць у абруч; узлазіць на гімнастычную сценку вышынёй 1,5 м і спускацца з яе.

**Рухавыя гульні.** "Кот і мышы", "Паравоз", "Самалёты", "Знайдзі свой колер", "Лавішкі", "Зайчыкі", "Даганіце мяне", "Сонейка і дожджык", "Малпачкі", "Лаві мяч".

**Аздараўленчая гімнастыка** (праводзіцца на працягу навучальнага года). Умацоўваць мышцы апорна-рухальнага апарату. Умацоўваць мышцы ступні. Фарміраваць правільную паставу. Развіваць тонкую маторыку рук. Практыкаваць дзяцей у дзеяннях з вялікім мячом, на трэнажорах.

## ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

### *I квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць у калоне і ўрассыпную, на пятках, з рукамі за галавой, на месцы; хадзіць па звілістай лініі паміж цацкамі, пераступаючы цераз прадметы (вышыня 15—20 см).

**Скачкі.** Скакаць на дзвюх нагах, рухаючыся наперад, у даўжыню з месца, з абруча ў абруч; скакаць удваіх, узяўшыся за рукі.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Пракочваць мячы ў вароцікі. Кідаць мяч у скрынку, карзіну, удалечыню (займаць правільнае зыходнае становішча). Перакідваць мячы адно аднаму (адлегласць 1,5—2 м).

**Поўзанне і лажанне.** Прапаўзаць пад вяроўкай, узнятай на вышыню 50 см. Лазіць па нахіленай лесвіцы, па гімнастычнай сценцы.

**Рухавыя гульні.** "Самалёты", "Лавішкі", "Каляровыя аўтамабілі", "Знайдзі свой колер", "Пузыр", "Зайцы ў агародзе", "Вясёлы мяч", "У мядзведзя ў бары", "Птушкі і кошка", "Даганіце мяне", "Па роўненькай дарожцы", "Птушка і птушаняткі", "Злаві камара", "Мышы ў кладоўцы".



### *II квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць па крузе на насках, хадзіць, узяўшыся за рукі, пераступаць з абруча ў абруч; хадзіць паміж дзвюма паралельнымі лініямі, намаляванымі на адлегласці 20 см адна ад адной, у калоне па аднаму, па дошцы, адзін канец якой прыўзняты на 30 см. Бегаць па зале на насках. Вазіць адно аднаго на санках, слізгацца па лядовай дарожцы, хадзіць на лыжах прыстаўным крокам.

**Скачкі.** Скакаць па чарзе на правай і левай назе, цераз вяроўку, на дзвюх нагах з паваротамі ў левы і правы бакі, у даўжыню з месца.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Пракочваць мячы паміж кеглямі (адлегласць 3 м, шырыня варот 30 см). Кідаць малы мяч па чарзе левай і правай рукой, стоячы на каленях, кідаць мяч у карзіну з-за галавы, кідаць мяч аб падлогу і лавіць яго.

**Лажанне.** Падлазіць без дапамогі рук пад вяроўку, дугу вышынёй 50 см. Узлазіць па гімнастычнай сценцы, пераходзячы ад адной сценкі да другой.

**Рухавыя гульні.** "Знайдзі сабе пару", "Угадай, хто паклікаў", "Зайцы і воўк", "Самалёты", "Лавішкі", "Паравоз", "Жабы", "Ліса ў куратніку", "Злаві сняжынку", "Зайчыкі", "Загані ільдзінку ў кола". "Трапны стралок".

### *III квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць адно за адным па крузе, высока падымаючы калені, рукі на поясе; хадзіць ўрассыпную ў зададзеным напрамку, мяняючы напрамак па сігналу.

Бегаць па крузе, узяўшыся за рукі.

Хадзіць па шнуры, пакладзеным на падлозе, хадзіць павольна па зале з мяшочкам на галаве.

**Скачкі.** Падскокваць на месцы, стараючыся дакрануцца да прадмета, падвешанага вышэй узнятай рукі дзіцяці на 5—10 см, скакаць у бок цераз вяроўку, пакладзеную на падлогу. Скакаць у даўжыню. Скакаць цераз скакалку.

**Кіданне і лоўля мяча.** Кідаць мяч аб сценку і лавіць яго; кідаць мяч уверх і лавіць яго; кідаць мяч у гарызантальную цэль; біць мячом аб падлогу і лавіць яго.

**Лажанне.** Узлазіць на нахіленую лесвіцу і злазіць з яе; прапаўзаць па гімнастычнай лаўцы. Прапаўзаць скрозь "тунэль".

**Рухавыя гульні.** "Хто хутчэй дабяжыць да сцяжка", "Жмуркі", "Самалёты", "Лавішкі", "Не забягайце ў кола",

"Пастух і статак", "Квахтуха і кураняты", "Дзве вясёлыя гусі", "Хто хутчэй па дарожцы?", "Ліса ў куратніку", "Кацяняты і шчаняты", "Малпачкі".

## IV квартал

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць па ўсёй зале, размахваючы рукамі, пераходзіць з хадзьбы на бег па сігналу; хадзіць па звілістай дарожцы, хадзіць, пераступаючы цераз прадметы (вышыня 20 см), рукі на поясе, хадзіць, высока падымаючы калені. Хадзіць па гімнастычнай лаўцы, выконваючы розныя заданні: павароты, прысяданні. Бегаць на насках, рукі за галавой; бегаць паміж прадметамі змейкай. Катацца на двухколавым веласіпедзе.

**Скачкі.** Скакаць у даўжыню з месца на 30—40 см, скакаць на дзвюх нагах вакол крэсла ў правы і левы бакі. Скакаць цераз скакалку, у "класы". Падскокваць уверх, пляскаючы ў далоні.

**Кіданне.** Кідаць мяч у карзіну, скрынку (адлегласць 1,5—2 м), кідаць малыя мячы ў цэль; кідаць мяшочкі ў гарызантальную цэль. Падкідваць круг адной рукой, лавіць дзвюма рукамі.

**Поўзанне і лажанне.** Поўзаць па гімнастычнай лаўцы. Узлазіць на гімнастычную сценку (вышыня 1,5 м) і спускацца; лазіць па нахіленай лесвіцы адвольна.

**Рухавыя гульні.** "Жмуркі", "Знайдзі сваю хатку", "Мяч наўздагон", "Хованкі", "Мой вясёлы гучны мяч", "Конікі", "Пастух і статак", "Дзве вясёлыя гусі", "Зайцы і воўк", "Мы на луг хадзілі", "Пападзі ў кола", "Хітрая ліса".

**Аздараўленчая гімнастыка, элементы акрабатыкі** (праводзяцца на працягу навучальнага года). Умацоўваць мышцы апорна-рухальнага апарату, мышцы звода ступні. Развіваць тонкую маторыку рук. Рабіць дыхальную гімнастыку. Фарміраваць правільную паставу. Выпрацоўваць лёгкую і правільную паходку. Выконваць "ластаўку" і "бярозку".

# ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

## I квартал

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць і бегаць у калоне па аднаму, перастройвацца ў калону па два, паварочвацца па сігналу ў час хадзьбы ў калоне па аднаму. Хадзіць, пераступаючы цераз мячы, рукі за галавой, прысядаць на сярэдзіне. Хадзіць рознымі спосабамі: у паўпрыседзе, з пяткі, на насках, высока падымаючы калені, выконваючы розныя імітацыйныя рухі. Хадзіць па гімнастычнай лесвіцы, па шнуры, па канаце бокам прыстаўным шагам з мяшочкам на галаве, рукі на поясе; хадзіць паміж прадметамі на насках, рукі за галавой. Бегаць паміж прадметамі, не дакранаючыся да іх. Бегаць, пераступаючы цераз брускі; бегаць безупынна 1,5 мінуты, чаўночным бегам ($3 \times 10$ м), спыняцца пасля бегу і стаяць на адной назе, рукі на поясе, прысядаць на насках, рукі ў бокі.

**Скачкі.** Скакаць наперад, энергічна адштурхоўваючыся дзвюма нагамі ад падлогі. Скакаць у вышыню, дакранаючыся да вісячага прадмета. Скакаць на дзвюх нагах на месцы, ногі накрыж, паміж прадметамі, з мяшочкам, заціснутым паміж каленямі; скакаць на правай і левай назе папераменна, рухаючыся наперад. Пераскокваць цераз шнуры. Заскокваць на перашкоду (вышыня 20 см), прызямляцца на паўсагнутыя ногі пры саскокванні.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Пракочваць мяч правай і левай нагой у зададзеным напрамку, весці мяч папераменна правай і левай рукой. Падкідваць мяч у гару дзвюма рукамі 5 і больш разоў запар. Перакідваць мяч дзвюма рукамі з-за галавы і ад грудзей. Закідваць мяч дзвюма рукамі ад грудзей у баскетбольную карзіну. Кідаць мяч у цэль.

**Поўзанне і лажанне.** Поўзаць на чацвярэньках паміж прадметамі, абапіраючыся на далоні і ступні, у чаргаванні з хадзьбой і бегам. Поўзаць па гімнастычнай лаўцы, абапіраючыся на передплечча і калені. Пралазіць у абруч бокам, пералазіць цераз перашкоды.

**Рухавыя гульні.** "Мышалоўка", "Лавішкі", "Зрабі фігуру", "Мы — вясёлыя рабяты", "Вудачка", "Хутка вазьмі", "Прабяжы ціха", "Кацяняты і шчаняты", "Пералёт птушак", "Не заставайся на падлозе", "Гусі-лебедзі", "Лавішкі-перабежкі", "Знайдзі і прамаўчы", "Не пападзіся", "Дзед Караль", "Маўчанка".

## II квартал

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць і бегаць па крузе, узяўшыся за рукі, з паваротамі ў розныя бакі. Хадзіць па нахіленай дошцы: бокам прыстаўным шагам, на насках, рукі на поясе. Бегаць у калоне па аднаму, трымаючы дыстанцыю; бегаць паміж прадметамі змейкай. Бегаць у розным тэмпе, дробным і шырокім шагам,

спінай наперад, галопам. Хадзіць і бегаць паміж снежнымі пабудовамі. Хадзіць на лыжах плаўным ходам, спускацца з невялікага схілу і падымацца "лесвічкай". Слізгаць па ля-довай дарожцы з розным становішчам рук. Перакідваць шайбу адно аднаму. Ляпіць снегавікоў, жывёлін, гуляць у снежкі.

**Скачкі.** Скакаць з нагі на нагу, рухаючыся наперад; на дзвюх нагах да снегавіка; паміж кеглямі з мяшочкам, заціснутым паміж каленямі. Скакаць бокам цераз канат, які ляжыць на падлозе. Падскокваць на дзвюх нагах з пераадольваннем перашкод. Пераскокваць цераз брускі. Скакаць у даўжыню (да 100 см) з месца.

**Кіданне і лоўля мяча.** Перакідваць мяч адно аднаму, стоячы на каленях, дзвюма рукамі з-за галавы, дзвюма рукамі знізу (адлегласць 3 м). Падкідваць і лавіць мяч. Закідваць мяч у круг.

Весці мяч у прамым напрамку рукамі наперад. Кідаць мяч аб зямлю правай і левай рукой 5 і больш разоў. Кідаць мяшочкі ў вертыкальную цэль. Кідаць снежкі ўдалечыню і ў цэль.

**Поўзанне і лажанне.** Поўзаць на чацвярэньках паміж кеглямі, поўзаць на жываце па гімнастычнай лаўцы, поўзаць на чацвярэньках з мяшочкам на спіне, поўзаць на чацвярэньках, пракочваючы мяч перад сабой галавой. Лазіць па гімнастычнай сценцы. Падлазіць пад дугу. Поўзаць пад лаўкай на жываце. Пралазіць у абруч, не датыкаючыся падлогі рукамі. Падлазіць пад палку і пераступаць цераз яе.

**Рухавыя гульні.** "Мароз Чырвоны нос", "Не заставайся на падлозе", "Паляўнічыя і зайцы", "Мы — вясёлыя рабяты", "Мядзведзі і пчолы", "Лавішкі парамі", "Совушка", "Замарожаныя", "Знойдзем зайца", "Мышалоўка", "Гусі-лебедзі", "Трапны стралок", "Злаві сняжынку", "Санны паравоз", "Шэры кот".

### *III квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць калонай па аднаму, паварочваючыся ў другі бок па сігналу. Хадзіць па канаце (шнуры) з мяшочкам на галаве, хадзіць, змяняючы тэмп руху, хадзіць і бегаць па крузе, змяняючы напрамак, урассыпную. Практыкаваць у хадзьбе з перастраеннем у пары і наадварот. Бегаць, высока падымаючы калені. Прабягаць 60 м з сярэдняй хуткасцю.

**Скачкі.** Скакаць з абруча ў абруч. Скакаць на дзвюх нагах цераз набіўныя мячы. Скакаць на дзвюх нагах паміж кеглямі. Скакаць бокам цераз кароткія шнуры. Скакаць з кароткай скакалкай на месцы і рухаючыся ўперад. Скакаць у даўжыню з разбегу.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Перакідваць мяч адно аднаму. Падкідваць і лавіць мяч з воплескам. Перакідваць мячы з адскокам ад падлогі і лавіць іх дзвюма рукамі з воплескам у далоні. Кідаць мяшочкі ў цэль з адлегласці 3,5 м. Падкідваць малы мяч адной рукой і лавіць дзвюма рукамі. Пракочваць абруч і пралазіць у яго. Кідаць мяч аб сцяну, у карзіну (круг) (адлегласць 2 м).

**Поўзанне і лажанне.** Поўзаць паміж кеглямі. Поўзаць па гімнастычнай лаўцы, абапіраючыся на далоні і ступні "па-мядзведжаму". Перапаўзаць цераз лаўку, чаргаваць перапаўзанне з хадзьбой. Падлазіць пад рэйку, дугу, абруч без апоры на рукі.

Лазіць на гімнастычную сценку, па вяровачнай лесвіцы.

**Рухавыя гульні.** "Пажарныя на вучэнні", "Гарэлкі", "Мядзведзі і пчолы", "Карусель", "Лавішкі", "Не заставайся на падлозе", "Вудачка", "Лавішкі-перабежкі", "Хітрая ліса", "Мышалоўка", "Гусі-лебедзі", "Хто хутчэй дабяжыць да сцяжка", "Воўк у рове", "Лавішка з мячом", "Івашка".

### *IV квартал*

**Хадзьба, бег, практыкаванні на развіццё раўнавагі.** Хадзіць, пераступаючы цераз скакалкі, мячы, высока падымаючы калені. Хадзіць па бервяну і па рознавысокіх пяньках, хадзіць па крузе, змяняючы напрамак руху. Хадзіць на насках. Бесперапынна бегаць да 2 мінут. Бегаць паміж прадметамі. Бегаць на хуткасць шарэнгамі. Хадзіць і бегаць па нахіленаму бервяну. Хадзіць па гімнастычнай лаўцы бокам. Бегаць урассыпную паміж прадметамі. Хадзіць, выконваючы практыкаванні для рук. Бегаць, пераступаючы цераз брускі. Хадзіць з заплюшчанымі вачамі. Праходзіць па вузкай рэйцы гімнастычнай лаўкі. Катацца на вялікім двухколавым веласіпедзе.

**Скачкі.** Скакаць цераз кароткую скакалку, скакаць на дзвюх нагах з мяшочкам, заціснутым паміж каленямі (адлегласць 5 м). Скакаць з разбегу ў вышыню, у даўжыню. Скакаць на правай і левай назе з абруча ў абруч. Скакаць цераз лаўку. Скакаць з паваротам.

**Качанне, кіданне і лоўля мяча.** Пракочваць набіўныя мячы ў прамым напрамку. Кідаць мяч уверх і лавіць. Кідаць мяч аб зямлю і лавіць. Кідаць мяч у гарызантальную цэль.

Адбіваць мяч у хадзьбе, бегу, закідваць мяч у круг, карзіну. Перакідваць мяч адно аднаму адной рукой. Кідаць мяшочкі ў цэль. Знаёміць дзяцей з элементамі футбола, баскетбола.

**Поўзанне і лажанне.** Поўзаць па лаўцы назад, перапаўзаць цераз прадметы. Падлазіць пад шнур, дугу прама і бокам. Пералазіць на другі бок вертыкальнай сценкі.

**Рухавыя гульні.** "Пятнашкі", "Бяздомны заяц", "Мы — вясёлыя рабяты", "Не заставайся на зямлі", "Вудачка", "Карасі і шчупак", "Пажар", "Карусель", "Совушка", "Лавішкі", "Хітрая ліса", "Гусі-лебедзі", "Паляўнічыя і зайцы", "Фігуры", "Ядомае і неядомае", "Паляўнічыя і качкі", "Лаўцы малпаў".

**Аздараўленчая гімнастыка, элементы акрабатыкі** (праводзяцца на працягу навучальнага года). Умацоўваць мышцы апорна-рухальнага апарату, мышцы брушнога прэса, мышцы зводу ступні. Развіваць тонкую маторыку рук. Рабіць дыхальную гімнастыку. Фарміраваць правільную паставу. Выконваць "ластаўку", "бярозку", "лодачку", "мосцік". Адціскацца ад падлогі і лаўкі. Куляцца на далёкасць з-за галавы цераз плячо.

## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ НА АСНОВЕ АЗНАЯМЛЕННЯ З НАВАКОЛЬНЫМ СВЕТАМ

### ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

#### *I квартал*

**Імёны.** Практыкаваць дзяцей у называнні свайго імя, імён бацькоў, сяброў, педагога, выхавальнікаў, абслуговага персаналу. Вучыць правільна задаваць пытанне "Як цябе завуць?" і адказваць на яго, адрозніваць імёны хлопчыкаў і дзяўчынак.

**Цацкі.** Назвы і прызначэнне. Разглядаць і называць цацкі, розныя дзеянні з імі. Разгляданне карціны "Мы гуляем", серыі карцін "Наша Таня". Вучыць адказваць на пытанні.

**Памяшканні.** Растлумачыць дзецям прызначэнне памяшкання групы. Вучыць арыентавацца ў групе, называць асноўныя памяшканні і збудаванні (групавы пакой, гардэроб, туалет, лесвіца, пляцоўка, веранда, пясочніца, горка, плот).

**Агародніна.** Экскурсія на агарод, разгляданне агародніны. Знаёміць з правіламі паводзін на агародзе. Разгляданне прадметных і сюжэтных карцін і муляжоў. Гульні: "Пазнай і назаві агародніну", "Пазнай па апісанню".

**Садавіна.** Экскурсія ў сад, разгляданне садавіны. Знаёміць з правіламі паводзін у садзе. Развіваць успрыманне прыгажосці навокал. Карціна "У садзе". Дыдактычныя гульні: "Пазнай і назаві садавіну", "Пазнай па апісанню".

**Свойскія птушкі (мясцовыя).** Вучыць дзяцей пазнаваць па знешнім выглядзе і называць свойскіх птушак у працэсе непасрэднага назірання, выдзяляць часткі цела, спосабы руху. Разгляданне карцінак, цацак. Знаёміць дзяцей з правіламі догляду птушак.

**Часткі цела і твару.** Ужываць словазлучэнне "часткі цела". Знаёміць дзяцей з часткамі цела і твару, паказваць на лялькі, на сабе, на дарослых і дзецях. Знаёміць з прадметамі догляду цела і твару.

**Посуд.** Знаёміць дзяцей з прызначэннем прадметаў посуду і дзеяннямі з імі. Разгляданне ілюстрацый, суаднясенне відарысаў з рэальнымі і цацачнымі аб'ектамі. Дыдактычныя гульні: "Пазнай і назаві посуд", "З чаго можна выпіць вады?", "З чаго можна есці?".

**Пара года — восень.** Вучыць дзяцей называць пару года і яе асноўныя прыметы: дзеянні людзей, змены ў жыцці раслін і жывёл. Назіраць за станам надвор'я: лістапад, на небе хмары, дождж, вецер. Знаёміць з уласцівасцямі некаторых аб'ектаў нежывой прыроды: вада — халодная, цёплая, льецца, замярзае; возера, рака; камяні — цяжкія, цвёрдыя, рознай формы, велічыні, колеру; пясок — сухі, мокры, сыплецца, лепіцца; гліна — сухая, цвёрдая, вільготная, мяккая, можна ляпіць.

**Святы і забавы.** Знаёміць дзяцей са святамі. Свята — дзень нараджэння. Развучваць вершы, песні. Падтрымліваць у дзяцей радасны настрой, заахвочваць іх да ўдзелу ў святце. Фарміраваць у дзяцей уяўленне аб сваім узросце.

### ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "Вадзічка-вадзічка", "Наша Маша маленькая", "Ладачкі-ладкі", "Вось і людзі спяць".

*Вершы:* А. Барто. "Цацкі"; І. Муравейка. "Ладкі"; Е. Лось. "Мая лялька"; С. Міхалкоў. "Андрушка"; З. Пятрова. "Мае цацкі".

*Казкі:* "Курачка-рабка"; "Рэпка", "Тры мядзведзі".

*Апавяданні:* Л. Талстой. "Расказы для маленькіх дзяцей".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Пацешкі: "Сарока", "Вось і людзі спяць", "Ладачкі-ладкі". Вершы: А. Барто. "Мячык", "Конік", "Зайка", "Мішка", "Караблік", "Капітан", "Сонейка".

## ГУКАВАЯ КУЛЬТУРА МОВЫ

Заняткі для развіцця гукавымаўлення:

- развіццё слыхавой увагі. Дыдактычныя гульні: "Сонейка і дожджык", "Угадай, хто крычыць", "Угадай, што рабіць", "Угадай, хто ідзе";
- развіццё моўнага слыху. Дыдактычная гульня "Пасняшым — насмяшым";
- развіццё моўнага дыхання. Дыдактычныя гульні: "Чый адуванчык раней паляціць?", "Ветрык", "Пусканне карабліка", "Сняжынка", "Птушкаферма";
- развіццё асноўных якасцей голасу (сілы, вышыні). Дыдактычныя гульні: "Дзьме вецер", "Ідзіце з намі гуляць", "Хто як крычыць";
- развіццё слыхавога ўспрымання. Дыдактычная гульня "Пазнай па голасу" і інш.;
- развіццё артыкуляцыйнага апарата;
- фарміраванне правільнага гукавымаўлення (шляхам перайманця). Дыдактычныя гульні тыпу "Пасняшым — насмяшым".

## *II квартал*

**Мэбля.** Назвы і прызначэнне. Разглядаць і называць прадметы мэблі ў групавым пакоі і іншых памяшканнях. Гульня "У лялькі Каці новая кватэра".

**Адзенне.** Назвы і прызначэнне. Разглядаць і называць адзенне ў гардэробе. Знаёміць са спосабамі догляду. Дзеці павінны ведаць сваё адзенне, беражліва адносіцца да яго.

**Абутак.** Назвы і прызначэнне. Разглядаць абутак ў гардэробе і называць яго. Знаёміць са спосабамі догляду.

**Свойскія жывёлы.** Вучыць дзяцей пазнаваць у адпаведнасці са знешнім выглядам і называць свойскіх жывёл у працэсе назірання за імі. Знаёміць з асаблівасцямі догляду свойскіх жывёл. Прагляд дыяфільмаў, слайдаў. Сюжэтныя карціны: "Кошка з кацянятамі", "Сабака са шчанятамі". Вучыць задаваць пытанні і адказваць на іх.

**Дзікія жывёлы.** Знаёміць дзяцей з дзікімі жывёламі Беларусі, іх знешнім выглядам. Вучыць называць дзікіх жывёл. Экскурсія ў заапарк. Прагляд дыяфільмаў, тэлеперадач. Разгляданне карцін, прадметных і сюжэтных слайдаў.

**Пара года — зіма.** Заахвочваць дзяцей запамінаць, называць, распазнаваць пару года, яе асноўныя прыметы. Назіраць за станам надвор'я: вецер, снегапад, завіруха; за аб'ектамі нежывой прыроды: снег — белы, халодны; лёд — цвёрды, слізкі. Правесці вопыты: лёд у памяшканні растае, ператвараецца ў ваду і інш.



**Святы і забавы.** Працягваць знаёміць дзяцей са святамі, замацоўваць уяўленне пра дзень нараджэння (віншаванне). Развучваць вершы і песні. Падтрымліваць у дзяцей радасны настрой, жаданне дапамагаць ва ўпрыгожванні групавога пакоя, заахвочваць да ўдзелу ў свяце.

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "Пякла бабка", "А ты, коцінька-каток".

*Вершы:* А. Барто. "Хто як крычыць?", "Прагулка", "Дзяўчынка мурзатая"; І. Муравейка. "Адмарозіў лапкі"; В. Высоцкая. "Карова", "На санках"; В. Жукоўскі. "Коцік і козлік".

*Казкі:* "Калабок", "Коцік, Петрык і мышка"; "Тры мядзведзі".

*Апавяданні:* Я. Шабад. "Лесвіца"; Л. Талстой. "Расказы для маленькіх дзяцей".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: А. Барто. "Сабачка", "Кошка"; З. Аляксандрава. "Снег, снег"; А. Пракоф'еў. "Маленькай ёлачцы"; В. Жукоўскі. "Зайчык"; І. Сурыкаў. "Птушка".

## ГУКАВАЯ КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

Удакладненне і замацаванне правільнага гукавымаўлення (вымаўленне асобнага гука, спалучэнняў, гукаперамальных слоў). Замацаванне гукаў у складах, словах, фразах, пацешках, вершах.

Галосныя гукі ***а, у, э, і, о***. Гульні: "Добры доктар Айбаліт", "Пазаві паравоз", "Заблудзілася Аленка", "Конік", "Хто ўмее ўсміхацца?", "У лялькі баляць зубы" і інш.

Гукі ***м (м'), п (п'), б (б'), ф (ф')***. Гульні: "Мышка, дзе ты?", "Як сігналіць машына?", "Пузыр" і інш.

## *III квартал*

**Вуліца.** Знаёміць дзяцей з разнастайнымі вуліцамі. Фарміраваць уяўленне аб разнастайнасці вуліц: шырокія, вузкія, доўгія, кароткія. Экскурсіі па сумежных з дзіцячым садам вуліцах: назіраць, дзе ходзяць людзі, дзе едуць машыны, дзе пераходзяць вуліцу; разглядаць жылыя дамы і іншыя будынкі. Разгляданне вуліц на паштоўках, прадметных карцінах, ілюстрацыях у кнігах.

**Транспартныя сродкі.** Віды транспарту: машыны, аўтобус, тралейбус, трамвай, параход, лодка. Спосабы перамяшчэння — па зямлі, па вадзе. Экскурсія па вуліцы: назіраць за рухам транспарту, работай святлафораў. Разгляданне транспартных сродкаў на карцінках, ілюстрацыях у кнігах.

**Прафесіі людзей.** Знаёміць дзяцей з прафесіямі людзей, дзейнасць якіх блізкая іх сацыяльнаму вопыту: няня, выхавальніца, настаўніца, доктар, повар, дворнік. Экскурсія па дзіцячаму саду: назіраць за працай дарослых. Вучыць берагчы вынік працы.

**Матэрыялы.** Знаёміць дзяцей з уласцівасцямі паперы, ваты, дрэва (ірвецца, мнецца, ляціць, прамакае, клеіцца, сшываецца, мяккае, цвёрдае, гладкае і г. д.). Разглядание разнастайных вырабаў з паперы, ваты, дрэва, дыферэнцыяцыя іх па матэрыялу. Збіранне прыроднага матэрыялу.

**Расліны.** Назіраць за раслінамі (дрэвы, кусты, кветкі, травы) на тэрыторыі дзіцячага сада і любавацца імі. Назіраць за зменамі ў росце хатніх раслін у групе, дапамагаць дарослым даглядаць іх. Разгляданне прадметных і сюжэтных карцінак, ілюстрацый.

**Пара года — вясна.** Асноўныя прыметы пары года: змены ў адзенні, працы людзей, спосабе жыцця жывёл і раслін. Назіраць за станам надвор'я; за аб'ектамі нежывой прыроды: вада, пясок, гліна, камяні, іх уласцівасці і прызначэнне (з гліны робяць посуд і г. д.).

**Святы і забавы.** Працягваць знаёміць дзяцей са святамі. Свята — дзень нараджэння. Вучыць віншаваць са святам. Развучваць вершы, песні. Вучыць дапамагаць упрыгожваць групавы пакой, удзельнічаць у забавах.

### ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "Кіска, кіска, брысь!", "Люлі, люлі, люлі", "Пайшоў каток на таржок".

*Вершы:* Н. Найдзёнава. "Машына"; І. Такмакова. "Да нас вясна ідзе"; С. Капуцікян. "У мяне"; Б. Захадэр. "Будаўнікі", "Шафёр", "Расцём у працы".

*Апавяданні:* Л. Талстой. "Расказы для маленькіх дзяцей".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: Я. Колас. "Вясна"; П. Дружынін. "Прыляцелі нашы госці"; А. Сярова. "Ландыш"; Т. Волгіна. "Паравоз".

### ГУКАВАЯ КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

Удакладненне і замацаванне правільнага гукавымаўлення (вымаўленне ізаляванага гука, гукаспалучэнняў, гукаперараймальных слоў). Замацаванне гукаў у складах, словах, у фразавай мове, вершах.

Зычныя гукі ***в, к, н, д, т (ц'), г, х***. Гульні: "Вецер", "Хто як крычыць", "Дожджык", "Бяжы, конік".



## ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

### *І квартал*

**Звесткі аб чалавеку.** Імя, прозвішча, дыферэнцыяцыя імя і прозвішча, узрост, хатні адрас, імёны бацькоў, сяброў па групе, педагога, выхавальнікаў, абслуговага персаналу.

**Памяшканні.** Экскурсія па дзіцячаму саду: знаёміць дзяцей з новымі памяшканнямі (кухня, пральня, кабінеты і г. д.) і іх прызначэннем. Вучыць дзяцей арыентавацца ў памяшканнях дзіцячага сада, ведаць абслуговы персанал, берагчы вынікі яго працы. Заахвочваць далучацца да сумесных з дарослымі працоўных дзеянняў. Заахвочваць называць, адрозніваць памяшканні (па прызначэнню).

**Агародніна і садавіна.** Пашыраць уяўленні дзяцей аб садавіне і агародніне (знешні выгляд, структура, смак, пах). Экскурсіі ў магазіны, на рынак. Разгляданне карцін з вывамі саду, агарода, муляжоў. Заахвочваць называць і адрозніваць плады па прызнаку спеласці і дабраякаснасці (гнілы, спелы і г. д.)

**Свойскія птушкі і іх дзіцяняты.** Назвы і прызначэнне. Знешні выгляд, асноўныя часткі цела, дзе жывуць, чым кормяцца, якую карысць прыносяць, як іх даглядае чалавек.

**Адзенне і абутак.** Віды адзення, абутку, прызначэнне, прадметы догляду, часткі адзення і абутку. Адзенне і абутак восеннюю. Экскурсія ў магазіны. Разгляданне адзення і абутку на карцінках.

**Мэбля.** Новыя віды мэблі. Часткі мэблі. Суадносіць натуральныя аб'екты з цацкамі, з іх відарысамі на карцінках. Экскурсія ў магазін "Мэбля".

**Часткі сутак (дзень, ноч).** Характэрныя прыметы і працэсы, якія адбываюцца ўдзень, ноччу (што адбываецца ў прыродзе, у жыцці дзяцей).

**Пара года — восень.** Змена пораў года. Асноўныя прыметы восені: адзенне і дзейнасць людзей, змены ў жыцці раслін і жывёл. Назіраць за аб'ектамі нежывой прыроды: гліна, пясок, камяні, паветра (яго не бачым, але адчуваем). Азнаёміць з іх уласцівасцямі: пясок сыпучы, з вільготнага пяску можна ляпіць; засохлая гліна цвёрдая, а вільготная — добра лепіцца.

**Святы і забавы.** Працягваць знаёміць дзяцей з асноўнымі святочнымі датамі. Свята — дзень нараджэння. Працягваць вучыць віншаваць са святам дарослых і дзяцей. Развучваць вершы, песні. У дні свят падтрымліваць у дзяцей радасны настрой, заахвочваць да упрыгожвання групавога пакоя, актыўнага ўдзелу ў святце.

### ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "Іграў я на дудцы", "У куце сядзіць мядзведзь", "Горкай, горкай, горачкай", "А брысь, коця, у замор'е"; В. Вітка. "Бабіны госці".

*Вершы:* І. Муравейка. "Ладкі"; Ю. Тувім. "Гародніна"; калыханка "Іванка"; Я. Колас. "Храбры певень"; А. Вольскі. "Куркі".

*Казкі:* "Пых"; "Маша і мядзведзь", "Як курачка пеўніка ратавала", "Каток — залаты лабок"; М. Прышвін. "Лісічын хлеб".

*Апавяданні:* Л. Талстой. "Расказы для маленькіх дзяцей"; Я. Тайц. "Колькі?", "Алоўкі", "Уперадзе ўсіх"; К. Ушынскі. "Пеўнік з сям'ёй", "Гусі".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: А. Пляшчэеў. "Восень"; І. Такмакова. "Дуб". Пацешка "Ягорачка".

### ГУКАВАЯ КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

Фарміраванне граматычнага строю маўлення.

Удакладненне і замацаванне правільнага гукавымаўлення (вымаўленне асобнага гука, гукаспалучэнняў, гукаперамальных слоў), замацаванне гукаў у складах, словах, сказах.

Гукі і дыферэнцыяцыя гукаў: ***с, з (з'), с—з, ц, ш, с—ш, ж.*** Дыдактычныя гульні: "Помпа", "Сава", "Кветкі і пчолы", "Сапсаваны тэлефон", "Што каму", "Цішыня", "Лес шуміць", "Цягнік", "Кот на даху", "Свісціць—шыпіць", "Пчолы", "Жукі".

Работа над словам. Словазмяненне (адзіночны і множны лік назоўніка). Вучыць дзяцей правільна ўжываць назоўнікі ў адзіночным і множным ліку.

Словаўтварэнне (пазнаёміць з утварэннем слоў пры дапамозе суфіксаў), памяншальна-ласкальныя формы.

Разуменне і адрозніванне назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду.

Дапасаванне дзеяслова-выказніка да назоўніка-дзейніка ў родзе і ліку.

Дапасаванне назоўніка да прыметніка ў родзе.

## *II квартал*

**Посуд.** Працягваць знаёміць дзяцей з новымі відамі посуду, фарміруючы ўяўленне аб чайным і сталовым посудзе. Класіфікацыя посуду па прызначэнню. Розныя варыянты параўнання відаў посуду. Знаёміць дзяцей з часткамі посуду, спосабамі яго догляду і захавання. Разгляданне посуду на карцінках. Экскурсія ў магазін "Посуд".



**Свойскія жывёлы.** Пашыраць веды аб знаёмых свойскіх жывёлах і іх дзіцянятах (знешні выгляд, харчаванне, выкарыстанне жывёл у гаспадарцы, догляд іх). Прагляд кінафільмаў, тэлеперадач аб жыцці жывёл. Разгляданне свойскіх жывёл на карцінках, кніжных ілюстрацыях. Карціны: "Сабака са шчанятамі", "Кошка з кацянятамі".

**Дзікія жывёлы.** Пашыраць уяўленні аб дзікіх жывёлах (знешні выгляд, месца пражывання, асаблівасці харчавання, вырошчванне дзіцянят, клопаты бацькоў аб іх). Розныя варыянты параўнання відаў жывёл. Класіфікацыя свойскіх і дзікіх жывёл па адметных уласцівасцях. Прагляд кінафільмаў, тэлеперадач аб жыцці дзікіх жывёл. Разгляданне іх на карцінках, кніжных ілюстрацыях. Экскурсія ў заапарк. Карціна "Якія бываюць жывёлы".

**Дзікія птушкі.** Вучыць пазнаваць і называць дзікіх птушак. Пазнаёміць з характэрнымі прыметамі іх знешняга выгляду, месцамі пражывання, асаблівасцямі харчавання, звычкамі, карысцю. Даць уяўленне аб пералётных птушках (чаму адлятаюць у цёплыя краіны), аб дапамозе зімуючым птушкам ("птушыныя сталовыя"). Назіраць за птушкамі ў час прагулак. Прагляд тэлеперадач. Разгляданне птушак на карцінках, кніжных ілюстрацыях. Карціны: "Таня і галубы", "Ці ведаем мы птушак?".

**Часткі цела і твару.** Паказваць і называць часткі цела і твару на сабе і на іншых людзях. Вучыць адрозніваць і называць прадметы догляду цела і твару. Знаёміць з правіламі бяспекі: папярэджванне бытавых траўм.

**Транспартныя сродкі.** Пашыраць уяўленні дзяцей аб транспартных сродках і іх прызначэнні (перавозка людзей і грузаў), вучыць называць розныя віды грузавога і пасажырскага транспарту (трамвай, тралейбус, аўтобус, самалёт). Удакладніць веды дзяцей аб спосабах перамяшчэння рознага транспарту — па рэйках, пры дапамозе электрадугі і г. д. Назіраць за дзеяннямі людзей, якія кіруюць машынамі. Суадносіць відарысы транспартных сродкаў на карцінках з цацкамі. Экскурсія ў аўтобусны парк. Карціна "На вуліцы вялікага горада". Правілы бяспекі на вуліцы.

**Пара года — зіма.** Пазнаёміць з асноўнымі прыметамі: зімняе адзенне, дзейнасць людзей, дзіцячыя гульні. Назіраць за аб'ектамі нежывой прыроды, знаёміць з іх уласцівасцямі, вучыць адрозніваць і называць якасці вады, снегу (белы, халодны), лёду (цвёрды, слізкі), паветра. Карціна "Таня не баіцца мароза".

**Дні тыдня.** Знаёміць дзяцей з днямі тыдня і іх паслядоўнасцю. Даць уяўленне аб дзейнасці людзей у розныя дні тыдня (працоўныя дні, выхадныя).

**Святы і забавы.** Працягваць фарміраваць уяўленні пра святы: дзень нараджэння, Новы год. Развучваць вершы і песні, уводзіць дзяцей у свет любімых казачных вобразаў. Заахвочваць дзяцей танцаваць, вадзіць карагоды, гуляць у вясёлыя гульні. Сістэматычна арганізоўваць розныя па зместу і форме забавы.

### ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "А брысь, коця", "Кукарэку-певунок".

*Вершы:* К. Чукоўскі. "Майдадыр"; А. Барто. "Дзяўчынка мурзатая"; Я. Чарушын. "Воўк", "Белка", "Заяц"; І. Шуцько. "Мой аўтапарк"; С. Маршак. "Дзеткі ў клетцы".

*Казкі:* "Тры мядзведзі", "Казляняткі і воўк"; С. Маршак. "Казка пра неразумнае мышанё"; Ш. Перо. "Чырвоная Шапачка"; "Чаму кот мыецца пасля яды".

*Апавяданні:* К. Ушынскі. "Конік"; Я. Брыль. "Жыў-быў вожык"; В. Біянкі. "Рыхтуюцца да зімы"; Н. Паўлава. "Дрэвы зімой".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: Н. Саконская. "Дзе мой пальчык?"; П. Пранузa. "Снегіры"; Я. Колас. "Зіма"; М. Чарняўскі. "Новы год"; С. Маршак. "Ёлка".

### ГУКАВАЯ КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

Удакладненне і замацаванне правільнага гукавымаўлення. Замацаванне гукаў у складах, словах, фразах, вершах, лічылках.

Гукі ***ш—ж, ч, ш, ш—ч, л (л'), р, р—л;*** іх дыферэнцыяцыя.

Дыдактычныя гульні: "Скупы кот", "Прагулка ў лес", "Цягнік", "Вераб'і", "Конік", "Самалёты", "Балбатушка".

Вучыць састаўляць сказы (па прадметнай, сюжэтнай карцінцы).

Прыназоўнікі (***на, у, з, над, пад, за, да, ад***).

Работа над інтанацыйнай завершанасцю сказаў.

Састаўленне расказаў (па прадметнай, сюжэтнай, пейзажнай карціне, па сюжэтнай серыі карцін, па ўяўленню).

Дапасаванне лічэбніка да назоўніка.

## *III квартал*

**Прафесіі людзей.** Знаёміць з прафесіямі бацькоў, людзей, якія працуюць у дзіцячай установе (повар, дворнік, прачка, урач, шафёр, будаўнік). Назіраць за іх працай. Разгляданне карцінак. Прагляд дыяфільмаў, фрагментаў тэлеперадач. Карціна "На будоўлі дома і школы". Вучыць берагчы вынікі працы.



**Матэрыялы.** Пашыраць уяўленні дзяцей аб матэрыялах (кардон, скура, шкло, фарфор, жалеза, пластмаса) і іх уласцівасцях (ламаецца, б'ецца, рвецца, гарыць, тоне, не тоне). Разглядаць разнастайныя прадметы і вызначаць матэрыялы, з якіх яны зроблены.

**Расліны.** Практыкаваць у адрозненні асноўных частак раслін (ствол, галінкі, лісце, карэнне). Вучыць дзяцей пазнаваць дрэва, куст ва ўсе поры года. Назіраць за раслінамі, якія растуць на тэрыторыі і ў памяшканні дзіцячага сада. Вучыць заўважаць змены з дрэвамі, травой, кветкамі ў сувязі з сезоннымі з'явамі. Разглядаць карцінкі, ілюстрацыі, слайды, пазнаваць знаёмыя расліны, вызначаць пару года. Карціна "Якія бываюць расліны".

**Прадукты харчавання.** Знаёміць з асноўнымі прадуктамі харчавання. Вучыць распазнаваць іх у адпаведнасці з назвай, смакам. Даць уяўленне пра гатаванне стравы. Фарміраваць культуру харчавання, уменне адрозніваць дабраякасную і недабраякасную ежу.

**Вуліца.** Разглядаць дамы рознага прызначэння, назіраць за рухам транспарта на вуліцы. Знаёміць з правіламі паводзін на вуліцы (вучыць пераходзіць вуліцу). Экскурсіі па вуліцах паблізу дзіцячага сада (удакладняць веды дзяцей аб прызначэнні дзіцячага сада, школы, магазіна, пошты).

**Пара года — вясна.** Пазнаёміць з асноўнымі прыметамі вясны (адзенне, дзейнасць людзей; змены ў жывой прыродзе — з'яўленне дзіцянят у жывёл, вяртанне пералётных птушак). Назіраць за аб'ектамі нежывой прыроды (снег, вада, паветра, гліна, пясок, камяні).

**Святы і забавы.** Знаёміць са святам 8 Сакавіка. Вучыць рыхтаваць віншаванне дзяўчынак і дарослых. Развучваць вершы і песні. Выхоўваць у дзяцей пачуццё радасці, жаданне актыўна ўдзельнічаць у свяце.

### ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Вершы:* А. Майкаў. "У маі"; А. Сярова. "Званочак", "Адуванчык"; К. Чукоўскі. "Тэлефон"; Н. Найдзёнава. "Самалёт", "Машына"; М. Клокава. "Зіма прайшла".

*Казкі:* "Ліса, заяц і пеўнік", "Двое сумных мядзведзяў", "Снягурка і ліса", "Пеўнік і бабовае зярнятка".

*Апавяданні:* В. Хомчанка. "Яшава рукавічка"; Я. Пярмяк. "Як Маша стала вялікай"; Л. Талстой. "Расказы для маленькіх дзяцей"; Н. Калініна. "Як дзеці пераходзілі вуліцу".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: Я. Колас. "Вясна"; В. Русу. "Мая мама"; М. Пажараў. "Маляры"; С. Маршак. "Гэй, каваль, маладзец", "Вясенняя песенька", "Снег вясной не той, што зімой"; А. Майкаў. "Май"; А. Пляшчэеў. "Фарбы вясны".

## ГУКАВАЯ КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

Знаёмства з тэрмінам “слова” (суадносіць словы з прадметам; розныя словы). Дыдактычныя гульні: “Дзіцячы свет”, “Хто ўважлівы”, “Хто ведае, якога слова не хапае?”, “Успомнім розныя словы”.

Знаёмства з рознымі гукамі. Дыдактычныя гульні: “Што гучыць вакол нас?”, “Падбяры падобныя словы”, “Адгадай, што я сказала”.

Гукавая лінейка (вымаўленне гукаў ва ўстаноўленай паслядоўнасці).

Працягласць гучання слова (доўгія і кароткія словы, пераўтварэнне кароткіх слоў у доўгія). Дыдактычныя гульні: “Маўчанка”, “Кароткае ці доўгае?”.

Інтанацыйнае выдзяленне гука ў словах на прыкладзе зычных (спачатку з трох гукаў, затым з чатырох, нарэшце, з двух адкрытых складоў — *каза, ружа*).

Называнне слоў з зададзеным гукам.

Вучыць выдзяляць першы гук у слове.

Фарміраванне ўмення правільна змяняць словы, карыстацца некаторымі спосабамі ўтварэння слоў (назваx дзіцянят жывёл, посуду і інш.). З гэтай мэтай паглыбляюцца ўяўленні дзяцей аб адносінах паміж формай і значэннем слова (“Гэта што? — Прамень”. “Гуляем дзе? — На лузе”. “У кошкі — кацяня, у лісы — лісяня. А хто ў бусла? У дзятла?”).

Удакладняць і замацоўваць вымаўленне дзецьмі ўсіх гукаў беларускай мовы, спалучэнне некаторых гукаў. Гульні: “Стук-стук”, “Ку-ка-рэ-ку”, “Аркестр” і інш.

Практыкаваць дзяцей у пабудове звязных выказванняў: пераказ тэкста, апісанне цацкі, прадмета, складанне расказа па зместу карціны з апорай на асабісты вопыт. Гульні: “Паштальён прынёс паштоўкі”, “Магазін”, “Адгадай, якая цацка”.

Знаёміць дзяцей з некаторымі спосабамі злучэння сказаў і частак тэксту паміж сабой.

## ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

### *І квартал*

**Звесткі аб чалавеку.** Абагульніць усе неабходныя звесткі аб сабе, бацьках, братах, сёстрах, імёны і імёны па бацьку працаўнікоў дзіцячага сада. Паглыбляць уяўленні аб бяспецы жыцця (дома, на вуліцы).



**Наш дзіцячы сад.** Наша група. Экскурсія па саду, групах. Пашыраць уяўленне аб прызначэнні асноўных памяшканняў.

**Агародніна і садавіна.** Паглыбляць уяўленні дзяцей аб агародніне і садавіне: ведаць назвы, дыферэнцыраваць, пераўтвараць, пазнаваць у любым выглядзе. Экскурсіі ў сад, на агарод, у магазін, на рынак. Дапамагаць дарослым збіраць ураджай агародніны, садавіны. Вучыць гатаваць салату: чысціць, наразаць, змешваць прадукты.

**Свойскія і дзікія птушкі і іх дзіцяняты.** Пашыраць веды аб свойскіх і дзікіх птушках і іх дзіцянятах (знешні выгляд, асаблівасці будовы, адрозненні ў будове цела, характэрныя гукі, месцапражыванне, карысць). Практыкаваць у параўнанні, класіфікацыі птушак па адметных уласцівасцях. Звярнуць увагу на адлёт і прылёт птушак (пералётныя птушкі); на птушак, якія зімуюць, клопат чалавека аб іх. Разгляданне карцінак, ілюстрацый, прагляд дыяфільмаў, тэлеперадач.

**Свойскія і дзікія жывёлы і іх дзіцяняты.** Працягваць фарміраваць і ўдакладняць уяўленні дзяцей аб свойскіх і дзікіх жывёлах і іх дзіцянятах (знешні выгляд, асноўныя дзікіх жывёлах і іх дзіцянятах (знешні выгляд, асноўныя часткі цела, адрозненні ў будове цела, гукі, якімі адклікаюцца, дзе жывуць, чым кормяцца, карысць, догляд чалавекам). Практыкаваць у параўнанні, класіфікацыі жывёл па адметных уласцівасцях. Пазнаёміць з жыццём дзікіх жывёл восенню: падрыхтоўка да зімы. Разгляданне карцін, прагляд дыяфільмаў, тэлеперадач. Гутарка “Як рыхтуюцца да зімы дзікія жывёлы”.

**Адзенне і абутак.** Працягваць вучыць дзяцей адрозніваць адзенне і абутак у залежнасці ад пары года, матэрыялу, з якога яны зроблены, знаёміць са спосабамі догляду. Фарміраваць у дзяцей беражлівыя адносіны да адзення і абутку. Экскурсія ў магазін. Разгляданне карцінак.

**Поры года: лета — восень (параўнанне).** Фарміраваць уяўленні аб сезонных з’явах у прыродзе. Летам: цёпла, сонечна, ідуць дажджы, шмат травы, кветак, ягад, паспявае агародніна і садавіна, шмат матылькоў, жукоў, стракоз, птушак; людзі косяць траву, нарыхтоўваюць сена. Восенню: пахаладанне, частыя дажджы, вятры, ападае лісце, вянуць травы, збіраюць ураджай агародніны і садавіны, знікаюць матылькі, жукі, адлятаюць птушкі ў цёплыя краіны.

**Гутарка “За што мы любім лета”.** Назіраць за надвор’ем восенню, вызначаць яго асноўны стан (дзьме вецер, ідзе дождж, пахмурна, сонечна, туман); заўважаць сувязі: све-

ціць сонейка — становіцца цяплей, ідзе дождж — лужыны і г. д. Вучыць весці каляндар надвор'я. Арганізаваць збор лісця, насення, прыроднага матэрыялу. Гутарка "Праца людзей восенню". Экскурсіі ў лес, сад, парк, поле. Разглядание асенніх лісцяў, пладоў. Пашыраць веды аб нежывой прыродзе, арыентуючыся на даступнасць матэрыялаў і штодзённую дзейнасць дзяцей.

**Часткі сутак. Дні тыдня. Поры года.** Фарміраваць уяўленні аб часе (часткі сутак, дні тыдня, поры года; паслядоўнасць іх змен, працягласць, асноўныя прыметы). Вучыць дзяцей разумець і выяўляць прычынна-выніковыя залежнасці.

**Святы і забавы.** Вучыць дзяцей расказваць пра свята. Удакладняць веды пра дзень нараджэння, уменне віншаваць са святам. Развучваць вершы і песні. Заахвочваць дзяцей далучацца да агульнага святочнага настрою, уключацца ў гульні, забавы.

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Вершы:* Н. Галіноўская. "Калыханка"; У. Маякоўскі. "Што такое добра і што такое дрэнна"; Э. Агняцвет. "Скокі".

*Казкі:* "Каласок", "Пых", "Гусі-лебедзі", "Піліпка-сынок".

*Апавяданні:* У. Юрэвіч. "Шумны лістапад"; В. Асеева. "Пячэнне"; В. Хомчанка. "Яблык"; І. Сакалоў-Мікітоў. "Прыйшлі асеннія халады".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: А. Пляшчэеў. "Восень наступіла"; М. Івенсен. "Падае лісце"; О. Іваненка. "Адлятаюць птушкі".

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

Фарміраваць уяўленне аб слове. Фарміраваць уяўленне аб сказе. Вучыць рабіць аналіз сказа: дзяліць на словы; устанаўліваць сувязь слоў у сказе. Вучыць складаць сказы.

Даць паняцце пра склад слова. Вучыць дзяліць словы на склады. Дыдактычныя гульні: "Хто ў каго?", "Адгадай маё слова".

Знаёміць з тэрмінам "гук". Практыкаваць у называнні слоў з зададзеным гукам. Вучыць знаходзіць знаёмыя гукі ў вершах; месца гука ў слове (першы, апошні). Вучыць праводзіць гукавы аналіз слоў (*мак, дом, дым, сыр*); параўноўваць: *жук* і *лук*, *кот* і *кіт*. Вучыць адрозніваць зычныя і галосныя гукі.



## *II квартал*

**Часткі цела і твару.** Фарміраваць уяўленне дзяцей пра часткі цела і твару. Цела складаецца з розных частак. Нашы "памочнікі" — органы пачуццяў дазваляюць нам бачыць, распазнаваць пахі, смак, адчуваць дотык, боль і г. д. Рукі і ногі дазваляюць нам рухацца. Унутры цела ёсць шмат касцей. Удакладняць веды дзяцей пра гігіену цела і догляд зубоў. Правілы бяспекі: папярэджванне бытавых траўм і іншых няшчасных выпадкаў.

**Мэбля, посуд.** Замацоўваць веды аб відах прадметаў, іх прызначэнні, вырабе, матэрыялах, спосабах догляду і г. д. Экскурсіі ў магазіны мэблі, посуду.

**Прадукты харчавання.** Ведаць назвы, смак асноўных прадуктаў харчавання. Вывучаць іх з дапамогай розных органаў пачуццяў (па выгляду, смаку, паху). Вучыць адрозніваць прадукты, якія прайшлі тэрмічную апрацоўку, і сырыя, дабраякасныя і недабраякасныя. Працягваць фарміраванне культуры харчавання.

**Свойскія і дзікія жывёлы.** Ведаць і называць свойскіх і дзікіх жывёл. Замацоўваць веды аб іх знешнім выглядзе, будове цела, месцах пражывання, карысці, асаблівасцях харчавання, догляду. Практыкаваць у параўнанні і класіфікацыі. Знаёміць з жыццём дзікіх жывёл зімой. Прагляд дыяфільмаў, тэлеперадач, разгляданне карцінак. Экскурсія ў заапарк.

**Птушкі.** Удакладняць звесткі пра пералётных птушак (растлумачыць прычыны пералёту) і птушак, якія зімуюць. Назіраць за зімуючымі птушкамі. Практыкаваць у параўнанні і класіфікацыі птушак, у называнні мясцовых зімуючых птушак. Падкормка птушак зімой. Гутарка "Дзеці — сябры птушак". Стварэнне праблемна-пошукавых сітуацый.

**Горад.** Забяспечыць веданне дзецьмі назвы роднага горада, сталіцы Рэспублікі Беларусь, назваў іншых гарадоў Беларусі. Замацоўваць веды грамадскіх будынкаў (цырк, тэатр, пошта, бальніца).

**Транспартныя сродкі.** Працягваць пашыраць уяўленні дзяцей аб пасажырскім і грузавым транспарце і аб транспарце спецыяльнага назначэння (самалёты, параходы грузавыя і пасажырскія, "хуткая дапамога", пажарная машына, паштовая машына, сеялка, трактар і г. д.). Практыкаваць у параўнанні і класіфікацыі. Даць дзецям новыя звесткі аб спосабах перамяшчэння: транспарт наземны, падземны, паветраны, водны. Экскурсія на бліжэйшыя вуліцы: вывучаць

правілы дарожнага руху; назіраць за работай святлафора, паводзінамі людзей.

**Поры года: восень—зіма (параўнанне).** Працягваць фарміраваць уяўленні дзяцей аб сезонных з'явах у прыродзе. Назіраць за надвор'ем зімой і параўноўваць з асеннім. Гутарка пра зімовыя з'явы ў жывой і нежывой прыродзе. Весці каляндар надвор'я. Растлумачыць, што надвор'е ўплывае на тое, як апранаюцца людзі. Забавы дзяцей зімой. Экскурсія ў зімні парк. Карціна "Вось дык пакатаўся".

**Святы і забавы.** Заахвочваць дзяцей расказваць пра свята. Ведаць свой дзень нараджэння. Умець віншаваць са святам і днём нараджэння дзяцей і дарослых. Развучваць вершы і песні. Падтрымліваць у дзяцей радасны настрой, прыцягваць да ўпрыгожвання пакоя, удзелу ў гульнях, забавах.

### ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "Зіме на закуску"; "Кукарэку-певунок".

*Казкі:* "Трое парасят"; Н. Паўлава. "Зімняя гулянка"; В. Сцееў. "Хто сказаў "мяў"?"; "Коцік, пеўнік і лісіца"; Д. Мамін-Сібірак. "Шэрая Шыйка".

*Вершы:* В. Высоцкая. "Зімовыя скокі"; Я. Журба. "Коцік"; І. Сурыкаў. "Надыход зімы", "Рабінка"; М. Танк. "Сняжынкі"; С. Шушкевіч. "Нашы сябры"; П. Марціновіч. "Дзіўны, дзіўны Дзед Мароз"; М. Чарняўскі. "Мой аўтапарк"; Е. Лось. "Аэрадром"; У. Скарынкін. "У палёт"; І. Такмакова. "Пагуляем"; Я. Купала. "Зіма"; Л. Пранчак. "Завіруха"; А. Барто. "Дзяўчынка мурзатая"; К. Чукоўскі. "Майдадыр"; В. Вітка. "Карусель".

*Апавяданні:* В. Біянкі. "Рыхтуюцца да зімы"; Н. Паўлава. "Дрэвы зімой"; Л. Талстой. "Расказы для маленькіх дзяцей".

### НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

**Работа над сказам і словам.**

Праводзіць гукавы аналіз слоў (*шар, рак, ружа, месяц, рыба, ліса, сані, рука, піла, павук, гусі, качкі, іголка, слон* і інш.).

Дзяліць сказы (з 2—3 слоў) на словы, вызначаць паслядоўнасць слоў у сказах і складаць сказы з зададзенай колькацю слоў па сюжэтных малюнках і графічных схемах.

Фарміраваць уяўленне пра склад як частку слова.

Дзяліць слова на склады, вызначаць іх колькасць.

Знаёміць з якаснымі характарыстыкамі гукаў: пры дапамозе галоснага гука можна праспяваць мелодыю, можна гучна вымаўляць, каб было чуваць на адлегласці; струмень паветра пры вымаўленні галосных гукаў выходзіць свабодна, без перашкод; пры вымаўленні зычных чуюцца голас і шум (*м, н, л, ж*) або толькі шум (*ш, п, к, х*) і г. д.

**Галосныя і зычныя.**

**Абазначэнне гукаў літарамі.** ***А*** (гук і літара), ***У*** (гук і літара), ***О*** (гук і літара).

**Галосныя гукі і літары *А, У, О*.**

**Слова *АУ*** (гукавы аналіз і сінтэз, чытанне).

**Слова *УА*** (гукавы аналіз і сінтэз, чытанне).

**Зычныя гукі: *М*** (гук і літара), ***Х*** (гук і літара), ***П*** (гук і літара), ***Т*** (гук і літара), ***К*** (гук і літара).

**Работа ў сшытку.** Арыентацыя на старонках сшытка. Напісанне элементаў літар.

### *III квартал*

**Прафесіі.** Пашыраць уяўленні дзяцей аб прафесіях: від дзейнасці, прылады працы, вынік працы (цырульнік, медсястра, будаўнік, швачка, паштальён, бібліятэкар і інш.). Экскурсіі на будоўлю, у цырульню, атэльє. Вучыць суадносіць веды аб новых прафесіях з родам заняткаў сваіх бацькоў, сваякоў.

**Матэрыялы і інструменты.** Працягваць работу па фарміраванню ўяўленняў аб матэрыялах і інструментах і іх уласцівасцях: метал (тонкі, тоўсты, згінаецца, не згінаецца), папера рознай таўшчыні (для чаго выкарыстоўваецца), тканіны рознай якасці (шоўк, шэрсць, паркаль), шкло (тоўстае, тонкае, празрыстае, непразрыстае, каляровае, б'ецца), пластмаса (тонкая, тоўстая, белая, сіняя), ніткі, тасьма, стужкі (тонкія, тоўстыя, моцныя, нямоцныя, рвуцца, не рвуцца; шарсцяныя, шаўковыя, баваўняныя). Знаходзіць сярод навакольных прадметаў тыя, што зроблены са знаёмых матэрыялаў. Разглядаць інструменты, якія зроблены са знаёмых матэрыялаў, паказваць спосабы іх выкарыстання (пэндзлік, шчотка, мяцёлка, ручка, шуфлік, рыдлёўка, граблі). Заахвочваць ведаць, называць матэрыялы, інструменты і дзеянні, якія імі робяць.

**Раслінны свет.** Працягваць вучыць распазнаваць культурныя і дзікарослыя расліны бліжэйшага наваколля (дрэвы, кусты, кветкі); адрозніваць па лістах, кары хваёвыя і ліставыя дрэвы, кусты ад дрэў, травяністыя расліны па колеру, форме лістоў і кветак. Дзеці засвойваюць назвы знаёмых раслін, месцы, дзе яны растуць (лес, луг, сад), назіраюць за ростам раслін у садзе, на агародзе. Фарміраваць уяўленні аб тым, што для жыцця і росту раслін неабходны адначасова

святло, вада, цяпло і пажыўная глеба. Экскурсія ў лес. Карціна "Расліны, якія нас кормяць" (як на стале з'явіўся хлеб). Правядзенне вопытаў, стварэнне праблемна-пошукавых сітуацый.

**Насякомыя.** Знаёміць дзяцей з насякомымі (матылькі, стракозы, мурашкі, пчолы, камары, мухі, божыя кароўкі, жукі), расказваць пра іх карысць ці шкоду для людзей і раслін. Арганізаваць назіранні за насякомымі, звяртаць увагу на характар іх руху, паводзін (поўзае, лётае, гудзіць, звініць, кусае, джаліць).

**Рыбы.** Знаёміць дзяцей з рыбамі (карась, акунь, шчупак, сом), іх знешнімі асаблівасцямі (галава, тулава, хвост, плаўнікі, цела пакрыта луской; на галаве — рот, вочы, жабры), асяроддзем жыцця (усе жывуць у вадзе). Весці назіранні за жыццём рыб кутка прыроды, даглядаць іх. Развіваць уменне параўноўваць і класіфікаваць па адметных асаблівасцях.

**Поры года: зіма — вясна (параўнанне).** Працягваць фарміраваць уяўленні дзяцей аб сезонных з'явах у прыродзе. Зімой: мароз, снегапад, снег падае сняжынкамі, пакрывае зямлю, вадаёмы пакрыты лёдам, лёд слізкі, дрэвы — без лісця, няма малылькоў, жукоў, мала птушак. Вясной: цяплее, птушак становіцца болей, у агародзе саджаюць агародніну, на клумбах — кветкі. Весці каляндар надвор'я. Назіраць за працай і адзеннем людзей у розную пару года. Звяртаць увагу дзяцей на праяўленне адзнак святла і цемнаты ў залежнасці ад пары года. Экскурсіі ў лес (за першымі кветкамі), у сад, калі ён цвіце. Карціна "Гракі прыляцелі".

**Часткі сутак. Дні тыдня. Поры года.** Працягваць фарміраваць уяўленне аб часе. Вучыць дзяцей адрозніваць і называць дзень і ноч, дні тыдня, месяцы пораў года, асноўны стан надвор'я. Вучыць выяўляць сувязі: дзьме вецер — гойдаюцца галіны дрэў; ідзе дождж — на зямлі лужыны, мокра; свеціць сонейка — стала цёпла, высахлі лужыны, суха. Уводзіць паняцці: *рана, позна, сёння, учора, на наступны дзень*. Суадносіць час сутак са зменамі ў прыродзе і з дзейнасцю дзяцей.

**Вуліца.** Працягваць знаёміць дзяцей з правіламі паводзін на вуліцы. Вучыць пераходзіць вуліцу, запамінаць дарогу ад дома да сада. Дзецям неабходна ведаць назву вуліцы, на якой яны жывуць, назвы некаторых грамадскіх будынкаў і іх прызначэнне (аптэка, бальніца, паліклініка, рынак, цырк, пошта, школа і інш.). Экскурсіі па гораду.

**Святы і забавы.** Свята 8 Сакавіка. Падрыхтоўка да ранішніка. Дзеці дапамагаюць упрыгожваць групавы пакой, малююць віншаванні, запрашальныя білеты, рыхтуюць падарункі, развучваюць вершы, песні, танцы. Гутарка пра працу мам і бабуль, пра дапамогу старэйшым у хатніх справах. Заахвочваць дзяцей расказваць, як прайшлі святочныя дні дома. Вучыць успрымаць розныя забавы (прагляд фільма, спектакля, канцэрта, гульню, спаборніцтвы і г. д.) як агульную прывабную падзею тыдня. Заахвочваць дзяцей праяўляць актыўнасць, імкнуцца да ўдзелу ў разнастайных забавах.

**Падрыхтоўка да школы.** Знаёміць дзяцей з абавязкамі школьніка, вучэбнымі прыладамі, правіламі паводзін у школе. Стымуляваць развіццё вучэбнай дзейнасці (кантроль, самакантроль, абагульненыя спосабы практычнай і інтэлектуальнай дзейнасці і г. д.).

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ЧЫТАННЯ І РАСКАЗВАННЯ

*Пацешкі:* "Вожык", "Ягорачка", "А ты, коцінька-каток".

*Вершы:* С. Міхалкоў. "Дзяцька Сцёпа — міліцыянер"; А. Талстой. "Званочкі мае"; У. Луцэвіч. "Шпакі"; А. Сярова. "Незабудкі"; М. Пазнанская. "Рамонкі"; Р. Барадулін. "Раскідач"; Х. Жычка. "Святлафор"; Я. Колас. "Песня аб вясне"; Я. Бядуля. "Мае забавы".

*Казкі:* "Зайкава хатка"; А. Талстой. "Прыгоды Бураціна"; "Снягурка", "Сястрыца Алёнка і братка Іванка".

*Апавяданні:* К. Ушынскі. "Умей пачакаць"; Л. Талстой. "Костачка", "Кацянё"; Н. Калініна. "Як дзеці пераходзілі вуліцу"; Л. Талстой. "Прыйшла вясна".

*Завучванне на памяць (па выбару).* Вершы: А. Благініна. "Мамін дзень"; Г. Ладонпчыкаў. "Новы дом"; М. Хведаровіч. "Дарагое імя"; Я. Бядуля. "Вясной"; С. Маршак. "Вясенняя песенька"; Я. Трутнёва. "Майскае свята", "Ластаўка".

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

***С*** (гук і літара, пісаць у сшытку).

Гукавы аналіз і сінтэз, чытанне, пісьмо прамых адкрытых складоў з зычнымі ***п, т, к*** і галоснымі ***а, о, у***.

Гукавы аналіз і сінтэз, чытанне, пісьмо слоў *МАК, КОТ, СУП, СУК, СОК.*

Дзяленне слова на склады.

Складовы і гукавы аналіз, чытанне, пісьмо слоў *МАМА, ТАТА.*

Чытаць склады з гэтых літар, па складах словы. Пісаць вялікія і малыя літары ў сшытку. Вусны аналіз слоў. Складанне слоў з азбукі. Складанне сказаў з двух-трох слоў.

## НАВУЧАННЕ ГУЛЬНІ

### ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

#### СЮЖЭТНА-РОЛЕВАЯ ГУЛЬНЯ

Выхоўваць у дзяцей цікавасць да прапанаваных ім цацак, фарміраваць жаданне дзейнічаць з імі. Вучыць выкарыстоўваць сюжэтныя цацкі згодна з іх функцыянальным прызначэннем, выхоўваць клапатлівыя адносіны да цацак.

Вучыць пераносіць знаёмыя дзеянні з цацкамі ў розныя гульнёвыя сітуацыі. Пабуджаць дзяцей да развіцця гульні з дапамогай наводзячых пытанняў: *На машыне кубікі, што будзем рабіць далей? Ці хочаш ты пабудаваць гараж?* Заахвочваць дзяцей да выказванняў.

##### *І квартал*

"У нас у гасцях лялька Маша". Абыгрыванне лялькі: закалыхваць на руках, класці спаць, мыць рукі, твар, гуляць з лялькай і г. д.

"Накармі ляльку (мішку, зайку)". Фарміраваць клапатлівыя адносіны да цацак.

"Дзень нараджэння лялькі Каці". Адзначаць свята дня нараджэння.

Элементы драматызацыі казак "Курачка-рабка", "Рэпка".

##### *ІІ квартал*

"У матрошак (лялек) наваселле". Вучыць дзяцей уменню гуляць у гульні, якія адлюстроўваюць з'явы паўсядзённага жыцця.

"Частаванне матрошак (лялек)". Фарміраваць клапатлівыя адносіны да лялькі.

"Адзенем дачку на прагулку". Вучыць гульнёвым дзеянням, звязаным з апрананнем.

"Свята ёлкі", "У лялек навагодняе свята". Апранаць ляльку ў святочнае адзенне. Святкаванне свята ёлкі.

Элементы драматызацыі казкі "Калабок".

"Купанне лялькі (малышоў)". Вучыць гульнёвым дзеянням, якія звязаны з купаннем лялькі.

"Прыходзьце да нас у госці", "Да нас у госці прыйшлі матрошкі (лялькі)", "Паездка ў госці". Вучыць браць на сябе ролю гаспадыні; выхоўваць правілы добрага тону. Дзеці чытаюць вершы, спяваюць, танцуюць.

Элементы драматызацыі казкі "Церамок".



##### *ІІІ квартал*

"Паездка ў аўтобусе". Дзеці з лялькамі, мішкамі, зайцамі едуць у аўтобусе, разглядаюць, называюць усё, што бачаць праз акно. Фіксуюць, калі аўтобус едзе, стаіць, едзе хутка, павольна.

"Лялька Каця захварэла", "Прыём урача". Вучыць быць у ролі доктара і лячыць ляльку; выхоўваць суперажыванне.

#### ДЫДАКТЫЧНАЯ ГУЛЬНЯ

##### *І квартал*

Пазнаёміць дзяцей з дыдактычнымі цацкамі, выклікаць цікавасць да іх, эмацыянальныя адносіны, жаданне гуляць з імі.

Вучыць з частак збіраць цэлы прадмет (выкарыстоўваць зборна-разборныя цацкі), узнаўляць (шляхам прымервання) цэласную выяву карцінак, разрэзаных (як па гарызанталі, так і па вертыкалі) на 2—4 часткі, выкарыстоўваць мэтанакіраваныя пробы.

Развіваць дробную маторыку пальцаў, каардынацыю рухаў рукі. Гульні: "Бірулькі" (кіданне дробных прадметаў у вузкую адтуліну), "Пасадзім грыбы", "Пасадзім ялінкі" (укладванне ножак у адтуліну). Гульні з мазаікай.

Вучыць збіраць (з дапамогай дарослага) па пераймманню пірамідку з 4—5 кольцаў; самастойна збіраць пірамідку з 2—3 кольцаў (выкарыстоўваюцца пробы, прымерванне).

Вучыць самастойна збіраць двухмесныя дыдактычныя цацкі (выкарыстоўваюцца пробы, прымерванне), трох-, чатырохмесныя цацкі — місачкі-ўкладышы, кубы-ўкладышы, матрошкі і г. д.

Вучыць суадносіць рэальныя аб'екты з іх відарысамі.

##### *ІІ квартал*

Вучыць распазнаваць асноўныя колеры. Гульні: "Каляровая лесвічка" (дзеянні па ўзору); "Пракаці шарык" (суаднясенне колеру шарыка з колерам варотаў); "Каляровыя вежы" (суаднясенне аб'ектаў пры выбары з чатырох); "Каляровая мазаіка" (складанне ўзору адпаведна колеру поля); "Пацеркі для лялек" (нанізванне пацерачак зазначанага колеру — па ўзору, па слову і г. д.); "Усё па месцах" (раскладванне розных цацак па асноўнай прымеце — колеру; у якасці ўзору выкарыстоўваюцца каляровыя фоны). Вучыць распазнаваць на карціне рухі жывёл, людзей.

Вучыць распазнаваць рэзка адметныя формы (шар, куб). Гульні: "Пазнай навобмацак" (пазнаць навобмацак куб незалежна ад велічыні), "Раскладзі правільна" (класіфікацыя шароў і кубаў розных колераў і памераў па асноўнай прымеце — форме).

Вучыць суадносіць плоскасныя і аб'ёмныя формы. Гульні: "Займальная скрынка" (прапіхванне аб'ёмных фігур у адпаведныя адтуліны — круглую і квадратную); "Зачыні акно" (плоскасныя формы круга і квадрата прыкладаюцца да адпаведных адтулін у сценках дома); "У каго такі?" (суаднясенне плоскасных і аб'ёмных аб'ектаў па форме незалежна ад колеру і вылічыні з наступным абмацваннем і абвядзеннем).

Вучыць дыферэнцыраваць аднародныя прадметы па велічыні. Гульні: "Шукай такі ж" (групоўка рознакаляровых шароў па велічыні адпаведна ўзорам); "Пакладзі тут, там" (групоўка рознакаляровых кубоў па велічыні адпаведна ўзорам); "Пакладзі правільна" (раскладванне вялікіх і малых кубоў і шароў у скрынкі адпаведнай велічыні); "Зачыні акно" (суаднясенне квадратных, круглых ці розных па форме ўкладышаў вялікіх і маленькіх памераў з адтулінамі-вокнамі адпаведных памераў).

### *III квартал*

Знаёміць дзяцей з размяшчэннем прадметаў у прасторы (унізе—уверсе).

Фарміраваць уяўленне пра аб'екты, якія маюць пастаяннае прасторавае размяшчэнне (зямля — унізе, неба — уверсе, падлога — унізе, столь — уверсе).

Падводзіць дзяцей да разумення таго, што большасць прадметаў у навакольным асяроддзі маюць адноснае становішча ў прасторы, гэта значыць адзін і той жа прадмет можа быць і ўнізе, і ўверсе; паказваць дзецям адноснасць месца ўнізе, уверсе ў дачыненні да трэцяга вымярэння. Гульні: "Унізе—уверсе", "Дзе ляжыць?", "Вершаліна", "Доручэнне" і інш.

Вучыць пазнаваць прадметы на карцінках, дзеянні, якія дэманструюцца, з іх выявамі. Гульні: "Лато—малышам", "У каго?", "Цудоўны мяшэчак", "Шукай" і інш.

Дыдактычныя гульні на ўдакладненне назваў і прызначэння прадметаў, дзеянняў з імі: "Пакой для лялькі", "Нашы цацкі (лато)", "Што гэта?", "Што надзела лялька?", "Правільна—няправільна", "Вазьмі—пакладзі", "Здымі—надзень" і інш.



## ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

### СЮЖЭТНА-РОЛЕВАЯ ГУЛЬНЯ

### *I квартал*

"Раніца лялькі". Ускладняць ланцужок гульнёвых дзеянняў, вучыць логіцы бытавых дзеянняў: пад'ём, гімнастыка, умыванне, выціранне, адзяванне, кармленне лялькі.

"Купанне лялькі". Развіваць ланцужок гульнёвых дзеянняў, якія адлюстроўваюць раздзяванне, купанне, выціранне, адзяванне і ўкладванне лялькі спаць; вучыць дзяцей дзейнічаць па моўнай інструкцыі; вучыць выдзяляць прычынна-выніковыя сувязі.

"Кармленне лялькі", "Адзяванне лялькі". Вучыць дзяцей дзейнічаць з уяўляемымі аб'ектамі — вада, суп, каша; вучыць выкарыстоўваць прадметы-заменнікі: мыла — кубік, хлеб — мазаічная пласцінка і г. д. Аб'яднанне дзяцей па трое.

### *II квартал*

"Мама і дачка", "Тата і дачка", "Мама і сын", "Тата і сын". Вучыць дзяцей браць на сябе ролю мамы, таты, праяўляць клапатлівыя адносіны да лялькі-дачкі (сына): умываць, карміць, катаць на калясцы і г. д.

"Мыццё лялькі". Вучыць дзяцей браць на сябе ролю мамы і таты, выконваць паслядоўныя гульнёвыя дзеянні, якія адлюстроўваюць мыццё бялізны лялькі-дачкі; вучыць выяўляць прычынна-выніковыя залежнасці.

"Лялька захварэла". Вучыць дзяцей браць на сябе ролю доктара, лячыць ляльку — ставіць градуснік, даваць лекі і г. д.

### *III квартал*

"Госці". Вучыць дзяцей браць на сябе ролю мамы, таты, лялькі-дачкі (сына), выхоўваць правілы добрага тону.

"Дзень лялькі". Вучыць дзяцей аб'ядноўваць асобныя гульнёвыя сюжэты ў разгорнутую сюжэтную гульню, якая адлюстроўвае дзеянні лялькі на працягу дня: пад'ём, гімнастыка, адзяванне, прыём ежы і г. д.

"Пакой лялькі". Пашыраць уяўленні дзяцей пра жыллёвае памяшканне, вучыць падбіраць неабходную для пакоя мэблю, зыходзячы з патрэб, вучыць прыгожа расстаўляць яе.

## ДЫДАКТЫЧНАЯ ГУЛЬНЯ

### *I квартал*

Працягваць вучыць дзяцей складаць цэлы прадмет з частак (выкарыстоўваць зборна-разборныя цацкі). Вучыць аднаўляць цэласную выяву: складаць разразныя карцінкі з 4—6 частак шляхам зрокавага суаднясення ці прымервання (карцінкі — прадметныя або тыя, на якіх адлюстраваны просты сюжэт; канфігурацыя разрэзу — па вертыкалі, гарызанталі, дыяганалі).

Вучыць самастойна збіраць пірамідку з 5—7 кольцаў, чатырох-, пяцімесныя цацкі (матрошкі, кубы-ўкладышы, місачкі-ўкладышы і г. д.) шляхам прымервання ці зрокавага суаднясення.

### *II квартал*

Працягваць вучыць распазнаваць шэсць колераў. Гульні: "Пракаці такі ж шарык" (суаднясенне па колеру з любым іншым прадметам, са словам, назвай); "Хто хутчэй збярэ цацкі ў скрынку" (выбар цацак адпаведна колеру скрынкі); "Каляровыя каўпачкі", "Падбяры па колеру" (падбор парных прадметных карцінак з мноства); "Кожную пацерачку на сваё месца" (суаднясенне пацерак з колерам ніткі), "Падбяры сабе таварышаў" (супастаўленне і абагульненне прадметаў па колеру); "Якога колеру не стала?" (знаходжанне і называнне такога ж колеру); "Адзенем ляльку прыгожа" (выбар па слову-назве адзення адпаведнага колеру).

Вучыць распазнаваць формы, якія рэзка адрозніваюцца і падобны адна на адну (шар, куб, прамавугольнік, авал). Гульні: "Пазнай навобмацак" (знаёмства з авалам і кубам прамавугольнай формы, дыферэнцыраваць шар, авал, куб); "Пакладзі правільна" (класіфікацыя шароў, авалаў, кубоў, кубікаў, прамавугольнікаў рознага колеру і рознай велічыні на чатыры групы па асноўнай прымеце — форме); "Адгадай, што гэта?" (на падставе зрокава-датыкальнага і датыкальнага абследавання суаднесці аб'ект з узорам, са словам-назвай).

Вучыць суадносіць плоскасныя і аб'ёмныя формы. Гульні: "Займальная скрыначка" (прапіхванне аб'ёмных фігур у адпаведныя адтуліны); "У каго такі ж?" (суаднясенне аб'ёмных і плоскасных фігур); "Даміно фігур" (знаходжанне сярод мноства адной адпаведнай плоскаснай фігуры, называнне яе); "Знайдзі прадмет такой жа формы" ( вылучэнне формы канкрэтных прадметаў навакольнай абстаноўкі, карыстаючыся геаметрычнымі ўзорамі); "Што ляжыць у мяшэчку" (суаднясенне некалькіх прадметаў з геаметрычным узорам); "Кожную фігуру на сваё месца" (падкладванне плоскасных фігур да розных аб'ёмных прадметаў); "Адшукай тое, што схавана" (самастойнае вызначэнне і называнне формы прадметаў, падвядзенне да абагульнення прадметаў па форме); "Выкладванне арнаменту па малюнку" (складанне арнаменту з асобных геаметрычных фігур шляхам накладання іх на контурныя выявы; называнне геаметрычных фігур.

Працягваць вучыць распазнаваць прадметы па велічыні; разумець адноснасць велічынь. Дыдактычныя гульні: "Навядзі парадак" (групоўка рознакаляровых і рознавялікіх шароў, кубоў і авалаў па велічыні, па ўзорах; асноўная прымета — велічыня); "Адгадай, хто дзе жыве" (размяшчэнне звяркоў, лялек, машын, яблыкаў і іншых прадметаў адпаведна памеру ў свае домікі, гаражы, карзіны і г. д.; называнне прадметаў, дзеянняў, вызначэнне прычынна-выніковай залежнасці); "Каму што даць?" (групоўка доўгіх і кароткіх прадметаў адпаведна ўзорам: у адной лялькі доўгая стужка, у другой — кароткая, дзеці раздаюць лялькам алоўкі, палачкі, тасёмкі, шалікі, вяроўкі, папяровыя палоскі і г. д.). Такія ж гульні праводзяцца на распазнаванне шырокіх—вузкіх, тоўстых—тонкіх аб'ектаў.

### *III квартал*

Працягваць вучыць дзяцей разумець размяшчэнне прадметаў у прасторы (унізе—уверсе). Гульні: "Упрыгожым ёлку" (размяшчэнне цацак унізе—наверсе, апісанне размяшчэння цацак); "Даручэнне" (размяшчэнне кожнай пары прадметаў адпаведна ўнізе—уверсе; выбар месца прапануецца зрабіць самім дзецям); "Дзе сядзіць (ляціць, бяжыць, свеціць, спіць)?" (вызначэнне месца дзеяння аб'ектаў).

Праводзіць уласна дыдактычныя гульні і гульні-заняткі на замацаванне назваў прадметаў, дзеянняў, прызначэння прадметаў, часавых уяўленняў і г. д. Дыдактычныя гульні: "Цудоўны мяшочак", "Магазін цацак", "Што там?", "Што трэба ляльцы?", "Пакладзём ляльку спаць", "Апранём ляльку на прагулку", "У каго што ў руках", "Пазнай па смаку", "Дапаможам ляльцы", "Хто пазнае?", "Хто як перамяшчаецца?", "Калі гэта бывае?" і інш.

## ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

### СЮЖЭТНА-РОЛЕВАЯ ГУЛЬНЯ

Асноўным зместам сюжэтна-ролевай гульні на гэтым этапе выхавання і развіцця дзяцей становіцца выкананне дзеянняў, якія звязаны з адносінамі да іншых людзей. Мэтазгодна пабуджаць дзяцей прымяняць у гульнях усе сродкі гульнёвага замяшчэння. Асаблівая ўвага ўдзяляецца такім адносінам, як узаемны кантроль, узаемная патрабавальнасць і ацэнка, грамадская думка. Гульня выкарыстоўваецца як сродак арганізацыі дзіцячага жыцця і развіцця "дзіцячага грамадства", самастойнасці гульнёвай дзейнасці кожнага дзіцяці.

#### *I квартал*

"Доктар", "Мама і дачка", "Магазін", "Аптэка": два персанажы, адзін з якіх з'яўляецца аб'ектам дзеяння другога.

"Лялька захварэла": дзве дзеючыя асобы, лялька ў ролі дачкі.

#### *II квартал*

"Аўтобус", "Свята ёлкі", "Мама і дочкі", "Госці", "Дзіцячы садок", "У кіно".

#### *III квартал*

"У доктара", "Магазін", "Аптэка", "Сям'я", "Тэатр", "Цырк", "Чыгунка", "У кіно", "Цырульня": тры ролі, пры гэтым у некаторых гульнях адна з роляй можа быць абагульненай — дзеці, пасажыры, гледачы і г. д. Некаторыя гульні можна ў далейшым аб'ядноўваць, напрыклад "Аўтобус" і "Цырк", "Магазін" і "Сям'я" і інш.

### ДЫДАКТЫЧНАЯ ГУЛЬНЯ

#### *I квартал*

Працягваць вучыць дзяцей арыентавацца на розныя ўласцівасці прадметаў пры выкананні гульнёвых задач з дыдактычнымі цацкамі: самастойнае збіранне шматкольцавай пірамідкі на ўзроўні зрокавага суаднясення.

Вучыць самастойна збіраць шляхам зрокавага суаднясення шматмесныя цацкі (матрошкі, кубы-ўкладышы, місачкі-ўкладышы і г. д.); групаваць прадметы па велічыні (аб'ём, шырыня, вышыня, таўшчыня), не звяртаючы ўвагі на іх прызначэнне і ўласцівасці (колер, форма). Гульні: "Пабудуем дом" (падбор плоскасных дэталей да ўзору-сценкі: дах, дзверы, вокны і інш. двух памераў), "Падбяры правільна" (суаднясенне аб'ектаў па велічыні).

Працягваць вучыць разумець адноснасць велічынь. Гульні: "Навядзі парадак", "Чыё месца ў радзе?", "Збяры яблыкі", "Выберы імгненна адзенне", "Тры мядзведзі" і інш.

#### *II квартал*

Вучыць распазнаваць блізкія колеры і іх адценні. Гульні: "Лятаючыя каўпачкі", "У каго такі ж колер?", "Каляровыя кругі", "Якога колеру прадметы ў групе?", "Якога колеру не стала?", "Падбяры прадметы падобнага колеру", "Каляровы дыск", "Адзень ляльку прыгожа" і інш.

Вучыць групаваць прадметы па колеру, пакідаючы ў баку іншыя ўласцівасці. Гульні: "Назаві, што тут сіняе (белае, чырвонае і г. д.)", "Пакажы, што чырвонае (сіняе, жоўтае і г. д.)", "Адгадай па апісанню" і інш.

Працягваць вучыць распазнаваць рэзка адметныя і падобныя формы. Гульні: "Пазнай навобмацак", "Пазнай па апісанню", "Складзі сабаку (рыбу, машыну і г. д.) і апішы" (складванне геаметрычных фігур з наступным называннем), "З якіх фігур складаецца прадмет?", "Розныя дамы" (параўнанне малюнка і чарцяжа прадмета, вызначэнне адрознення і падабенства ў састаўных частках дома).

Групаваць прадметы па форме, не звяртаючы ўвагі на прызначэнне і іншыя ўласцівасці. Гульні: "Лато", "Хто першы?", "Бяжы да мяне", "Стань побач" і інш.

Вучыць вызначаць якасці прадмета па матэрыялу. Гульні: "Пазнай навобмацак", "Назаві, што тут драўлянае (металічнае, шкляное)", "Пазнай па апісанню", "Пакладзі правільна", "Навядзі парадак" і інш.

Вучыць узнаўляць цэласны вобраз прадмета пры складанні кубікаў (з арыентацыяй на карцінку), зборна-разборных цацак, пры выкананні гульнёвых задач у лато, пры складанні разразной прадметнай і сюжэтнай карцінкі з рознай канфігурацыяй разрэзу на 7 і болей частак, пры замалёўцы прадмета ці сюжэта з арыентацыяй на асобныя разразныя часткі.

#### *III квартал*

Вучыць вызначаць змяненні ў размяшчэнні прадметаў (уверсе—унізе, справа—злева, за—перад, над—пад, упера-

дзе—ззаду). Гульні: “Дзе ляжыць, дзе стаіць?”, “Адгадай, дзе?”, “Апішы пакой для лялькі”, “Правільна—няправільна” і інш.

Вучыць пазнаваць прадметы па асобных характэрных дэталях. Гульні: “Каму што падыдзе?”, “Адрамантуй цацку”, “Знайдзі пару”, “Куды пакласці” і інш.

Праводзіць уласна дыдактычныя гульні і гульні-заняткі на ўдакладненне прызначэння прадмета, замацаванне абагульняючых паняццяў і г. д.: “Хто дзе жыве?”, “Не заблудзі”, “Хто што згубіў?”, “Што расце — не расце?”, “Што ядуць — не ядуць?”, “Бывае — не бывае”, “У садзе і агародзе”, “Адгадай па апісанню”, “Транспарт” (настольна-друкаваная гульня), “Рассыпаныя словы”, тэматычнае лато “Агародніна—садавіна”, “Свойскія і дзікія жывёлы” і інш.

## ВЫХАВАННЕ ПРАЦАВІТАСЦІ

### ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

### ВЫХАВАННЕ ПЕРАДУМОЎ ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Самаабслугоўванне**

Вучыць дзяцей звяртаць увагу на свой знешні выгляд, заўважаць неахайнасць і непарадак у сваім адзенні і ўстараняць яго з дапамогай дарослых.

Вучыць бачыць вынік працы, адчуваць яго неабходнасць для сябе: зашпіліў з дапамогай дарослага рукавы — стала зручна гуляць, рукавы не перашкаджаюць; зашнураваў з дапамогай выхавальніка боцікі — стала зручна хадзіць, шнуркі не блытаюцца пад нагамі пры хадзьбе і г. д.

Выхоўваць звычку да чысціні, акуратнасці. Вучыць своечасова і акуратна рабіць свой туалет, карыстацца унітазам і туалетнай паперай, пасля чаго мыць рукі з мылам; твар і рукі выціраць сваім ручніком; карыстацца індывідуальным грабеньчыкам, насоўкай; у час ежы карыстацца сурвэткай; вучыць выходзіць з-за стала пасля заканчэння яды.

Вучыць знаходзіць сваю шафку для адзення. Прывучаць здымаць адзенне і складваць яго на крэсла, ставіць абутак на месца. Звяртаць увагу дзіцяці на тое, як яно выконвае дзеянні (выварочвае рукавы, зашнуроўвае боцік, ставіць у шафу абутак, зачыняе дзверцы шафы).

Вучыць распранацца і апранацца ў пэўнай паслядоўнасці.

Пабуджаць дзяцей да самастойнасці ў працэсе ўмывання.

Праводзіць дыдактычныя гульні з мэтай засваення культурна-гігіенічных навыкаў: “Якія мы прыгожыя”, “Чыста памыемся”, “Складзём свае рэчы акуратна”, “Умыванне лялькі” і інш. Пацешка “Вадзічка-вадзічка” і інш.

Знаёміць з правіламі папярэджання траўматызму пры самаабслугоўванні (твар, цела).

**Гаспадарча-бытавая праца**

Вучыць выконваць простыя даручэнні: да заняткаў раскладаць алоўкі, паперу, прыбіраць цацкі на месца пасля гульні, выносіць цацкі на ўчастак, раскладваць лыжкі на стале, ставіць сурвэтніцы, даваць корм рыбкам, птушкам і г. д. Правілы папярэджання траўматызму ў быце.

**Праца ў прыродзе**

Уключаць дзяцей у пасільную працу на ўчастку (працоўныя даручэнні: сеяць насенне на расаду, паліваць кветкі, збіраць у азначанае месца лісце, палачкі, каменьчыкі, паперу, увільгатняць пясок у пясочніцы). Вучыць бачыць канчатковы вынік працы. Правілы папярэджання траўматызму ў працэсе працы ў прыродзе.

### ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

Замацоўваць веды, уменні, навыкі і звычкі, якія дзеці атрымалі на першым годзе навучання.

**Самаабслугоўванне**

Працягваць вучыць дзяцей культурна паводзіць сябе за сталом: самастойна і акуратна есці; не крышыць хлеб; не праліваць суп; правільна карыстацца лыжкай, сурвэткай; ціха ставіць крэсла, выходзячы з-за стала, дзякаваць.

Працягваць фарміраваць самастойнасць ва ўменні апранацца і распранацца ў патрэбнай паслядоўнасці; акуратна складваць і вешаць адзенне, самастойна знаходзіць непаладкі ў адзенні і абутку.

Вучыць дзяцей самастойна ўмывацца, карыстацца мылам, насуха выціраць твар і рукі сваім ручніком. Працягваць вучыць карыстацца унітазам і туалетнай паперай, мыць рукі пасля наведвання туалета, перад ежай, па меры забруджвання; карыстацца ўласным грабеньчыкам; чысціць зубы раніцай і нанач.

Выхоўваць звычку да працоўнага намагання. Ацэньваць дзейнасць дзіцяці, заахвочваць яго поспехі, прыцягваць дзяцей да аналізу вынікаў працы, пераадольвання цяжкасцей, якія ўзнікаюць у працы, ацэнкі дзейнасці кожнага дзіцяці.

Паглыбленне ведаў і ўменняў пры папярэджанні траўматызму пры ўсіх відах працы.

**Гаспадарча-бытавая праца**

Вучыць дзяцей захоўваць парадак у групавым і гульнёвым пакоях, у спальні (індывідуальныя і калектыўныя даручэнні).

Заахвочваць дзяцей да выканання і такіх даручэнняў, якія не даюць бачных вынікаў: схадзіць куды-небудзь і аднесці (узяць) што-небудзь, спытацца ці перадаць нешта на словах. Развіваць адказнасць у дзейнасці.

Вучыць праціраць анучкай цацкі, сталы, крэслы, мыць лялечнае адзенне, рамантаваць разам з выхавальнікам кнігі, цацкі, паліцы.

Вучыць даглядаць хатнія расліны, карміць рыбак, птушак.

Вучыць дапамагаць сервіраваць стол да прыёму ежы, убіраць посуд пасля яды, выціраць сталы, падмятаць падлогу. Вучыць дзяжурных правільным прыёмам працы: чашку браць за ручку, хлебніцу несці дзвюма рукамі і г. д.

Заахвочваць дзяцей дапамагаць выхавальніку рыхтавацца да заняткаў, знаёміць з парадкам захоўвання матэрылаў і дапаможнікаў.

Вучыць засцілаць ложак, мыць насоўку.

Выклікаць у дзяцей жаданне прымаць пасільны ўдзел у працы дарослых на ўчастку: збіраць смецце, падмятаць веранду і г. д.

**Праца ў прыродзе**

### *I квартал*

Вучыць збіраць сухое апаўшае лісце, насенне кветак і раскладваць у пакеты; збіраць ураджай у агародзе, выносіць бацвінне.

Вучыць рабіць уборку ў кутку прыроды і даглядаць за яго насельнікамі: паліваць расліны, праціраць буйное лісце, мыць кармушкі, паілкі, паддоны, класці корм у кармушкі, насыпаць корм рыбам па мерцы, змяняць ваду ў акварыуме.

### *II квартал*

Вучыць працаваць разам з выхавальнікам, дапамагаць яму пасыпаць дарожкі пяском, чысціць дарожкі пляцоўкі ад снегу, які толькі што выпаў, змятаць снег з лавак, зграбаць яго да дрэў, абвязваць іх.

Разам з выхавальнікам рабіць снежную горку для лялек, снежную клумбу, ляпіць са снегу жывёл, снегавіка.



Заахвочваць дзяцей прымаць пасільны ўдзел у вырабе кармушкі для птушак, пасыпаць корм птушкам. Вучыць адчуваць важнасць і неабходнасць гэтай працы зімой.

Выхоўваць жаданне дапамагаць дарослым у падрыхтоўцы зямлі для расады, саджаць цыбулю ў скрынкі, сеяць насенне.

### *III квартал*

Разам з выхавальнікам назіраць, што стала з цыбулінамі ў скрынцы. Вучыць бачыць вынікі працы, разумець і выяўляць прычынныя залежнасці.

Заахвочваць дзяцей дапамагаць выхавальніку абразаць кусты на ўчастку, абкопваць дрэвы, кусты, саджаць кветкі, перакопваць агарод. Выхоўваць у дзяцей разуменне значнасці і неабходнасці таго, што яны робяць.

Вучыць дзяцей саджаць цыбулю, боб, гарох, фасолю; збіраць пер'е цыбулі і рабіць салату.

### *IV квартал*

Прывучаць дзяцей даглядаць кветкі, агарод, беражліва абыходзіцца з пасевамі і пасадкамі, паліваць расліны, кветкі, агародніну.

Прыцягваць дзяцей выносіць пустазелле, збіраць ураджай.

Знаёміць з прыладамі працы, вучыць абыходзіцца з імі (ачышчаць абсталяванне, прасушваць, складваць у вызначаным месцы).

**Ручная праца**

Пазнаёміць дзяцей з нажніцамі, навучыць карыстацца імі ў час працы, удакладніць веды аб папярэджанні траўматызму.

Вучыць прыёмам работы з паперай: складваць аркуш папалам па намечанай лініі, папалам без лініі па суаднясенню бакоў і ражкоў, згінаць на чатыры часткі па намечаных лініях і без іх.

Вучыць вырэзваць нажніцамі трохвугольнікі, квадраты, прамавугольнікі; рэзаць па прамых намечаных лініях палоскі для гірлянд.

Вучыць працаваць з паперай і клеем: склеіць гірлянду з гатовых палосак да свята ёлкі.

Разам з выхавальнікам рабіць разнастайныя сувеніры з прыроднага матэрыялу (лісце, шышкі, жалуды, каштаны, грыбы).

Пазнаёміць з прыёмам пляцення (дыван для лялек, хустачка), макрамэ і інш.

Вучыць рабіць з паперы лодачкі, самалёты, шапачкі, скрыначкі, закладкі для кніг.

## ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

Замацоўваць веды, уменні, навыкі і звычкі, якія дзеці атрымалі на другім годзе навучання.

**Самаабслугоўванне**

Замацоўваць і ўдасканальваць сфарміраваныя раней навыкі самаабслугоўвання, садзейнічаць іх пераўтварэнню ў станоўчыя звычкі.

Працягваць вучыць дзяцей правільна і акуратна паводзіць сябе за сталом: садзіцца за стол у ахайным выглядзе, карыстацца сталовымі прыборамі, сядзець роўна, не вельмі нахіляцца над талеркай, есці з закрытым ротам, не спяшаючыся, па меры неабходнасці карыстацца сурвэткай, пасля яды дзякаваць, паласкаць рот.

Прывучаць дзяцей самастойна апранацца і распранацца, зашпільваць гузікі, зашнуроўваць чаравікі, завязваць тасёмкі, правільна і акуратна складваць адзенне, ставіць на месца абутак, берагчы адзенне і абутак, чысціць іх, своечасова сушыць мокрыя рэчы.

Працягваць вучыць дзяцей захоўваць чысціню свайго цела; чысціць зубы раніцай і нанач, карыстацца індывідуальным ручніком, насоўкай, грабеньчыкам; засцілаць і рассцілаць свой ложак, правільна абыходзіцца з пасцельнымі рэчамі.

Вучыць дзяцей самастойна ўстараняць непарадак у сваім знешнім выглядзе, сачыць за чысцінёй адзення, тактычна падказваць таварышу аб непаладках у яго касцюме, абутку, дапамагаць устараняць іх.

**Гаспадарча-бытавая праца**

Развіваць і ўдасканальваць уменне дзяжурыць па сталовай. Вучыць дзяцей працаваць не толькі хутка, рацыянальна, але і дружна, умець дамовіцца і размеркаваць абавязкі паміж сабой. Выкарыстоўваць дзяжурства па сталовай як сродак выхавання ў дзяцей культуры адносін — уважлівасці, далікатнасці, ветлівасці, клапатлівасці. Узняць аўтарытэт дзяжурных, выхоўваючы ў дзяцей працавітасць, імкненне быць карысным у справах групы, разуменне карысці сваёй працы для іншых.



Увесці дзяжурствы на занятках (раскладаць дыдактычны матэрыял, пасля заняткаў прыбіраць, праціраць сталы) і ў кутках прыроды (паліваць расліны, выціраць пыл з буйных лісцяў, мыць кармушкі, паілкі, паддоны, класці корм у кармушкі, насыпаць корм рыбам па мерцы).

Працягваць вучыць дзяцей падтрымліваць парадак у гульнёвым кутку, групе (прыбіраць цацкі на месца, рабіць пасільны рамонт цацак, рамантаваць кнігі, падклейваць карцінкі, лато). Фарміраваць пачуццё задавальнення ад чысціні і парадку ў групавым пакоі.

Прыцягваць дзяцей да пасільнага ўдзелу ва ўборцы групавога пакоя (выціраць пыл з мэблі, падаконнікаў, падціраць падлогу пасля ўмывання, абмываць расліны, мыць цацкі, будаўнічы матэрыял, мыць і прасаваць лялечнае адзенне; затым пераапранаць лялек у чыстае адзенне).

Вучыць дзяцей своечасова мыць свае насоўкі, гольфы, шкарпэткі.

Прывучаць дзяцей дапамагаць дарослым раскладваць бялізну, развешваць ручнікі.

Растлумачваць, што гаспадарча-бытавая праца — гэта праца на карысць іншых, у тым ліку на патрэбу групы. Гэта праца ўключае захоўванне чысціні і навядзенне парадку ў рэчах, цацках, якімі карыстаюцца дзеці, падрыхтоўку да абеду, заняткаў.

**Праца ў прыродзе**

### *I квартал*

Працягваць развіваць навыкі работы на ўчастку дзіцячага сада: падтрымліваць чысціню і парадак на пляцоўцы; рыхліць і ўвільгатняць пясок у пясочніцы, збіраць і выносіць сухое апаўшае лісце і пустазелле.

Восенню ўдзельнічаць у зборы насення кветак, уборцы ўраджаю агародніны, падрыхтоўцы кветніка і агарода да зімы.

Паглыбляць веды аб папярэджанні траўматызму.

### *II квартал*

Зімой зграбаць снег да стваloў дрэў і кустоўя; расчышчаць дарожкі ад снегу. Падкормліваць птушак, якія прылятаюць да кармушкі.

### *III квартал*

Вясной перакопваць зямлю на агародзе і ў кветніку, рабіць грады, высаджваць расаду, сеяць насенне кветак і агародніны; паліваць пасевы, сачыць за ўсходамі.

Зрабіць на ўчастку "куток поля": пасеяць насенне жыта, пшаніцы, аўса або ячменю, даглядаць за ўсходамі, назіраць за ростам і развіццём хлебных злакаў. Такім чынам дзеці вучацца разумець, як складана вырасціць хлеб.

### *IV квартал*

Летам ажыццяўляць догляд агарода, "кутка прыроды" і кветніка: збіраць пустазелле, рыхліць зямлю, паліваць пасевы, падвязваць расліны.

У працэсе працоўнай дзейнасці працягваць вучыць дзяцей правільна карыстацца абсталяваннем і прыладамі працы, дапамагаць прыводзіць іх у парадак (ачышчаць, прасушваць, класці на месца і г. д.).

Выхоўваць уважлівыя адносіны да працы дарослых, да прадуктаў і рэчаў, якія яны вырабляюць.

Арганізаваць святы: "Дзень ураджаю", "Што нам восень прынесла" (паказаць дзецям вынік сумеснай працы дарослых і дзяцей).

**Ручная праца**

Працягваць фарміраваць навыкі ручной працы:

з паперай: выраб падставак, закладак, пляценне дыванкоў, кніжак, хустачак, сумачак, альбомаў, аўтобуса, хаткі, ёлачных цацак, каробачак, карабліка, хлапушкі, лодачкі, самалёта, матылька; знаёмства з такім прыёмам работы з паперай, як арыгамі;

з нажніцамі, клеем: выразанне і склейванне сурвэтак, сняжынак;

з іголкай і ніткай: знаёмства з прыёмамі карыстання імі; сшыванне кніжак з дзіцячых малюнкаў; рамонт кніжак; прышыванне гузікаў, вышыўка па разметцы швом "іголка ўперад"; шыццё мяшочка, навалачкі для лялькі, прышыванне вешалкі; вышыўка хустачкі; пашыў падушачкі для шпілек;

з прыродным матэрыялам: майстраванне цацак і разнастайных сувеніраў — пацеркі, грыбы з жалудоў, Чабурашка, Жучка з грэцкага арэха.

Выкарыстоўваць зробленыя дзецьмі вырабы ў якасці падарункаў, для ўпрыгожвання групы.

Асаблівую ўвагу звярнуць на рацыянальныя спосабы дзейнасці ў працэсе ручной працы.



# НАВУЧАННЕ ВЫЯЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І КАНСТРУЯВАННЮ

## ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

Ствараць у дашкольнікаў перадумовы да авалодання выяўленчай дзейнасцю; абуджаць інтарэс да працэсу выяўлення; фарміраваць уяўленне аб вобразатвору як адлюстраванню рэальнага прадмета.

Педагог у прысутнасці дзяцей робіць нескладаныя па зместу і графічнаму выкананню малюнкі знаёмых прадметаў, звязвае іх адзіным зместам і суправаджае расказам.

Для таго каб зацікавіць малышоў маляваннем, лепкай, аплікацыяй, канструяваннем, выхавальнік выкарыстоўвае гульнёвы прыём, паказвае цацкі, для якіх дзеці малююць падарункі, лепяць, вырабляюць знаёмыя прадметы для гульні.

Важна выхоўваць эстэтычныя пачуцці, у працэсе зносін з дзецьмі выдзяляць у прадметах быту і з'явах навакольнай рэчаіснасці прыгажосць (форма, фактура, колер). Трэба звяртаць увагу на змены, якія адбыліся з кветкамі, ягадамі, садавіной, агароднінай восенню, а зімой — на прыгажосць снежнага покрыва, заснежаных кустоў і дрэў: разам з дзецьмі любавацца прыгажосцю зімняй прыроды, звяртаючы ўвагу на прыгажосць снегу, што іскрыцца, сняжынак, што падаюць, выклікаць у дзяцей прыемныя ўспаміны пра навагодняе свята. Вясною знаёміць з назвамі кветак, любавацца формай, будовай, расфарбоўкай. Зацікавіць дзяцей разгляданнем веснавых кветак.

У час самастойнай выяўленчай дзейнасці дашкольнікі практыкуюцца ў размалёўванні нарысаваных прадметаў: шароў, яблыкаў, мячоў, флажкоў. Вялікі інтарэс у малышоў выклікаюць кніжкі-размалёўкі. Паступова ў дзяцей развіваецца фантазія, фарміруецца пачуццё колеру, рытму.

Забеспячэнне гульнёвай матывацыі і пастаноўка гульнёвай мэты з'яўляюцца неабходнымі ўмовамі паспяховасці навучання канструяванню. Канструяванне будзе цікава дзецям толькі тады, калі яно абумоўлена іх гульнёвымі патрэбнасцямі. У працэсе будаўніцтва заахвочваць дзяцей шукаць спосабы паляпшэння пабудовы (за кошт упрыгожання, падборкі будаўнічых дэталей па колеру). Педагог павінен дзейнічаць на вачах у дзяцей, паказваць захопленасць, жывасць, зацікаўленасць практычнай дзейнасцю, а пры дапамозе абыгрывання гатовых канструкцый выклікаць інтарэс да рэзультату работы.

Неабходна прывучаць дзяцей супрацоўнічаць у невялікіх групах (2—5 чалавек), стымуляваць камунікатыўную дзейнасць (дыялог).

Пазнаёміць дзяцей з асноўнымі прыладамі і сродкамі выяўленчай дзейнасці (глінай, пластылінам, паперай, алоўкамі, фламастэрамі, пэндзлем, фарбамі), з самымі пачатковымі правіламі дзеянняў з імі, з нетрадыцыйнымі спосабамі малявання (пальцамі і інш.).

Але асноўнай мэтай навучання дашкольнікаў выяўленчай дзейнасці з'яўляюцца не веды, уменні і навыкі, а змяненні ў якасці дзейнасці і паводзінах дзяцей. Калі дзіця праяўляе жаданне маляваць, ляпіць, будаваць, становіцца больш уседлівым, упэўненым, даводзіць пачатую справу да канца, — мэта дасягнута.

## *I квартал*

**Маляванне**

Выклікаць у дзяцей цікавасць да працэсу малявання ("Што за палачкі такія?").

Практыкаваць у нанясенні кропак (зярнят) ("Накармілі птушку").

Рытмам мазкоў маляваць лісце на дрэвах.

Праводзіць кароткія штрыхі і лініі ("Ідзе дождж"), прамыя лініі зверху ўніз, весці лініі перарывіста ("Каляровыя нітачкі", "Моцны плот").

Праводзіць замкнутыя лініі кругавымі рухамі, не адрываючы алоўка ад паперы ("Каляровыя клубочкі", "Мыльныя бурбалкі", "Рознакаляровыя колцы").

Праводзіць лініі злева направа, весці пэндзаль па ворсу неадрыўна ("Прыгожы паласаты дыван", "Рэльсы для цацачнай чыгункі").

Маляваць вертыкальныя лініі, чаргуючы іх па колеру ("Каляровыя стужачкі").

Маляваць прадметы круглай формы рознай велічыні ("Вялікія і малыя шарыкі").

У працэсе сумеснай дзейнасці рытмам мазкоў, дамалёўваючы, перадаваць вобразы дрэў ("Асенні лістапад").

Мазкамі ўпрыгожваць сілуэт неваляшкі.

Маляваць прамыя сцежкі да хаткі злева направа, не адрываючы пэндзаль ад паперы ("Сцяжынкі да хаткі зайчыка, лісы і інш.").

Прывучаць маляваць без задання, развіваць у дзяцей задумку.

**Аплікацыя**

Раскладваць гатовыя формы на аркушы паперы ("Мячыкі пакаціліся", "Пацеркі", "Агародніна", "Садавіна" і інш.).



Знаёміць дзяцей з прадметамі круглай формы, вучыць прыёмам наклейвання ("Пацеркі", "Яблыкі ляжаць на талерцы").

Раскладваць прадметы на карзінах ("Пакладзі грушы, яблыкі, агуркі, слівы ў карзіну").

Упрыгожваць кружочкамі (мячамі), чаргуючы па колеру, палоску паперы.

Наклейваць гатовыя формы (яблыкі, грушы, агуркі, слівы, моркву) на азначаныя часткі аркуша.

Раскладваць пялёсткі (кружочкі) вакол сярэдзіны ("Прыгожая кветка").

Рабіць узор на прадметах круглай формы ("Прыгожая талерка" і інш.).

**Лепка**

Развіваць цікавасць да працэсу лепкі і яе выніку, выклікаць жаданне штосьці зляпіць ("Што можна зляпіць?").

Вучыць адшчыпваць маленькія кавалкі пластыліну пальцамі, раскатваць паміж далонямі (ласунак для мішкі, зайчыка, лялек — пячэнне, цукеркі, шарыкі, арэшкі).

Ляпіць палачкі прыёмам раскатвання гліны, пластыліну прамымі рукамі ("Хлебная саломка", "Рознакаляровыя мялкі").

Скручваць палачкі ў кольцы ("Бублікі", "Абаранкі", "Кола", "Пірамідка").

Раскатваць камячкі пластыліну прамымі рукамі ("Бярвенне", "Хаткі для зайчыка, мішкі, пеўніка", "Вежа").

Расплюшчваць шар і падымаць краі ("Прыгожая талерачка").

Ляпіць плоскія і круглыя формы ("Талерка з яблыкамі", "Садавіна для цацак"), міскі рознага памеру ("Міскі для трох мядзведзяў", "Прыгожыя талеркі для цацак"), маленькую лялечку (з дзвюх частак акруглай формы).

Развіваць задумку ў дзяцей: што мы можам і любім ляпіць.

**Канструяванне**

Рытмічна размяшчаць цаглінкі доўгім вузкім бокам адна да адной з чаргаваннем колеру, замыкаючы прастору ("Агароджа").

Размяшчаць цаглінкі вертыкальна ("Вароты").

Будаваць дарожкі рознага колеру, вузкія і шырокія.

Будаваць вежы з 5—7 кубікаў, размяшчаючы дэталі ў вышыню; з 7 кубікаў з чаргаваннем іх па колеру ("Вежа са сцяжкамі").

Будаваць вежы рознай вышыні і колеру, упрыгожваць іх прызмамі адпаведнага колеру.

## *II квартал*

**Маляванне**

Маляваць прадметы, якія складаюцца з прамых ліній — вертыкальных, гарызантальных ("Плот у снезе").

Наносіць мазкі ў азначаных частках лістка ("На зямлі, на дрэвах снег", "На дрэвы, на лужок ціха падае сняжок").

Маляваць прадметы круглых формаў ("Снегавік"); з прамых, нахіленых ліній ("Дрэва", "Дрэва зімой").

Ствараць вобраз ёлачкі, "запальваць на яе галінках агеньчыкі" фарбамі.

Калектыўнае маляванне ("Лес зімой").

Развіваць сюжэтна-гульнёвую думку, вучыць ствараць мазкамі, рознымі па колеру, мішку, зайку, якія танцуюць на свяце ёлкі.

Рытмічнымі мазкамі размяшчаць сняжынкі ў азначаных месцах ліста "Снежная вуліца".

Праводзіць лініі рознай працягласці ("Лялька Маша катаецца на санках"); прамыя лініі ў розным напрамку ("Самалёты ляцяць").

Рытмічна наносіць кантрастныя па колеру мазкі ў межах контуру ("Агні ў вокнах хаты").

Наносіць яркія плямы, мазкі на сілуэты сарафанаў, сукенак, спадніц, шапак.

Развіваць у дзяцей задумку: "Што мы ўмеем і любім маляваць?"

**Аплікацыя**

Раскладваць на нітачцы рознакаляровыя кружочкі ("Яркія ліхтарыкі", "Пацеркі").

Раскладваць і наклейваць кружочкі рознага колеру ("Упрыгожым сукенку для лялькі", "Прыгожая сурвэтка").

Састаўляць узор на гарызантальнай палосцы паперы з чаргаваннем загатовак па велічыні ("Матрошкі — маці і дочкі", "Вялікія і маленькія ёлачкі").

Складваць пірамідку, пачынаючы з вялікай і заканчваючы маленькай ("Пабудуем пірамідку", "Вежка").

Адрозніваць геаметрычныя формы, састаўляць выразаныя дэталі ("Будка для сабачкі", "Снежная баба", "Мішка", "Неваляшка" і інш.).

**Лепка**

Працягваць ляпіць пачастункі (цукеркі-шарыкі, цукеркі-палачкі, арэшкі; "Прыходзьце ў госці, мішкі, зайчыкі, лялькі").



Ляпіць цацкам ласункі да навагодняга свята.

Ляпіць пірамідкі ў падарунак бацькам, сябрам.

Раскочваць камячкі кругавымі рухамі ("Злепім снежны камяк", "Вясёлы калабок").

Раскочваць камячкі кругавымі рухамі, злучаць іх ("Снегавік", "Вясёлыя неваляшкі").

Ляпіць кругавымі рухамі, сплескваць шарык (пячэнне, пернік).

Ляпіць прадметы, якія складаюцца з частак круглай формы, але рознай велічыні ("Мішка", "Неваляшка"); прадметы, якія складаюцца з некалькіх частак ("Зайчык", "Ліса").

Ляпіць па задумцы прадметы, якія падабаюцца дзецям (развіваць уяўленне і эстэтычныя перавагі).

**Канструяванне**

Рабіць з кубікаў і цаглінак мэблю (стол, стул, дыван, ложак, шафа).

Будаваць высокія і нізкія вароты каля плота; вароты і дарожку з кубікаў і цаглінак ("Мішка выязджае з варот і едзе па дарожцы"); вароты суразмерныя матрошцы.

Будаваць для свойскіх жывёл агароджу, цаглінкі чаргаваць па колеру.

## *III квартал*

**Маляванне**

Перадаваць капеж рытмічнымі мазкамі ("Вясна прыйшла").

Перадаваць вобраз сонейка, спалучыўшы круглую форму з прамымі лініямі ("Глядзіць сонейка ў акенца").

Маляваць лапату з дзвюх частак — чатырохвугольная форма і прамая палачка.

Маляваць прадметы з некалькіх частак: круглай, прамавугольнай, трохвугольнай формы ("Прыгожая каляска", "Хата" і інш.).

Перадаваць круглую, квадратную і прамавугольную формы, засвоіць прыём зафарбоўвання ("Рознакаляровыя кубікі", "Мячыкі рассыпаліся", "Апельсіны", рознакаляровыя хустачкі, "Прыгожая сурвэтка ў падарунак мамулі").

Перадаваць у малюнку форму кветак, маляваць фарбамі ("Адуванчыкі ў траве").

Развіваць уменне ствараць фігуркі куранят: "Кураняты гуляюць у траве".

Працягваць вучыць наносіць мазкі на сілуэты сукенак, хустачак, шалікаў, світэраў.

Рытмам мазкоў малява ць лісце на дрэвах.
Калектыўнае маляванне ("Лес вясной").
Маляваць без задання, развіваць у дзяцей задумку, уяўленне.

**Аплікацыя**

Састаўляць відарысы з асобных частак (круг, квадрат, трохвугольнік): "Дом", "Прыгожая кветка", "Шпакоўня".
Састаўляць узоры з геаметрычных формаў ("Сурвэтка", "Прыгожая хусцінка").
Раскладаць і наклейваць гатовыя часткі ("Каляска з грузам").
Наклейваць палоскі, чаргуючы іх па колеру ("Паласаты дыванок", "Паласатая хусцінка").

**Лепка**

Працягваць ляпіць пачастункі для лялек, зайкаў, мішак (цукеркі-шарыкі, цукеркі-палачкі, арэшкі, пернікі, вітаміны).
Ляпіць прадметы з дзвюх частак (шарыка і палачкі), злучаць часткі ("Бразгалка").
Практыкаваць у лепцы знаёмых формаў ("Матулі спяку пернічак").
Раскатваць пластылін паміж далонямі, расплюшчваць шар, збіраць (злучаць) прадметы з некалькіх частак ("Пірамідка").
Ствараць вобраз лялькі, неваляшкі, ляпіць прадметы з дзвюх частак круглай формы, але рознай велічыні ("Маленькая лялечка", "Мы вясёлыя неваляшкі").

**Канструяванне**

Будаваць дамы простай канструкцыі ("Дом для маёй лялькі", "Дом для матрошкі").
Рабіць пабудовы з перакрыццямі ("Домік для жывёл", "Гараж для машын", "Церамок для матрошак").
Будаваць гараж для машын, ствараць пабудовы з улікам памеру цацак.
Будаваць мост цераз раку. Ведаць назначэнне маста. Выкарыстоўваць у гульні.

### *IV квартал*

У маляванні, лепцы, аплікацыі перадаваць летні дождж, вясёлку, кветкі, ягады, грыбы. З прыроднага матэрыялу ствараць розныя вырабы. Маляваць палачкай, мелам на асфальце. Ляпіць агародніну, садавіну.



## ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

Педагог развівае ініцыятыву дзяцей, удасканальвае набытыя тэхнічныя навыкі, працягвае фарміраваць рацыянальныя спосабы дзеяння.

Асноўнымі ўмовамі навучання маляванню, лепцы, аплікацыі і канструяванню застаюцца забеспячэнне гульнёвай матывацыі дзіцячай дзейнасці, выкарыстанне прадуктаў дзейнасці ў рэальнай гульні, выраб малюнкаў, аплікацый з канкрэтнай, зразумелай дзецям мэтай.

Неабходна фарміраваць у дзяцей упэўненасць у сабе і сваіх магчымасцях пры стварэнні малюнкаў простых прадметаў даступнымі ім сродкамі выразнасці. Адзначаць і падтрымліваць усе поспехі дзяцей, а ў выпадку цяжкасці дапамагаць ім дабіцца рэзультату.

Важна развіваць у дзяцей здольнасць успрымаць не толькі форму, колер, будову прадметаў, але і прыгажосць навакольнай рэчаіснасці: вучыцца любавацца пяшчотнай зеленню раслін, радавацца прыгажосці кветак, разнастайнасці колераў і адценняў у асеннім убранні дрэў і г. д.

Выяўленчыя магчымасці дашкольніка абмежаваны і звязаны з развіццём маторыкі, руху рук. Карысна праводзіць спецыяльныя практыкаванні, заснаваныя на маляванні самых простых прадметаў (стужачкі, хусцінкі, абаранкі, мячыкі, кубікі і інш.).

Неабходна мэтанакіравана фарміраваць у дзяцей эстэтычныя адносіны да прыроды, прыгожых прадметаў і матэрыялаў, твораў выяўленчага мастацтва.

Дзяцей трэба вучыць не тэхніцы дарослых, а новаму бачанню, новаму пластычнаму разуменню прасторы, развіваць у іх ініцыятыву, уяўленне з улікам іх узроставых асаблівасцей.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца рабоце з колерам. У групе неабходна стварыць умовы для самастойных заняткаў маляваннем з выкарыстаннем палітры і схіляць дзяцей да эксперыментавання з колерам.

Важна фарміраваць інтарэс да колеру (вылучаць колеры і адценні ў навакольнай рэчаіснасці, праводзіць дыдактычныя гульні і практыкаванні).

Задача навучання канструяванню заключаецца ў тым, каб напомніць аб канструктыўных магчымасцях будаўнічага матэрыялу, умацаваць інтарэс да гульняў з ім. На другім годзе навучання на занятках па канструяванню ўводзіцца выкананне дзецьмі пабудоў па плоскаснаму ўзору — малюн-

ку і аплікацыі. Неабходна фарміраваць уменне аналізаваць плоскасны ўзор: вылучаць у ім часткі, бачыць і перадаваць у канструкцыі размяшчэнне гэтых частак адносна адна адной, называць элементы канструктара і тут жа на словах адзначаць іх ролю ў прадмеце, падтрымліваць гульнёвыя тэндэнцыі канструявання ў дзяцей. На канструяванні дзеці вучацца выконваць такія пабудовы, якія затым ствараюць з мэтай разгортвання розных сюжэтна-ролевых гульняў.

Працягваць вучыць дзяцей уменню разглядаць прадметы і вобразы, аналізаваць гатовыя пабудовы, вылучаць у розных канструкцыях істотныя прызнакі; выхоўваць уменне праяўляць творчасць і вынаходлівасць у рабоце; вучыць планаваць этапы стварэння пабудовы. Вучыць уменню калектыўна выконваць заданні.

## *I квартал*

**Маляванне**

Развіваць задумку адлюстроўваць у малюнку атрыманыя ўражанні: "Малюем карцінку пра лета" і інш.

Маляваць плоцік вакол зайкавай хаткі, траву, кветкі, якія растуць каля плоціка.

Маляваць клумбы з прыгожымі кветкамі.

Маляваць фарбамі і алоўкамі прадметы рознай формы: агурок і тамат, морква і яблык, лімон і яблык і інш.

Перадаваць у малюнку асноўную будову дрэў ("Дрэвы восенню", "Казачнае дрэва", "Залатая восень").

Маляваць розныя па форме і будове дрэвы ("Асенні лес", "На яблыні паспелі яблыкі", "Восень, лісце з дрэў злятае").

Перадаваць у малюнку назіранні ў прыродзе ("Дуе моцны вецер", "Лістапад").

Маляваць прадметы розных форм (дамалёўваць калёсы ў машын, вокны, дрэвы каля дамоў і інш.).

Састаўляць узор на палосцы, у квадраце, крузе ("Упрыгожым сурвэтку", "Сарафан для матрошкі", "Упрыгожым фартух").

Маляваць чалавека, асобныя дэталі адзення.

Вучыць маляваць без задання, развіваючы ў дзяцей задумку.

**Аплікацыя**

Рэзаць шырокую палоску паперы, правільна трымаць нажніцы, правільна імі карыстацца.

Замацоўваць прыёмы акуратнага карыстання паперай. клеем ("Вялікі дом").



Выразаць з паперы прадметы рознай формы і наклейваць іх ("Садавіна", "Агародніна", "Грыбы" і інш.).

Выразаць па ўзору і рабіць узор на квадраце, крузе, паласе ("Закладка ў кнігу", "Прыгожая талерка", "Прыгожая хустачка", "Упрыгож сурвэтку").

Выразаць з паперы рознакаляровыя кубікі і наклейваць іх.

Выразаць рознакаляровыя кружкі, раскладваць, наклейваць ("Упрыгожым суkенку, світэр, шапку, шарф, рукавічкі, фартушкі").

**Лепка**

Ляпіць прадметы рознай формы і велічыні (ягады, садавіна, агародніна, грыбы) пасля ўспрымання.

Ляпіць па памяці ("Карзіна агародніны для зайчыкаў", "Садавіна для нашых цацак", "Лімоны для лялек").

Перадаваць у лепцы фігуру чалавека ("Дзяўчынка ў паліто").

Ляпіць фігуру чалавека, перадаючы суадносіны частак ("Карагод"). Аб'ядноўваць сваю работу з работамі іншых дзяцей.

Ляпіць прадметы частавання для гульні з цацкамі ("Абаранкі для лялек").

Ляпіць непасрэдна пасля ўспрымання групу прадметаў ("Вялікая качка з качанятамі").

Самастойная лепка без вызначэння задання.

**Канструяванне**

Будаваць вежы з кубікаў, цаглінак.

Рабіць мэблю для лялек (стол, стул, ложак, канапа, шафа).

Па спрошчаным чарцяжы будаваць горкі, лесвіцы, вежы.

Будаваць аднапавярховы домік для лялькі (рабіць фундамент, перакрыцце).

Будаваць двухпавярховы домік для матрошак (вялікія пабудовы з перакрыццямі).

Будаваць вароты з аркай па малюнку (суадносіць плоскаснае адлюстраванне дэталей на малюнку з аб'ёмнымі формамі).

Будаваць розныя па форме дамы (1, 2 паверхі).

Будаваць мост па ўзору з аб'ёмных фігур. Пазнаёміць дзяцей з назвамі элементаў канструктара.

Вучыць складаць цэлую карцінку з яе частак (агародніна, садавіна, адзенне, абутак, мэбля).

### *II квартал*

**Маляванне**

Малявацъ дрэвы, кусты, якія растуць на ўчастку дзіцячай установы ("Дрэвы на ўчастку", "Наш участак зімой").

Прыдумваць тэму для малявання розных дрэў, зімовага лесу.

Малявацъ свята ёлкі ("Навагодняя ёлка", "Маленькай ёлачцы холадна зімой", "Наша навагодняе свята", віншавальныя навагоднія паштоўкі, "Дзяўчынка скача").

Перадаваць у малюнках вобраз Снягурачкі: "Снягурка з лесу да нас прыйшла", "Снягурка танцуе".

Маляваць па жаданню зіму ("Снег, снег кружыцца, белая ўся вуліца", "Снегапад").

Маляваць прадметы, якія маюць акруглую і вуглаватую форму (каляска, аўтобус і інш.).

Перадаваць форму, велічыню транспартных сродкаў (самалёт, машына).

Перадаваць у малюнку своеасаблівасць каляровага каларыту (роспіс посуду па матывах гжэльскага і інш.).

Упрыгожваць узорам сурвэткі, выкарыстоўваючы элементы дымкаўскага роспісу.

Вучыць надаваць вобразу пэўны настрой: "Мішка вясёлы, мішка сумны", "Зайка смяецца, зайка плача".

Маляваць птушак, перадаючы форму цела, прыгожае апярэнне.

**Аплікацыя**

Выразаць, раскладваць і наклейваць кружкі ў вызначаным парадку ("Пацеркі для лялькі", "Гірлянда на ёлку").

Выразаць, састаўляць і адрозніваць геаметрычныя формы, наклейваць дэталі ("Снежная баба").

Выразаць, састаўляць відарыс з частак (каляска з цацкамі: шарыкамі, цаглінкамі і інш.).

Выразаць навагоднія ёлачныя цацкі з паперы.

Аздабляць сурвэткі, настольнікі, абрусы.

Калектыўная аплікацыя "Зіма".

**Лепка**

Практыкаваць у прыёмах раскочвання, сплюшчвання, уціскання, ураўноўвання (посуд для лялек: міскі, сальніца, шклянкі, кубкі).

Ляпіць прадметы, аднолькавыя па форме, але розныя па велічыні ("Посуд для трох мядзведзікаў").

Калектыўная лепка чайнага сервіза для лялек.



Ляпіць жывёл па жаданню ("Мышка бегла, хвосцікам махнула...", "Якія звяры былі на свяце ёлкі?").

Ляпіць фігуру чалавека ў зімовым адзенні ("Дзяўчынка ў футры", "Лыжнікі").

Вучыць дзяцей перадаваць у лепцы сюжэт свята ("Снягурачка").

Перадаваць у лепцы вобраз птушкі, яе позу ("Птушка", "Птушкі клююць зярняткі", "Птушкі клююць зярняткі са сподачка").

Ляпіць з цэлага куска фігуру каня прыёмам адцягвання.

Самастойная лепка без азначанага задання (па задумцы).

**Канструяванне**

Будаваць двухпавярховы дом з аднапавярховага; двухпавярховы дом ("Дзіцячы садок", "Дом для вялікай і маленькай лялек", "Дом для зайца і яго сяброў").

Будаваць пешаходны мост цераз раку.

Будаваць гараж для машыны, улічваючы яе памеры.

Будаваць транспартныя сродкі (самалёт, трамвай, машыны — па ўзору выхавальніка, без паказу ўзору).

Будаваць вароты з аркай, горкі па малюнку (вучыць аналізаваць малюнак, адбіраць патрэбны матэрыял).

Будаваць катэр па малюнку з яго папярэднім аналізам.

Складаць цэлае з частак (жывёлы, птушкі, посуд, транспарт).

Работа са зборна-разборнымі цацкамі ("Адрамантуем мішку, неваляшку", авалодаць уменнем збіраць часткі ў цэлае).

Замацоўваць уменне канструяваць па графічнаму ўзору розныя аб'екты агульнага функцыянальнага прызначэння (па два тыпы: вароты, магазіны, жылыя дамы).

### *III квартал*

**Маляванне**

Адлюстроўваць у малюнках змены, якія адбываюцца ў прыродзе ("Вясна прыйшла", "Галінка з пупышкамі", "Галінка квітнеючай яблыні", "Жоўтыя адуванчыкі", "Расцвілі прыгожыя кветкі").

Заахвочваць да малявання на тэму "Дом, у якім я жыву".

Серыя заняткаў па маляванню будынкаў рознага прызначэння ("Жылы дом", "Драўляны дом", "Дзіцячы сад", "Магазін").

Знаёміць з роспісам дымкаўскіх цацак (барыня, конік).

Выкарыстоўваць у маляванні элементы дымкаўскага роспісу: "Чаму матрошка сумная?" (упрыгож спадніцу, сарафан,

хустачку кругамі, кольцамі, кропкамі, аваламі, лініямі, мазкамі).

Дэкаратыўнае маляванне ("Упрыгож сукенку лялькі" — палоскі, кропкі, кругі).

Маляваць з натуры розныя цацкі.

Перадаваць форму, размяшчэнне частак фігуры чалавека, іх адносную велічыню ("Мая любімая лялька").

Маляваць розныя дрэвы (бяроза стройная, дуб магутны, сасна вялікая).

Развіваць у дзяцей задумку (маляванне без задання).

**Аплікацыя**

Выразаць геаметрычныя формы і рабіць узор для дывана.

Дэкаратыўная аплікацыя на квадраце.

Адлюстроўваць у аплікацыі прыродныя матывы ("Спляцём вяночак", "Кветкі на лузе").

Выразаць, складаць і наклейваць розных па колеру, форме і велічыні птушак ("Прыляцелі птушкі", "Вераб'і на дрэве").

Працягваць выразаць, састаўляць і наклейваць узоры для ўпрыгожвання сукенак, сарафанаў, світэраў і іншай вопраткі.

Развіваць задумку ў дзяцей: выражы і наклей тое, што бывае круглае і авальнае.

Замацоўваць навыкі калектыўнай дзейнасці пры вырабе аплікацый: "Мы — будаўнікі", "Чароўны сад — чароўныя дрэвы, кветкі".

**Лепка**

"Мае любімыя цацкі" (ляпіць з натуры).

Выклікаць цікавасць да народнай цацкі (дымкаўская птушка і інш.).

Ляпіць сюжэты знаёмых казак ("Сустрэча зайца з калабком", "Тры мядзведзі" і інш.).

Калектыўная лепка "Кураняты гуляюць, шукаюць чарвячкоў, клююць зярняты".

Заахвочваць да самастойнай лепкі без азначанага задання.

Ляпіць фігуру чалавека ў руху.

Ляпіць баранчыка на ўзор філімонаўскай цацкі (птушкі, жывёлы). Выдзяляць асаблівасці гэтых цацак.

**Канструяванне**

Будаваць тэатр па аб'ёмнаму ўзору.

Ствараць будынкі рознага прызначэння (магазіны, аптэка, дзіцячы сад).



Заахвочваць да стварэння калектыўнай пабудовы "Вуліца горада" (практыкаваць у стварэнні знаёмых будынкаў па памяці).

Вучыць чытаць малюнак, замалёўваць яго (дом з брускоў з замалёўкай).

Удасканальваць канструяванне па задумцы (самастойна выбіраць тэму пабудовы).

Складаць цэлы сюжэтны вобраз пораў года з разразных карцінак (з разрэзамі рознай канфігурацыі).

Будаваць гаражы для вялікіх і малых машын, падбіраючы дэталі для пабудовы патрэбнага памеру.

Складаць сюжэт з частак карцінак па знаёмых казках.

Канструяванне па выбранай тэме (дом, машына, самалёт, гараж, мэбля, катэр і інш.).

### *IV квартал*

На занятках па маляванню, лепцы, аплікацыі перадаваць уражанні аб леце.

З прыродных матэрыялаў майстраваць вырабы для падарункаў і ўпрыгожвання памяшканняў.

Канструяванне зборна-разборных цацак (будаўнічыя канструктары з рознай велічынёй элементаў)

## ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

На трэцім годзе навучання выяўленчая дзейнасць становіцца больш змястоўнай, носіць творчы характар. Дзякуючы ўзроставым выяўленчым уменням, нагляднасці пашыраецца тэматыка дзіцячых малюнкаў. Педагогі падводзяць дзяцей да адлюстравання звязнага зместу, да сюжэтных малявання і лепкі.

Работа па развіццю эстэтычнага ўспрымання дзяцей ажыццяўляецца не толькі пры навучанні выяўленчай дзейнасці на занятках, але і ў паўсядзённым жыцці, у час прагулак. Заахвочваць дашкольнікаў разглядаць творы народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Мэтанакіравана фарміраваць у іх эстэтычныя адносіны да прыроды, прыгожых прадметаў і матэрыялаў, твораў выяўленчага мастацтва.

Дзяцей неабходна вучыць новаму бачанню, разуменню прасторы з улікам узроставых асаблівасцей.

Працягваць працаваць над развіццём выяўленчых магчымасцей: заахвочваць да эксперыментавання з колерам; выяўленчымі спосабамі і прыёмамі; вучыць змешваць фарбы

для атрымання новых колераў і адценняў і інш. Пры гэтым неабходна вывучаць індывідуальны інтарэс, магчымасці дзяцей і развіваць здольнасць да выяўленчай творчасці.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць фарміраванню ў дзяцей інтарэсу да колеру, жадання дзейнічаць з мноствам колераў і адценняў.

Асноўнай мэтай заняткаў па канструяванню з'яўляецца замацаванне атрыманых навыкаў, развіццё памяці, творчай ініцыятывы і самастойнасці ў дзяцей.

Неабходна фарміраваць інтарэс да набыцця ведаў і ўменняў, разуменне таго, што для поспеху ў канструктыўнай дзейнасці важна дакладнае ўяўленне аб прадмеце, яго будове, прасторавым становішчы, устойлівыя звычкі канструявання, уяўленне аб паслядоўнасці дзеянняў па вырабу канструкцый.

Дзеці павінны ўмець планаваць дзейнасць: уявіць, якой будзе канструкцыя ў яе агульных рысах, абдумаць, які матэрыял спатрэбіцца, растлумачыць гэта ў вусным расказе.

Працягваць выхоўваць у дзяцей уменне працаваць калектыўна.

Мэтазгодна ўключаць у працэс навучання новыя віды работы: састаўленне графічных мадэлей па гатовых аб'ёмных канструкцыях (замалёўка пабудоў), мадэляванне прасторавых адносін прадметаў па прасцейшай схеме-плану, канструяванне па ўмовах (работа па індывідуальных узорах; выкананне заданняў па слоўнай інструкцыі).

Аналіз работ павінен ажыццяўляцца згодна з узроставымі магчымасцямі дашкольнікаў па лініі выразнасці малюнка, лепкі, канструявання. Аналіз неабходны для канстатацыі зыходнага ўзроўню развіцця дзяцей (праводзіцца пакавртальна):

здольнасць маляваць, ляпіць, канструяваць па задумцы;

уменне перадаць асабістыя адносіны да аб'екта адлюстравання;

уменне падпарадкаваць сродкі, спосабы адлюстравання сваёй задумцы, пастаўленай выяўленчай задачы;

адсутнасць ці наяўнасць выяўленчых штампаў.

Важным паказчыкам эфектыўнасці праведзенай работы з'яўляюцца не веды, уменні і навыкі, а змены ў якасці дзейнасці і паводзінах дзяцей. Калі няўпэўненае ў сабе і замкнутае або непаседлівае і абыякавае дзіця становіцца вясёлым і ініцыятыўным, з задавальненнем малюе і лепіць, даводзіць пачатую работу да канца і выражае жаданне прадэманстраваць яе іншым людзям, мэта дасягнута.



### *I квартал*

**Маляванне**

Адлюстроўваць у малюнку атрыманыя ўражанні ("Малюем карцінку пра лета...").

Маляваць прадметы рознай формы, перадаваць іх індывідуальныя асаблівасці (агурок, памідор, морква, яблыкі і інш.).

Калектыўнае маляванне ("Машыны возяць ураджай агародніны").

Маляваць кветкі (астры — вакол круга прыёмам прымацавання пялёсткаў і інш.).

Састаўляць узор на палосцы паперы, на крузе, квадраце, упрыгожваць сілуэт адзення, чаргуючы мазкі, кропкі, лініі.

Маляваць розныя дрэвы ("Яблыня з яблыкамі", "Асенні сад, парк, лес", "Радасная восень", "Залатая восень", "Асенняя карцінка", "У нашым садзе лістапад").

Перадаваць у малюнках разнастайнасць гарадскіх дамоў ("У горадзе пабудаваны розныя дамы" і інш.).

Маляваць чалавека, перадаваць характэрныя рысы ("Мой сябар").

Маляваць Чабурашку (ствараць казачны вобраз, перадаваць форму цела, галавы і іншыя характэрныя асаблівасці).

Маляваць фігуру чалавека ў руху ("Дзеці займаюцца фізкультурай").

Маляваць дзяўчынку ў прыгожай сукенцы (маляваць фігуру чалавека, перадаваць форму сукенкі, форму і размяшчэнне частак).

Увасабляць казачны вобраз у малюнку (эпізоды знаёмых казак).

Змалёўваць з цацак дзікіх жывёл, перадаючы характэрныя рысы.

Развіваць задумку ў дзяцей ("Што ты больш за ўсё любіш маляваць?").

Знаёміць з элементамі беларускага арнаменту, вучыць складаць з іх узоры, карыстаючыся фарбамі рознага колеру, правільна размяшчаць узор на сукенцы, сарочцы, спадніцы ("Упрыгожым Яніне спадніцу і сукенку").

**Аплікацыя**

Выразаць, раскладаць, наклейваць садавіну, агародніну, ягады, грыбы ў карзіне, на талерцы, блюдзе.

Замацоўваць уменне выразаць прадметы і іх часткі круглай і авальнай формы, практыкаваць у закругленні вуглоў у прамавугольніку, трохвугольніку (маленькія і вялікія грыбы па частках).

Знаёміць з элементамі беларускага арнаменту, вучыць складаць з іх узор, правільна размяшчаць узор на сукенцы, сарочцы, спадніцы ("Упрыгожым спадніцу і сукенку Каці").

Выразаць прадметы круглай формы, раскладаць і наклейваць іх, чаргуючы па колеру і велічыні ("Пацеркі").

Вырэзваць часткі круглай і авальнай формы — кветкі, ягады, лісце ("Асенні дыван").

Упрыгожваць сілуэты сукенак, фартушкоў, спадніц элементамі беларускага геаметрычнага арнаменту (палоскі, трохвугольнікі, квадраты).

Ствараць відарысы частак, правільна перадаваць іх велічыню; выразаць часткі круглай і авальнай формы ("Наш любімы мішка").

Развіваць уяўленне, вызначаць змест сваёй работы ("Выражы і наклей тое, што хочаш".

**Лепка**

Ляпіць з натуры садавіну, агародніну, ягады, грыбы для гульні ў магазін.

Па памяці ляпіць садавіну, агародніну для цацак.

Па ўяўленню ляпіць птушак, перадаючы форму, прапорцыі, дэталі, палажэнне (клюе зярняты, падняла крылы, п'е ваду, сядзіць).

Перадаваць форму цела, гарызантальнае і вертыкальнае становішча.

Перадаваць у лепцы казачныя вобразы. Ляпіць дзікіх жывёл, прыдаючы фігурам living становішча ("Мышка", "Зайка", "Кацянё і мышанё", "Двое прагных мядзведзікаў", "Лісічка-сястрычка").

Заахвочваць да ўпрыгожвання вылепленых вырабаў (рабіць пальцамі, стэкай, палачкамі ямкі).

Ляпіць фігуру чалавека, паказваючы прапорцыі частак цела і галавы; абыгрываць цацку ("Любімая лялька" і інш.).

**Канструяванне**

Будаваць аднапавярховы домік для лялькі (па ўзору, з пачатковым аналізам гатовай пабудовы).

Будаваць дом з садам для матрошак (ведаць дэталі — прызма, куб, пласціна, цаглінка).

Будаваць па ўяўленню вуліцу горада, размяшчаючы дамы роўнымі радамі па абодвух баках вуліцы.

Будаваць для матрошак адна- і двухпавярховыя дамы рознай канструкцыі, але з аднолькавага матэрыялу.

Будаваць вароты з аркай па малюнку (ведаць дэталі — арка, куб, пласціна; суадносіць часткі дэталей).



Будаваць для матрошак двухпавярховы дом з адным пад'ездам па перайманню (адбіраць самастойна будаўнічы матэрыял; ведаць будаўнічыя дэталі — куб, цаглінка, пласціна, брусок, прызма).

Будаваць горкі-лесвічкі па ўзору (малюнак аб'ёмны, суадносіць рэальныя дэталі з дэталямі на малюнку).

Складаць з частак цэлае (агародніна, садавіна, птушкі, жывёла, адзенне, абутак).

Удасканальваць канструяванне зборна-разборных цацак.

## *II квартал*

**Маляванне**

Маляваць дрэвы, на галінах — пушысты снег, вакол дрэў — гурбы ("Дрэва зімой", "Дрэва ў інеі", "Заснежаны сад").

Перадаваць у малюнку карціну зімняга горада, уменне маляваць розныя дамы і дрэвы ("Зіма ў горадзе", "Наш участак зімой").

Маляваць з натуры галінку елкі (хваёвыя лапкі), перадаючы будову, форму і колер галінкі.

Перадаваць у малюнку размяшчэнне бліжэйшых і далёкіх дрэў ("Вялікія і маленькія елкі").

У цэнтры аркуша маляваць вялікую ёлку, каля яе Дзеда Мароза, Снягурку ("Свята ёлкі"; калектыўнае маляванне "Упрыгожым ёлачку").

Перадаваць у малюнках вобразы дзяцей, якія скачуць, форму і адносную іх велічыню, змяненне фігур у руху ("Дзеці скачуць", "Дзеці гуляюць на ўчастку").

На разетцы ствараць вобраз сняжынкі па свайму жаданню.

Прыдумваць сюжэт, перадаваць у малюнку птушак, жывёл ("Сабачка", "Мішка", "Заяц", "Ліса", "Снягір", "Нарысуй сваіх любімых жывёл").

Увасабляць казачны вобраз у малюнках ("Хатка на курыных ножках", "Хатка траіх парсюкоў", "Хатка лубяная і ледзяная").

Перадаваць сродкамі мастацкай дзейнасці свае адносіны да прыроды, зімовых забаў ("Што нам падабаецца зімой", "Дзеці гуляюць на ўчастку").

Маляваць прадметы, якія складаюцца з некалькіх частак прамавугольнай і круглай формы (грузавая машына, каляска, аўтобус).

Маляваць транспарт па ўяўленню, пасля разглядвання яго відарысаў на карцінах, у час экскурсій ("Машыны на нашай вуліцы").

Малявацць узор на крузе, запаўняючы сярэдзіну і краі (талерка).
Малявацць вазы рознай формы, распісваць посуд.
Дэкаратыўнае маляванне (размалёўка посуду для лялек).

**Аплікацыя**
Выразаць з паперы рознай формы вазы, збаны, упрыгожваць элементамі беларускага арнаменту.
Састаўляць дэкаратыўную кампазіцыю на крузе ("Упрыгож сподачак").
Перадаваць форму і размяшчэнне частак машын ("Грузавая машына", "Аўтобус", "Тралейбус", "Машыны едуць па вуліцы").
Выразаць і наклейваць тулава, галаву, хвост птушак, жывёл ("Птушкі на галінках, на кармушцы", "Жывёлы на свяце ёлкі").
Складаць паперу ў чатыры разы, карыстацца нажніцамі, праяўляць творчасць і індывідуальнасць пры вырэзванні ўзораў ("Навагодняя паштоўка").
Ствараць дэкаратыўныя кампазіцыі па ўласнай задумцы.
Заахвочваць да вырабу калектыўнай аплікацыі "Дамы на нашай вуліцы" (перадаваць вобраз гарадской вуліцы).

**Лепка**
Перадаваць форму пры лепцы посуду ("Талерка", "Блюда", "Чайны посуд").
Ствараць відарысы па матывах дымкаўскіх цацак ("Аленьчык").
Ляпіць свойскіх і дзікіх жывёл, птушак, перадаючы форму, велічыню тулава, галавы, рух (кацянё, зайчык, шчаня, сабака са шчанём, лісіца, птушкі на кармушцы).
Ляпіць фігуру чалавека, перадаючы форму галавы, тулава, рук, ног і прапарцыянальныя суадносіны частак, дробныя дэталі адзення, рух ("Дзяўчынка ў футры", "Дзед Мароз", "Снягурка", "Наша лялька", "Дзеці скачуць").
Выбіраць эпізод са знаёмых казак і перадаваць яго ў лепцы.
Заахвочваць да калектыўнай лепкі "Двор птушак".

**Канструяванне**
Рабіць мэблю для лялек па ўзору, малюнку, уяўленню.
Будаваць транспартныя сродкі (грузавая машына, параход, трамвай, самалёт) па ўзору, малюнку, уяўленню.
Будаваць знаёмыя аб'екты па памяці.
Будаваць аднапавярховыя дамы для вялікіх, малых лялек па ўзору, малюнку, уяўленню.



Канструяваць будынкі рознага прызначэння ("Тэатр", "Казачны домік").
Заахвочваць да калектыўная работы ("Чыгуначны вакзал").
Будаваць ферму для свойскіх жывёл па ўзору, слоўнаму ўказанню.
Па гатовай аб'ёмнай канструкцыі (горка-лесвіца) замалёўваць пабудовы.
Складаць цэлы сюжэт па знаёмых казках з частак карцінак.
Канструяванне зборна-разборных цацак.

### *III квартал*

**Маляванне**
Малявацць дамы (жылы дом, дзіцячы сад, цырк, магазін, тэатр, кінатэатр).
Сюжэтнае маляванне ("Будаўнікі будуюць новы дом", "Горад вечарам", "Дамы на нашай вуліцы").
Малявацць хатнія расліны, перадаючы форму вазона, велічыню расліны, яе колер.
Перадаваць у малюнках, змешваючы фарбы, характэрныя асаблівасці ранняй вясны ("Вясеннія галінкі", "Прыйшла вясна, прыляцелі птушкі", "Ранняя вясна", "Галінка вярбы", "Квітнеючы сад", "Квітнеючыя галінкі чаромхі і бэзу", "Галінка таполі", "Вясенні дождж", "Узор з вясенніх кветак", "Лес", "Цюльпаны", "Букет нарцысаў", "Цвітуць сады", "Прыгожыя кветкі").
Малявацць эпізоды знаёмых казак.
Перадаваць у малюнку паставы фігур дзяцей у час працы, гульні ("Мы прыбіраем участак", "Нам весела", "Дзеці робяць зарадку").
Заахвочваць да дэкаратыўнага малявання па матывах гарадзецкага роспісу.
Выхоўваць у дзяцей цікавасць і павагу да нацыянальных традыцый ("Лялька ў нацыянальным адзенні").
Малявацць рыбак, перадаючы іх форму, хвост і плаўнікі ("Прыгожыя рыбкі").
Дэкаратыўнае маляванне кампазіцыі з кветкамі і птушкамі (вучыць рашаць кампазіцыю ў пэўнай колеравай гаме).
Прыдумваць паслядоўнасць выканання малюнка ("Фарбы вясёлкі").

**Аплікацыя**
Выразаць вазы рознай формы, упрыгожваць іх ("Вазы прыгожыя", "Галінка ў вазе", "Цюльпаны ў вазе").

Выразаць, раскладаць і наклейваць на аркушы паперы цюльпаны і іншыя кветкі.

Заахвочваць да вырабу калектыўнай аплікацыі "Вясенні дыван".

Складваць і наклейваць відарысы птушак, рыб.

Дэкаратыўная кампазіцыя з кветкамі і птушкамі.

Калектыўная аплікацыя "Нашы сябры" (выразаць асноўныя часткі фігурак птушак і наклейваць іх).

Калектыўная аплікацыя "Новы раён горада" (па-рознаму размяшчаць разнастайныя будынкі ў прасторы).

**Лепка**

Ляпіць фігуру чалавека, паказваючы асаблівасці адзення, адрозненні ў велічыні, руху ("Дзядзька Сцёпа", "Дзяўчынка скача", "Дзяўчынкі і хлопчыкі ў розным адзенні").

Перадаваць у лепцы адметныя рысы адных і тых жа прадметаў (розныя рыбкі).

Перадаваць у лепцы характэрныя асаблівасці персанажаў знаёмых казак (калектыўная лепка).

Ляпіць народныя цацкі з наступным іх размалёўваннем (калектыўная лепка).

Самастойная лепка без вызначэння задання.

Ляпіць з натуры па індывідуальнаму заданню.

**Канструяванне**

Па гатовай аб'ёмнай канструкцыі (домік) зарысоўваць пабудовы.

Рабіць будынкі рознага прызначэння ("Тэатр", "Магазін") па ўзору, малюнку і інш.

Калектыўныя пабудовы "Вуліца горада", "Універмаг" (аддзелы: цацкі, адзенне, посуд) з буйнога будаўнічага матэрыялу.

Збіраць з буйнога будаўнічага матэрыялу казачныя хаткі для гульняў-драматызацый.

Заахвочваць да канструявання па абранай тэме "Хто што хоча, будуе для гульні з лялькай, машынай, жывёламі, посудам".

Будаваць цырк (рабіць будынкі рознага прызначэння).

Састаўляць цэлае з частак (сюжэтныя карцінкі).

Канструяванне зборна-разборных цацак.

### *IV квартал*

На занятках па выяўленчай дзейнасці перадаваць свае ўражанні.

Маляваць на зямлі палачкай, на асфальце мелам.

Заахвочваць да майстравання вырабаў з прыроднага матэрыялу (загатоўка прыроднага матэрыялу); рабіць пабудовы ў пясочніцах.



## ФАРМІРАВАННЕ МАТЭМАТЫЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ

### ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

### *І квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Далікавы перыяд. Вучыць выдзяляць адзін прадмет з мноства, раз'ядноўваць і аб'ядноўваць мноствы (*адзін—многа*). Знаходзіць адзін і шмат прадметаў у наваколлі. Вучыць аб'ядноўваць аднолькавыя па некалькіх (колер, форма, велічыня), дзвюх (колер, форма) прыметах прадметы ў мноства прадметаў. Вучыць павялічваць, змяншаць і параўноўваць мноства двума спосабамі: дабаўляць прадмет, якога не хапае, або аднімаць лішні. Выкарыстоўваць пры гэтым словы *больш, менш, аднолькавыя.*

Вычляняць з мноства адзін і два прадметы па выбару, узору і моўнай інструкцыі. Адказваць на пытанне "Колькі?" Суадносіць аднолькавыя колькасці розных прадметаў (палачкі, пальцы).

Пазнаёміць дзяцей з прыёмам аб'яднання і раз'яднання элементаў мноства. Выконваць па заданню розныя дзеянні з двума прадметамі. Увесці ў пасіўны слоўнік словы *адзін, два, тры*.

Рашаць практычныя задачы на наглядным матэрыяле ў межах 2.

**Велічыня.** Вучыць параўноўваць прадметы, кантрастныя па велічыні, паказваць і называць іх (*вялікі, маленькі, аднолькавыя*). Выкарыстоўваць прыёмы накладвання і прыкладвання для параўнання прадметаў па даўжыні. Умець растлумачыць вынік параўнання, карыстаючыся словамі *вялікі, маленькі, высокі, нізкі*.

**Форма.** Вучыць адрозніваць і называць круг і квадрат (мяч, кубік). Пазнаёміць з выбарам геаметрычных форм і фігур па ўзору (дзе такая форма?). Вучыць падбіраць да рэальных прадметаў адпаведныя плоскасныя геаметрычныя формы, тлумачыць свой выбар. Знаёміць з аб'ёмнымі формамі (шар, куб, цыліндр) на ўзроўні ўспрымання.

**Арыенціроўка ў прасторы.** Вучыць паказваць і называць часткі цела, твару, адрозніваць і называць правую і левую руку, паняцці *злева, справа*, рухацца ў розных напрамках па перайманню і па моўнай інструкцыі (*уперад—назад, улева—управа*). Практыкаваць дзяцей у вызначэнні становішча таго ці іншага прадмета ў прасторы ў адносінах да сябе: *уніЗе, уперадзе, ззаду, на сябе, ад сябе*. Практыкаваць у арыенціроўцы ў прасторы, у памяшканні, на аркушы паперы.

**Арыенціроўка ў часе.** Вучыць адрозніваць і называць часткі сутак у адпаведнасці з характэрнай для іх асабістай дзейнасцю.

### *II квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Вучыць знаходзіць адзін і многа прадметаў у наваколлі (шышкі, каштаны, лісты дрэў).

Вучыць пералічваць прадметы ў межах 3 і адказваць на пытанне "Колькі?", запамінаць назву ліку ў лікавым радзе. Вучыць выдзяляць з мноства колькасць прадметаў па ўзору (*Дай столькі ж*), па моўнай інструкцыі (*Дай адно, тры яблыкі*). Вучыць размяркоўваць па-рознаму элементы мноства, тлумачыць свае дзеянні.

Вучыць рашаць наглядныя задачы на аб'яднанне і раз'яднанне ў межах 3, дэманстраваць дзеянні, аб якіх гаворыцца ў задачы, тлумачыць свае дзеянні.

**Велічыня.** Замацоўваць уяўленне аб велічыні прадметаў. Вучыць параўноўваць прадметы, карыстаючыся прыёмамі накладвання, прыкладвання і зрокавага суаднясення. Вучыць групаваць прадметы па велічыні (па двух узорах), тлумачыць прынцып групоўкі.

**Форма.** Вучыць адрозніваць і называць круг, квадрат, трохвугольнік (дах). Практыкаваць у выбары геаметрычных форм і аб'ёмных фігур па ўзору.

**Арыенціроўка ў прасторы.** Працягваць вучыць дзяцей рухацца ў групавым пакоі па моўнай інструкцыі, перайманню, выконваць такія ж дзеянні з прадметамі. Вучыць вызначаць напрамак ад сябе: *уперад (спераду), назад (ззаду), направа (справа), налева (злева).* Практыкаваць у адрозненні правай і левай рукі пры дзеяннях з прадметамі.

**Арыенціроўка ў часе.** Працягваць вучыць дзяцей адрозніваць і называць часткі сутак: *раніца (ранак), дзень, вечар, ноч.*

### *III квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Працягваць вучыць дзяцей пералічваць прадметы ў межах 3, выконваць дзеянні па інструкцыі "Палічы", падводзіць вынікавы лік у адказ на пытанне "Колькі?". Навучыць разумець сэнс пытання "Колькі?".

Вучыць параўноўваць колькасць прадметаў *(больш, менш, пароўну),* карыстаючыся прыёмамі накладвання і прыкладвання, вызначаць няроўнасці паміж групамі аб'ектаў шляхам дадавання недастаючага прамета або аднімання лішняга.



Вучыць рашаць наглядныя задачы з адкрытым і закрытым вынікам; адказваць, больш ці менш прадметаў стала пасля зробленага дзеяння; тлумачыць, чаму трэба дадаць ці адняць прадмет. Паказваць рашэнне на пальцах, наглядным дыдактычным матэрыяле.

**Велічыня.** Замацоўваць уяўленні аб адноснасці велічынь. Выпрацоўваць навык параўнання прадметаў па даўжыні. Разумець і выкарыстоўваць словы *доўгі, кароткі, высокі, нізкі*. Вучыць групаваць прадметы, геаметрычныя формы і аб'ёмныя фігуры па велічыні, колеру. Падбіраць да формы ўзору адпаведныя прадметы і цацкі.

**Форма.** Вучыць адрозніваць і называць круг, квадрат і трохвугольнік.

Пазнаёміць з выбарам геаметрычных форм і фігур па ўзору ("Дзе такая фігура?"). Вучыць падбіраць да рэальных прадметаў адпаведныя плоскасныя геаметрычныя формы.

**Арыенціроўка ў прасторы.** Вучыць рухацца ў прасторы па моўнай інструкцыі, перайманню: *направа—налева, уперад—назад, уверх—уніз.*

Пазнаёміць з такой якасцю руху, як хуткасць. Выконваць па моўнай інструкцыі дзеянні ("Ідзі павольна, павольней, хутка, яшчэ хутчэй"). Узнаўляць тэмп воплескамі, ударамі ў бубен, выкарыстоўваць словы *хутка, павольна.*

Праводзіць практыкаванні з рэальнымі прадметамі, размяшчаючы іх у прасторы і вакол другога прадмета (стала). Называць напрамак руху (*уперад, назад, убок*), вызначаць месцазнаходжанне прадметаў пры выконванні розных перамяшчэнняў.

Практыкаваць у адрозненні правай і левай рукі пры дзеяннях з прадметамі.

**Арыенціроўка ў часе.** Вучыць дзяцей заўважаць паслядоўнасць заняткаў і дзеянняў, якія яны выконваюць у розны час сутак ("Што робіце раніцай? Спачатку мыецеся ці снедаеце?"). Фарміраваць уяўленні дзяцей аб асноўных занятках людзей удзень, увечары.

## ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

### *I квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Паўтарыць матэрыял папярэдняга года. Вучыць лічыць прадметы ў межах 5: правільна называць лічэбнікі па парадку; дапасоўваць у родзе, ліку і склоне

лічэбнік да назоўніка, адносіць апошнія да ўсёй групы (*усяго пяць груш*); суадносіць кожны лічэбнік толькі з адным прадметам мноства. Вучыць адрозніваць словы *палічы* і *колькі*, адказваць на пытанне "Колькі?". Растлумачыць дзецям, што лік — гэта вынік лічэння, ён складаецца з адзінак (у межах 3). Навучыць дзяцей суадносіць выдзеленую колькасць прадметаў з колькасцю пальцаў, дадаваць адзінкі да папярэдняга ліку.

Працягваць рашаць задачы на знаходжанне сумы і астатку на наглядным матэрыяле, дэманстраваць дзеянні. Вучыць суадносіць тэкст задачы па нагляднай сітуацыі, выдзеляць і фармуляваць умову задачы, пытанні, адказваць на пытанні.

**Велічыня.** Замацоўваць і пашыраць уяўленні дзяцей аб велічыні, яе адноснасці. Параўноўваць прадметы па велічыні. Групаваць прадметы і геаметрычныя формы па двух і трох узорах. Фарміраваць паняцце аб шырыні *(шырокі—вузкі, шырэйшы—вузейшы, аднолькавыя, роўныя).*

**Форма.** Вучыць адрозніваць і называць *круг, квадрат, трохвугольнік, прамавугольнік.* Працягваць вучыць дзяцей выдзяляць, групаваць прадметы і геаметрычныя формы, суадносіць прадметы шляхам параўнання з эталонамі. Вучыць абследаваць форму прадметаў датыкальна-рухальным шляхам пад кантролем зроку і без яго.

**Арыенціроўка ў прасторы.** Практыкаваць дзяцей у перамяшчэнні ў прасторы па моўнай інструкцыі, вызначэнні напрамку руху ад сябе: *уперад—назад, уверх—уніз, направа—налева.*

**Арыенціроўка ў часе.** Замацоўваць веданне назвы частак сутак, дзён тыдня, іх паслядоўнасці. Вучыць карыстацца словамі *ўчора, сёння, заўтра* і разумець іх сэнс. Фарміраваць уяўленні аб цыклічнасці пары года, дзён тыдня, часу сутак.

## *II квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Замацоўваць уменне лічыць у межах 5, адначасова фарміраваць паняцце аб кожным новым ліку (шляхам дадавання адзінкі), пералічваць прадметы ў межах 5.

Лічбы 1, 2, 3. Склад лікаў 2, 3.

Суадносіць колькасць прадметаў у межах 5 з колькасцю пальцаў, відарысаў на карцінках. Фарміраваць уяўленне аб тым, што колькасць не залежыць ад велічыні, формы, колеру, прызначэння і размяшчэння прадметаў у прасторы, што ад змены размяшчэння прадметаў іх колькасць не змяняецца. Вучыць па выніках ліку дзвюх сукупнасцей вызначаць іх роўнасць ці няроўнасць. Практыкаваць у прамым і адваротным лічэнні ў межах 5 ад любога зададзенага ліку.

**Велічыня.** Фарміраваць ўяўленні аб велічыні (даўжыня, шырыня, вышыня, таўшчыня) на падставе супастаўленняў рэальных прадметаў і выяў (*доўгі—кароткі; даўжэйшы—карацейшы; аднолькавыя (роўныя) па даўжыні*) шляхам накладвання і прыкладвання.

Фарміраваць вымяральныя навыкі: вымяраць даўжыню, шырыню, вышыню прадметаў сантыметрамі (работа з лінейкай).

**Форма.** Працягваць вучыць распазнаваць формы прадметаў (шар, куб, авал, квадрат, трохвугольнік, прамавугольнік); падбіраць да рэальных прадметаў адпаведныя плоскасныя геаметрычныя формы, растлумачваць свой выбар. Вучыць аналізаваць пабудовы фігур (колькасць вяршынь, бакоў, вуглоў).

**Арыенціроўка ў прасторы.** Вучыць адрозніваць размяшчэнне прадметаў у напрамку: *уперад, назад, улева, управа, уверх, уніз, спераду, ззаду, пасярэдзіне.* Практыкаваць у адрозненні правай і левай рукі пры дзеяннях з прадметамі.

## *III квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Практыкаваць у прамым і адваротным лічэнні ў межах 5, прамым і адваротным лічэнні ад зададзенага ліку да 5, ад 5 да зададзенага ліку. Склад лікаў 4, 5. Месца ліку ў лікавым радзе.

Замацоўваць веданне лічбаў 1, 2, 3, 4, 5 у дыдактычнай гульні (раскласці картачкі з лічбамі па парадку; палічыць прадметы на картачцы і адказ паказаць лічбай).

Практыкаваць у вусным рашэнні прыкладаў на складанне і адніманне ў межах 5.

Вучыць дзяцей рашаць задачы, разумець іх тэкст, умець аналізаваць кампаненты.

Пазнаёміць з колькасцю 5.

**Велічыня.** Вучыць разумець адноснасць паняццяў аб велічыні, даваць характарыстыку.

Працягваць фарміраваць вымяральныя навыкі: вымяраць прадметы сантыметрам і лінейкай.

Пазнаёміць з бытавымі вагамі. Вучыць параўноўваць: *цяжкі—лёгкі, цяжэй—лягчэй.*

**Форма.** Вучыць адрозніваць і называць круг, квадрат, авал, трохвугольнік, прамавугольнік *(шар—круг, куб—квад-*

*рат, трохвугольная прызма—трохвугольнік, паралелепіпед—прамавугольнік).* Улічваць асаблівасці засвоеных формаў у канструяванні, гульнёвай дзейнсці. Знаёміць з некаторымі відамі ліній: *прамая, крывая, ломаная, дуга.*

**Арыенціроўка ў прасторы.** Замацоўваць уменне дзяцей арыентавацца ў групавым пакоі, у пакоі для заняткаў, у іншых памяшканнях дзіцячага сада.

**Арыенціроўка ў часе.** Даць дзецям агульнае ўяўленне аб мерах часу, дакладнага часу. Замацоўваць уяўленні: *сёння, учора, заўтра, год, дні, тыдзень,* уменне правільна іх называць.

## ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

### *I квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Паўтарыць матэрыял папярэдняга года. Замацоўваць прамое (1—10) і адваротнае (5—1) лічэнне ад любога названага ліку. Вучыць лічыць двойкамі. Параўноўваць мноствы практычным шляхам і апасродкавана. Пры фарміраванні ўяўленняў аб роўнасці і няроўнасці лічбаў у межах 10 увесці элементы знакавай сімволікі: +; –; =; >; <. Знаёміць дзяцей з колькасцю 6, лікам і лічбай 6, складам ліку 6. Практыкаваць у рашэнні прыкладаў у межах 6.

Знаёміць з дзяленнем прадмета на дзве—чатыры часткі ("палова"), адносінамі паміж часткай і цэлым. Вучыць графічнаму адлюстраванню мноства.

Знаёміць з колькасцю 7, лікам і лічбай 7, складам ліку 7. Практыкаваць у рашэнні прыкладаў у межах 7.

Знаёміць з колькасцю 8, лікам і лічбай 8, складам ліку 8. З картачак з лічбамі і арыфметычнымі знакамі выкладаць рашэнні прыкладаў у межах 8.

Вучыць дзяцей параўноўваць лікі 6 і 7; 7 і 8. Замацоўваць веданне элементаў знакавай сімволікі: +;–. Вучыць рашэнню задач, складанню тэксту задачы на знаходжанне сумы па нагляднай сітуацыі, дэманстрацыі дзеянняў, запісу рашэння ў выглядзе арыфметычнага радка з наступным аналізам кампанентаў задачы. У форме гульні праводзіць драматызацыю па тэксту задачы, рабіць замалёўку тэксту задачы з наступным аналізам яе кампанентаў.

**Велічыня.** Вучыць практычна параўноўваць і вызначаць прадметы і людзей па вышыні (*вышэй—ніжэй*). Замацоўваць уяўленні аб велічыні прадметаў (*вялікі—меншы—маленькі; вузкі—вузейшы; шырокі—шырэйшы; высокі—нізкі, вышэй—ніжэй, доўгі—кароткі, даўжэй—карацей*). Практыкаваць у параўнанні 3—5 прадметаў адначасова па двух параметрах (колер і велічыня і г. д.).

Працягваць фарміраваць вымяральныя навыкі: вымяраць умоўнымі меркамі і параўноўваць даўжыню, шырыню, вышыню.

**Форма.** Замацоўваць веды дзяцей пра форму круга, авала, трохвугольніка, чатырохвугольніка, шара, куба.

**Арыенціроўка ў прасторы.** Замацоўваць і паглыбляць уяўленні пра размяшчэнне прадметаў у прасторы *(спераду—ззаду, пад—над, злева—справа).*

### *II квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Практыкаваць у прамым і адваротным лічэнні ў межах 10 (1—10; 10—1) ад любога названага ліку, у прамым лічэнні двойкамі.

Знаёміць дзяцей з колькасцю 9, лікам і лічбай 9, складам ліку 9. Практыкаваць у рашэнні прыкладаў у межах 9.

Знаёміць дзяцей з колькасцю 10, лікам і лічбай 10, складам ліку 10. Практыкаваць у рашэнні прыкладаў у межах 10. Вучыць выкладаць рашэнні прыкладаў у межах 10 з картачак з лічбамі і арыфметычнымі знакамі, складаць лікавы рад (1—10), параўноўваць лікі 9 і 10.

Практыкаваць у рашэнні задач. Вучыць рашаць задачы па наглядным матэрыяле і без яго ў межах 5, паказваць на лікавым матэрыяле ход рашэння задач, паказваць пад лічбамі патрэбную колькасць прадметаў. Замацоўваць уменне складаць задачы па нагляднай сітуацыі, выкладаць лічбавае рашэнне з картачак.

**Велічыня.** Працягваць практыкаваць у параўнанні прадметаў па велічыні, групаваць іх незалежна ад колеру, формы, назначэння. Параўноўваць прадметы, аднолькавыя па велічыні, але зробленыя з розных матэрыялаў (шарык пластмасавы, драўляны, металічны). Даць паняцце пра тое, што вялікі прадмет адначасова і высокі, і шырокі або высокі і тоўсты, паколькі велічыня ёсць абагульненае абазначэнне розных вымярэнняў.

Вучыць вызначаць лінейныя меры, аб'ёмы вадкіх і сыпучых рэчываў з дапамогай умоўнай меркі. Знаёміць дзяцей з эталонамі вагі і вартасці.

**Форма.** Вучыць групаваць па форме 2—3 прадметы, тлумачыць абгрунтаванне групоўкі. Групаваць мадэлі геаметрычных фігур, адлюстраваных прадметаў па ўзору і моўнай інструкцыі.

**Арыенціроўка ў прасторы.** Вучыць арыентавацца ў двухмернай прасторы (планы, схема). Знаёміць дзяцей з дарожнымі знакамі і правіламі дарожнага руху.

**Арыенціроўка ў часе.** Замацоўваць уяўленне аб цыклічнасці пораў года, дзён тыдня, часу сутак, месяцаў, гадоў. Вучыць вызначаць час па розных гадзінніках.

### *III квартал*

**Колькасць і лічэнне.** Практыкаваць у прамым і адваротным лічэнні прадметаў у межах 10 ад зададзенага да зададзенага ліку, у лічэнні двойкамі. Замацоўваць веды аб складзе лікаў у межаў 10.

Замацоўваць веды аб лічбах у межах 10 (складваць лічбы з палачак, мазаікі, ляпіць з пластыліну, маляваць у паветры), аб суседзях лічбаў.

Праводзіць дыдактычныя гульні: "Найдзі сваё месца", "Што змянілася?" (лічбы мяняюцца месцамі), "Навядзі парадак", "Лічба заблудзілася", "Што пераблытаў Нязнайка?" (лічбы перавернуты дагары нагамі).

Вучыць рашаць прыклады ў межах 10, з картачак з лічбамі і арыфметычнымі знакамі выкладваць рашэнні прыкладаў. Рашаць задачы на наглядным матэрыяле, практыкаваць у састаўленні задач. Пісаць лічбы ў сшытку.

**Велічыня.** Замацоўваць уяўленні аб велічыні. Раскладваць прадметы па ўзрастанню і памяншэнню шырыні, вышыні, таўшчыні, даўжыні на падставе параўнання з дапамогай накладвання, прыкладвання і на вока.

Фарміраванне вымяральных навыкаў: пазнаёміць з вымярэннем і параўнаннем даўжыні, шырыні, вышыні прадметаў; вучыць карыстацца ўмоўнымі меркамі.

**Форма.** Замацоўваць уяўленні аб форме прадметаў. Знаходзіць у наваколлі прадметы знаёмай формы (па ўзору, па слову).

**Арыенціроўка ў прасторы і часе.** Замацоўваць уяўленні аб прасторавых размяшчэннях, аб перыядычнасці і паўторнасці часавых з'яў.

## МУЗЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

### ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

Абуджаць у дзяцей цікавасць да музычных заняткаў. Фарміраваць першыя музычныя ўяўленні. Выхоўваць жаданне слухаць музыку, спяваць, танцаваць, іграць на музычных інструментах.



#### СЛУХАННЕ МУЗЫКІ

Выхоўваць жаданне слухаць мелодыі, эмацыянальны водгук на іх, уменне засяроджвацца ў час гучання музыкі. Вучыць запамінаць самыя простыя мелодыі, распазнаваць іх. Вучыць адрозніваць музыку рознага характару: марш, скокі, калыханку; звязваць знаёмыя мелодыі з вобразамі жывёл— зайца, лісы, коніка, мядзведзя і інш.

МУЗЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ СЛУХАННЯ

### *I квартал*

"Осенняя песенка" А. Аляксандрава, "Моя лошадка" А. Грачанінава, "Серенькая кошечка" В. Вітліна, "Машина" Н. Волкава.

### *II квартал*

"Дед Мороз" Р. Шумана, "Елочка" М. Красева, "Зима" В. Карасёвай, "Петрушка" І. Брамса, "Спи, мой Мишка" А. Цілічэевай.

### *III квартал*

"Собачка" М. Раўхвергера, "Барабан" В. Жубінскай, "Воробей" А. Рубака, "Колыбельная" С. Разарэнава.

### *IV квартал*

"Два петуха" Г. Леўкадзімава, "Маленький марш" Н. Арсеева, "Поезд" М. Старакадамскага, "Самолет" А. Цілічэевай.

#### СПЕВЫ

Стымуляваць дзіцячыя вакалізацыі, заахвочваючы падпяваць папеўкі, якія пабудаваны на інтэрвале, што паўтараецца. Вучыць спяваць са здавальненнем, на поўны голас, своечасова пачынаць і канчаць спяванне, рэагаваць на пачатак і заканчэнне гучання, выдзяляць уступ, пачынаць спяваць па сігналу музычнага кіраўніка. Спяваць з дапамогай дарослага з музычным суправаджэннем.

МУЗЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ СПЕВАЎ

*I квартал*

"Дождик" (рус. нар. песня, апрац. Т. Папаценкі), "Певунок" (пацешка, словы народныя, муз. і апрац. Э. Багуслаўскай), "Ладкі-ладкі" І. Іарданскага, "Осень" І. Кішко.

*II квартал*

"Зима" В. Карасёвай, "Дед Мороз" А. Філіпенкі, "Елка" Т. Папаценкі, "Зайка" (апрац. Г. Лабачова).

*III квартал*

"К нам гости пришли" А. Аляксандрава, "Пирожки" А. Філіпенкі, "Есть у солнышка друзья" А. Цілічэевай, "Песенка о весне" Г. Фрыда.

*IV квартал*

"Цветочки" В. Карасёвай, "Лес-лесочек" Г. Леўкадзімава, "Жучка" Н. Куклоўскай, "Цап-царап" А. Цілічэевай.

## МУЗЫЧНА-РЫТМІЧНЫЯ РУХІ

Вучыць дзяцей рухацца пад музыку, распазнаваць характар музыкі і перадаваць яго ў руху (хадзіць спакойна, бадзёра, энергічна шагаць, выконваць плаўныя рухі пад калыханку); суадносіць з гучаннем музыкі пачатак і канец руху. Вучыць выконваць вобразныя рухі (паказваць, як скачуць зайчыкі, ходзіць мядзведзь, пераступае кураня, ляціць самалёт, махае крыламі птушка). Звяртаць увагу на выразнасць рухаў дзяцей.

## МУЗЫЧНА-ДЫДАКТЫЧНЫЯ ГУЛЬНІ

Заахвочваць дзяцей гуляць у музычныя дыдактычныя гульні, развіваць пачуццё рытму. Заахвочваць дзяцей эмацыянальна рэагаваць на гульнёвую сітуацыю, выконваць нескладаныя рухі, суадносіць іх з музыкай. Звяртаць увагу на выразнасць рухаў дзяцей у час гульняў, выклікаць іх захапленне.



**Гульні**

"Ау", "Арэхі", "Птушачкі", "Курачкі і пеўнік", "Вочкі", "Быська" С. Галкінай; "Игра в прятки" (рус. нар. мелодыя); "Игра с куклой" В. Карасёвай; "Сем скачкоў", "Індо эу" Т. Баравіка.

**Практыкаванні**

"Птица и птенчики", "Тише-громче в бубен бей" А. Цілічэевай; "Гулять-отдыхать" М. Красева, "Прятки" (рус. нар. мелодыя), "Ціхія і моцныя званочкі" Т. Рустамава, "Бубен-погремушка" (укр. нар. мелодыя).

**Танцы**

"Подружились" Т. Вількарэйскай, "Пальчики-ручки" (рус. нар. мелодыя, апрацоўка М. Раўхвергера), "Пляска с погремушкой" А. Цілічэевай, "Полька" Ю. Чычкова, "Пружинка" (рус. нар. мелодыя), "Цветные платочки" Т. Ломавай.

## ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

Выхоўваць у дзяцей станоўчыя адносіны да музычных заняткаў, выклікаць у іх адпаведны музыцы эмацыянальны стан, жаданне слухаць музыку, спяваць, танцаваць, перадаваць рытм. Развіваць эмацыянальную спагадлівасць пры слуханні музыкі, пачуццё рытму. Знаёміць з ігрой на некаторых дзіцячых музычных інструментах.

## СЛУХАННЕ МУЗЫКІ

Выклікаць цікавасць да слухання мелодый. Знаёміць дзяцей з беларускай народнай музыкай. Развіваць уменне слухаць і распазнаваць музычныя творы кантраснага характару (калыханку і вясёлую, заўзятую песню), запамінаць іх.

Развіваць музыкальную памяць — пазнаванне знаёмай музыкі, песень. Выконваць для дзяцей знаёмыя ім музычныя творы і п'есы па іх жаданню.

МУЗЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ СЛУХАННЯ

*I квартал*

"Веселая прогулка" П. Чайкоўскага, "Кукушки" М. Красева, "Марш" Д. Шастаковіча.

*II квартал*

"Танец Петрушек" М. Раўхвергера, "Зайчик" М. Старакадамскага, "Медвежата" М. Красева, "Зима" В. Карасёвай.

*III квартал*

"Вальс" Д. Шастаковіча; "Зайку бросила хозяйка", "Шествие игрушек", "Идет бычок" В. Сямёнава.

*IV квартал*

"На коніку", "У рэчцы" Г. Леўкадзімава; "Мотылек" С. Майкапара, "Вальс" П. Чайкоўскага.

## СПЕВЫ

Вучыць спяваць выразна, дакладна інтанаваць мелодыю. Стымуляваць дзіцячыя вакалізацыі, заахвочваць да падпявання і спявання. Знаёміць дзяцей з беларускай мовай. Вучыць спяваць з фартэпіянным суправаджэннем напеўна, у адным тэмпе, весела, рухава, правільна дыхаць у час спявання, своечасова пачынаць і заканчваць спевы.

Праводзіць *індывідуальную работу* па развіццю дзіцячага голасу, выкарыстоўваючы зацікаўленасць, пахвалу, прывабнасць.

МУЗЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ СПЕВАЎ

*I квартал*

"Осень" І. Кішко, "Осень" А. Рамізоўскай, "Урожайная" А. Філіпенкі, "Осенняя песенка" А. Аляксандрава, "Асенні карагод" С. Галкінай.

*II квартал*

"Елочка" М. Красева, "Елка" С. Галкінай, "Дед Мороз" В. Вітліна; "Карагод з Дзедам Марозам", "Как на тоненький ледок" (рус. нар. песня).

*III квартал*

"Мы вясну гукаем", "Едзем да сонейка" С. Галкінай; "Цыплята" А. Філіпенкі, "Строим дом" А. Цілічэевай, "Карусель" В. Войціка.



*IV квартал*

"Ясныя дзянёчкі", "Цягнічок" С. Галкінай; "Ой, веселая дивчина Аленка" А. Філіпенкі; "Пришло лето" О. Юдажынай.

## МУЗЫЧНА-РЫТМІЧНЫЯ РУХІ

Вучыць выконваць розныя рытмічныя рухі пад музыку, арыентавацца ў прасторы залы, развіваць каардынацыю. Вучыць выконваць рухі ў адпаведнасці з рытмам і тэмпам музыкі, якая гучыць.

Вучыць дзяцей выконваць рухі, якія адпавядаюць мелодыі песні, што яны напяваюць. Развіваць уменне звязваць з музыкай пэўныя скокавыя і гульнёвыя рухі.

## МУЗЫЧНА-ДЫДАКТЫЧНЫЯ ГУЛЬНІ

Знаёміць дзяцей з беларускімі гульнямі. Заахвочваць да ўдзелу ў музычна-дыдактычных гульнях, развіваць пачуццё рытму. Вучыць дзяцей эмацыянальна перадаваць гульнёвыя вобразы ў адпаведнасці з музыкай. Працаваць над развіццём эмацыянальнасці і раскаванасці ў дзяцей у час музычных гульняў.

**Гульні**

"З бубнам", "Дожджык", "Маланне", "Верабей" С. Галкінай; "Птички и кот", "Кузнечик", "Трактар", "Карусель".

**Практыкаванні**

"Мячы", "Игра с погремушками" (рус. нар. мелодыя, апрац. А. Быканава), "Игра с матрешками" Р. Рустамава, "Музыкальные молоточки" А. Цілічэевай.

**Танцы**

"Потанцуем" (апрац. Т. Ломавай), "Приседание" (рус. нар. мелодыя, апрац. М. Раўхвергера), "Танец с куклами" (укр. нар. мелодыя, апрац. Н. Лысенкі), "Чок ды чок" А. Макшанцавай, "Дружные пары" Л. Шварца.

**Ігра на музычных інструментах**

Навучыць дзяцей іграць на музычных інструментах (у інструментаванні песень выкарыстоўваецца шумавы аркестр: бразготкі, музычныя малаточкі, званочкі, бубны і да т. п.).

ТРЭЦІ ГОД НАВУЧАННЯ

Працягваць работу па выхаванню ў дзяцей цікавасці да заняткаў, да розных відаў музычнай дзейнасці, імкнення прымаць удзел у калектыўных песнях, танцах, практыкаваннях. Развіваць пеўчыя здольнасці, музыкальны слых, звяртаць увагу на ўдасканальванне рухаў, іх выразнасць; выхоўваць станоўчыя адносіны да ігры на музычных інструментах.

### СЛУХАННЕ МУЗЫКІ

Знаёміць дзяцей з творчасцю кампазітараў, пашыраць іх музычны кругагляд, слухаць беларускую народную музыку. Развіваць уменне ўслухоўвацца ў музыку, адрозніваць кантрастныя асаблівасці гучання (гучна—ціха, высокія—нізкія рэгістры). Развіваць музыкальную памяць — распазнаванне знаёмай музыкі, песні. Вучыць адрозніваць маршавую музыку ад песеннай, распазнаваць скокі. Заахвочваць дзяцей да слухання любімых песень.

МУЗЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ СЛУХАННЯ

***I квартал***

"Походный марш" Д. Кабалеўскага, "Танец" В. Блага, "Колыбельная" М. Рымскага-Корсакава, "Вальс" Н. Леві.

***II квартал***

"Клоуны" Д. Кабалеўскага, "Шарманка" Д. Шастаковіча, "Смелый наездник" Р. Шумана, "Медвежата" М. Красева.

***III квартал***

"Камаринская" П. Чайкоўскага, "На птушніку" В. Жубінскай, "Белка" М. Рымскага-Корсакава, "Конь" М. Красева.

***IV квартал***

Паўтор праграмнага матэрыялу за год (па выбару)

### СПЕВЫ

Вучыць дзяцей спяваць эмацыянальна, працягла, пяшчотна, дакладна інтанаваць мелодыю, захоўваць рытм, выразна вымаўляць словы.



Вучыць дзяцей калектыўным спевам. Вучыць адрозніваць запеў і прыпеў, музычныя ўступ і заканчэнне, спяваць ажыўлена, весела, чыста інтанаваць, правільна дыхаць у час спявання. Фарміраваць культуру выканання — спяваць нягучна, меладычна, лёгка. Працягваць знаёміць дзяцей з беларускімі песнямі, заахвочваць спяваць на беларускай мове.

З мэтай развіцця музыкальных здольнасцей праводзіць індывідуальныя заняткі.

МУЗЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ СПЕВАЎ

***I квартал***

"Здравствуй, осень!" М. Шнэйдэрмана, "Праздник весёлый" Д. Кабалеўскага, "Падают листья" М. Красева, "Урожайная" А. Філіпенкі, "Загадкі на градцы", "Па грыбы", "Вясёлая полька", "Выхавацелька" С. Галкінай.

***II квартал***

"Пад Новы год", "Карагод" С. Галкінай; "Песенка ребят", "Санки", "Елочка", "Зимняя песенка" М. Красева; "Зіма" Э. Зарыцкага; "Здравствуй, Дед Мороз", "Дразнилки".

***III квартал***

"Выхавацелька", "Праменьчыкі" С. Галкінай; "Як вясна прыйшла" В. Сярых, "Ой вясна", "Вечный огонь" А. Філіпенкі; "Зайграй жа мне, дударочку".

***IV квартал***

"Раніца ў лесе", "Бярозачка", "Церамок", "Развітанне з родным домам" С. Галкінай; "Незвычайны канцэрт" В. Дзяменцьева, "Я хочу учиться" А. Далуханяна; "Ой, ты, душка" Т. Баравіка, "Дзед Барадзед" Л. Захлеўнага.

### МУЗЫЧНА-РЫТМІЧНЫЯ РУХІ

Выконваць усе праграмныя патрабаванні для папярэдніх узроставых груп.

Вучыць дзяцей рухацца ў адпаведнасці з характарам музыкі, выразна выконваць рухі; самастойна пачынаць рух пасля ўступу. Заахвочваць дзяцей да самастойнага пошуку рухаў, якія б стваралі вобразы персанажаў. Дабівацца зла-

джанасці, сінхроннасці рухаў у танцах. Вучыць дзяцей самастойна мяняць рухі ў адпаведнасці са зменай характару музыкі, хадзіць урассыпную, а затым строіцца ў круг. Заахвочваць дзяцей рытмічна, лёгка перадаваць гульнёвыя вобразы.

#### МУЗЫЧНА-ДЫДАКТЫЧНЫЯ ГУЛЬНІ

Праводзіць музычна-дыдактычныя гульні на развіццё пачуцця рытму, гукавышыннага слыху, творчых здольнасцей дзяцей. Вучыць дзяцей эмацыянальна перадаваць гульнёвыя вобразы ў адпаведнасці з музыкай.

**Гульні**
"Лапаточкі", "Казёл", "Грушка", "Да дзеда ў госці", "Шпакі і кошка", "Гарлачык", "Дзеці і дожджык", "Вянок", "Адгадай, чый галасок" С. Галкінай; "Эн-дэн-дино", "Мексиканцы" Т. Баравіка.

**Практыкаванні**
"Передача платочка" Т. Ломавай, "Не опоздай" М. Раўхвергера, "Танец-марш-калыханка".

**Танцы**
"Сняжынка", "Вальс кветак", "Матрошкі", "Юрачка", "Вясёлая сцірка", "Клоуны", "Вясёлая полька" С. Галкінай; "Брейк миксер" Т. Баравіка; "Полька-йоксу" (нар. эстонскі танец).

**Ігра на музычных інструментах**
Вучыць дзяцей выконваць рытмічную карцінку на ўдарных музычных інструментах (трохвугольнік, бубен, барабан), своечасова ўступаць са сваёй партыяй. Удасканальваць ігру дзяцей на дзвюх пласцінках металафона.

## ЗМЕСТ


Тлумачальная запіска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Праграмы

- Выхаванне фізічнай культуры . . . . . . . . . . . . 18
- Развіццё маўлення на аснове азнаямлення з навакольным светам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
- Навучанне гульні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
- Выхаванне працавітасці . . . . . . . . . . . . . . . . 52
- Навучанне выяўленчай дзейнасці і канструяванню 59
- Фарміраванне матэматычных уяўленняў . . . . . 79
- Музычнае выхаванне . . . . . . . . . . . . . . . . . 86

Вучэбнае выданне

**ПРАГРАМЫ**
**Выхаванне і навучанне дзяцей дашкольнага ўзросту з затрымкай псіхічнага развіцця**

Заг. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Н. Р. Самусь*
Карэктары *Я. А. Лукошка, Г. М. Булат*
Камп'ютэрная вёрстка *А. М. Кульбіцкай*

Падпісана ў друк 19.01.2000. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера газетная.
Афсетны друк. Гарнітура школьная. Ум. друк. арк. 5,04.
Ул.-выд. арк. 5,27. Тыраж 2150 экз. Заказ 98.

Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 146
ад 05.01.98. 220013, Мінск, Б. Хмяльніцкага, 3.

Аддрукавана з дыяпазітываў заказчыка паліграфічным участкам
рэдакцыі часопіса "Адукацыя і выхаванне". 220088, Мінск, Захарава, 59.
ЛП № 67 ад 21.11.97.